ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 18 (2649) • Субота, 5 мая 1973 года • Цана 8 кап.

«СВАБОДНАЯ ПРАЦА І ТРЫВАЛЫ МІР СПРАДВЕКУ БЫЛІ ІДЭАЛАМ УСІХ НАРОДАЎ. МЫ, САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ, ЗВЕДВАЕМ ЗАКОННАЕ ПАЧУЦЦЁ ГОРДАСЦІ Ў СУВЯЗІ З ТЫМ, ШТО ВЫЗВАЛЕННЕ ПРАЦЫ БЫЛО ПАЧАТА НА НАШАЙ ЗЯМЛІ Ў ДНІ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА, ШТО ІМЕННА НАША КРАІНА ВОСЬ УЖО 55 ГАДОЎ МОЦНА ТРЫМАЕ СЦЯГ ТРЫВАЛАГА МІРУ І ДРУЖБЫ УСІХ НАРОДАЎ ЗЯМЛІ...»

Л. І. БРЭЖНЕЎ.

9 МАЯ — ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ!

У КАМІТЭЦЕ ПА МІЖНАРОДНЫХ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ «ЗА ЎМАЦАВАННЕ МІРУ ПАМІЖ НАРОДАМІ»

19 красавіка г. г. пад старшынствам акадэміка Скабельцына Д. В. адбылося пасяджэнне Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі».

Камітэт разгледзеў паступіўшыя прапановы аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій за 1972 год і прыняў пастанову па гэтаму пытанню.

ПАСТАНОВА КАМІТЭТА ПА МІЖНАРОДНЫХ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ «ЗА ЎМАЦАВАННЕ МІРУ ПАМІЖ НАРОДАМІ»

АБ ПРЫСУДЖЭННІ МІЖНАРОДНЫХ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЙ «ЗА ЎМАЦАВАННЕ МІРУ ПАМІЖ НАРОДАМІ» ЗА 1972 ГОД

За выдатныя заслугі ў барацьбе за захаванне і ўмацаванне міру прысудзіць міжнародныя Ленінскія прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі»:

БРЭЖНЕВУ Леаніду Ільічу—Генеральнаму сакратару ЦК КПСС.

Сальвадору АЛЬЕНДЭ ГОСЕНС — прэзідэнту Рэспублікі Чылі.

Энрыке ПАСТАРЫНА — старшыні Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў (Уругвай).

Джэймсу ОЛДРЫДЖУ — пісьменніку, грамадскаму дзеячу (Англія).

Старшыня камітэта
Скабяльцын Д. В. (СССР)

Члены камітэта:
Аляксандраў Г. В. (СССР)
Луі Арагон (Францыя)
Блахін Н. Н. (СССР)
Мір'ям Вірэ-Туамінен (Фінляндыя)
Рэната Гутуза (Італія)
Анна Зэгерс (ГДР)
Кешаў Дэва Малавія (Індыя)
Хуан Марынельо (Куба)
Пабла Неруда (Чылі)
Томскі Н. В. (СССР)
Георгій Трайкаў (Балгарыя)
Каору Ясуі (Японія)

Адшумела, адгаманіла, адспявала першамайскае свята. Па вуліцах гарадоў і вёсак у чырвані сцягоў і транспарантаў прайшлі калоны дэманстрантаў.

На здымках нашага фотакарэспандэнта Ул. Крука — святочная дэманстрацыя ў Мінску.

ТАБЕ, ПАРТЫЯ, НАША ЎДЗЯЧНАЕ СЛОВА!

ПАЛЫМЯНЫ ЗМАГАР ЗА МІР

З вялікай радасцю даведаўся я, як і ўсе савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва аб прысуджэнні міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Генеральнаму сакратару ЦК КПСС Леаніду Ільічу Брэжневу.

Сваёй самаадданай працай у імя росквіту нашай краіны, умацавання дружбы, супрацоўніцтва і міру паміж народамі Леанід Ільіч заслужыў глыбокую павагу ва ўсім свеце.

А што можа быць важней, чым барацьба за захаванне і ўмацаванне міру. Знаходзячыся на адказным партыйным пасту, таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў аддае ўсе сілы паспяховаму будаўніцтву камунізму.

У Справаздачным дакладзе на XXIV з'ездзе КПСС, у дакладзе аб 50-годдзі СССР ясна і мудра выкладзена пазіцыя нашай партыі, нашага народа ў барацьбе за мір. Мы, работнікі мастацтва, заўсёды звяртаемся да гэтых гістарычных дакументаў і заўсёды знаходзім для сябе натхняючае слова Леаніда Ільіча, вучымся як лепш працаваць і змагацца за новыя поспехі.

Сардэчна віншуючы таварыша Л. І. Брэжнева з высокай узнагародай, калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы шчыра жадае Леаніду Ільічу добрага здароўя і новых сіл у высакароднай працы на карысць савецкага народа і прагрэсіўнага чалавецтва ўсяго свету.

З. СТОМА,
народны артыст СССР.

У ІМЯ ШЧАСЦЯ І ПРАГРЭСУ

Усё прагрэсіўнае чалавецтва вітае ў гэтыя дні лаўрэатаў міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі». І нам, савецкім людзям, асабліва радасна, што сярод іх Леанід Ільіч Брэжнеў, Генеральны сакратар ЦК КПСС.

Мір на зямлі. Ніхто не ўмее цаніць яго так, як мы. Яшчэ не сцерліся ў памяці жахі мінулай вайны. І ніхто не кампенсуе страты, якія мы панеслі, бо кожны чалавек непаўторны. Людзі мараць жыць спакойна, гадаваць дзяцей, сеяць хлеб, тварыць... Таму няма для нас нічога больш дарагога, чым мір на ўсёй зямлі. А ён у многім залежыць ад мудрасці палітыкі нашай партыі, нашай дзяржавы.

Ва ўсім свеце ведаюць Л. І. Брэжнева як нястомнага барацьбіта за ўмацаванне міру і бяспекі народаў. Ён шмат зрабіў, каб дабіцца далейшай разрадкі напружанасці. І за гэта мы яму бясконца ўдзячныя.

Прысуджэнне міжнародных Ленінскіх прэмій адбылося якраз у тыя дні, калі ўсе савецкія людзі знаёміліся з матэрыяламі Пленума ЦК КПСС, які толькі што адбыўся. На ім ішла гаворка аб салідарнасці з братнімі народамі, аб мірным суіснаванні з дзяржавамі іншага сацыяльнага ладу, аб неабходнасці заўсёды і ўсюды даваць адпор імперыялізму.

Я думаю, разважаючы цяпер аб гэтым, як адказна быць мастаком у наш час. Як многа яшчэ маецца нам зрабіць, каб унесці свой уклад у вялікую справу міру. Мы прыкладзем усе намаганні, каб быць вартымі той вялікай дзяржавы, у якой мы нарадзіліся і жывём.

У. СТАЛЬМАШОНАК,
мастак.

МЕСЦА Ў СТРАІ

Сацыялізм і мір — паняцці непадзельныя.

Гэта вынікае з самой сутнасці сацыялістычнага ладу, з усёй міжнароднай палітыкі Савецкага Саюза і іншых краін сацыялізму. Гэтая палітыка вельмі правільна і дакладна называецца міралюбівай, яна знаходзіць водгук і падтрымку ў сэрцах мільёнаў і мільёнаў людзей свету.

Сацыялізм і мір — паняцці непадзельныя. Так сказаў на першамайскім мітынгу на Краснай плошчы ў Маскве Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.

І вельмі знамянальна, што Л. І. Брэжневу прысуджана міжнародная Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі».

Мір — найважнейшая ўмова нашых сённяшніх і будучых поспехаў у камуністычным будаўніцтве, без міру немагчымы дабрабыт народаў і сацыяльны прагрэс. Я з'яўляўся ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, я бачыў страшэнныя спусташэнні, якія прынеслі на нашу зямлю нямецка-фашысцкія захопнікі. Мільёны нашых людзей загінулі на вайне. Нельга забыць усё гэта. І ад усяго сэрца далучаешся да сказанага Л. І. Брэжневым: «Мы заклікаем пераадолець крывавае мінулае Еўропы не для таго, каб забыць яго, а для таго, каб яно ніколі не паўтарылася».

Барацьба за захаванне і ўмацаванне міру — адна з найважнейшых частак мнагаграннай дзейнасці ЦК КПСС і Савецкага ўрада. Вялікія заслугі ў гэтай справе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, з чыім імем цесна звязана ажыццяўленне Праграмы міру, вызначанай XXIV з'ездам КПСС. Пленум Цэнтральнага Камітэта партыі, які адбыўся гэтымі днямі, адзначыў вялікія дасягненні ў справе рэалізацыі прынятай з'ездам Праграмы міру. Гэта радуе кожнага савецкага чалавека. І кожны савецкі чалавек разумее, што сваёй сумленнай працай на сваім участку ён не толькі ўносіць уклад у камуністычнае будаўніцтва, а і ўмацоўвае справу міру. Гэтак жа і мы, пісьменнікі, бачым сваё месца ў страі, сваю найпершую задачу — павышаць творчую і грамадзянскую актыўнасць, пастаянна мацаваць сувязі з жыццём, што з'яўляецца неабходнай умовай новых высокаідэйных і высокамастацкіх твораў аб нашай сучаснасці.

Аркадзь МАРЦІНОВІЧ,
сакратар партбюро СП БССР.

УРУЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ БССР

У Мінску ў зале пасяджэнняў Савета Міністраў БССР 28 красавіка адбылося ўрачыстае ўручэнне Дзяржаўных прэмій Беларусі.

Дыпломы і ганаровыя знакі лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры ўручаюцца пісьменнікам К. Т. Кірэенку, І. Я. Навуменку і Ц. В. Крысько (Васілю Вітку), кампазітару Ю. В. Семяняку, мастаку А. М. Кашкурэвічу, рэжысёру І. С. Папову і кінадраматургу К. Л. Губарэвічу.

Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў сардэчна павіншаваў лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР за 1972 год, пажадаў ім вялікіх творчых поспехаў на карысць Савецкай Радзімы.

На ўручэнні Дзяржаўных прэмій прысутнічалі сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч, С. В. Марцалеў, старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне навукі і тэхнікі М. А. Барысевіч, старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры П. У. Броўка.

ЗАДАЧЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Адбыўся чарговы партыйны сход камуністаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. На парадку дня пытанне — «Вынікі сумеснага ўрачыстага пасяджэння ў Маскве і задачы камуністаў па далейшым узмацненні ідэйна-палітычнай работы, інтэрнацыянальнага выхавання працоўных у святле патрабаванняў даклада Л. І. Брэжнева «Аб пяцідзесяцігоддзі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

З дакладам выступіў сакратар ЦК КПБ тав. Кузьмін А. Т.

У спрэчках па дакладу выступілі К. Кірэенка, А. Куляшоў, Г. Папоў, Хв. Жычка, А. Асіпенка, А. Кулакоўскі, Г. Бураўкін, А. Міронаў, П. Шаўцоў, І. Мележ, А. Дзеружынскі, І. Шамякін, А. Бачыла.

Сход аднадушна прыняў пастанову па дакладу, якая падкрэслівае неабходнасць далейшага паляпшэння ідэйна-палітычнай работы партарганізацыі СП БССР і павышэння творчай актыўнасці пісьменнікаў.

ЗВАРОТ ДА СЛОВА

Алесь ВЕЧАР

Дзіўлюся табе, чалавечае слова!
Дзіўлюся вялікаму мноству твайму.
Ты можаш быць моцным,
Ты можаш быць кволым
І словам, якім пачынаюць вайну.
Есць словы-тварцы,
Есць словы-салдаты,
І словы без сэнсу — адна балбатня.
На свеце існуе слоў вельмі багата,
Але найжахлівей іх слова «вайна».
Скажы,
Ці затым чалавеку быў дадзен
Магутнага слова каштоўнейшы дар,
Каб ён, паддаючыся слоўнай прынадзе,
Сам па планеце раздзьмухваў пажар.
Дык хай жа і ў розум не траціцца вера!
За гэта змагаўся нязломны В'етнам,
За веліч сваю чалавека над зверам
І слова таксама змагалася там.
Яно палымнела на тварах плакатаў,
Яно вырывалася крыкам грудзей,
Яно ганьбавала злачынцаў і катаў,
Яно падымала мільёны людзей.
Я слаўлю цябе, ваяўнічае слова!
За праўду і мір ты ваюеш даўно.
Ты можаш быць сказана рознаю мовай,
Аднак жа ты значыш усюды адно.
Скажы мне,
З чаго твая сіла ўзнікае,
Адкуль цябе жывяць крыніцы надзей?
Быць можа прыйшла ўжо эпоха такая,
Што слова ідзе ў авангардзе падзей.
Сабраць, як бы войска, вялікія словы,
Паставіць сцяною насупраць вайны,
Каб сілай сваёю жывыя асновы
Для дружбы народаў стваралі яны.

ПРОЗА ЖЫЦЦЁВАЯ, ПРАЎДЗІВАЯ

Творчы вечар Івана Чыгрынева, які адбыўся нядаўна ў клубе Саюза пісьменнікаў, сабраў шмат прыхільнікаў ягонага таленту. Прыйшлі не толькі пісьменнікі, але і ўдзельнікі вайны, вучоныя, студэнты.

Вёў вечар Янка Скрыган. Цёплае слова пра раман «Плач перапёлкі» сказалі народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў, крытык Рыгор Бярозкін.

Сваімі думкамі аб творчасці пісьменніка падзяліліся Герой Савецкага Саюза Р. Мачульскі, доктар гістарычных навук, прафесар А. Залескі, народны пісьменнік рэспублікі І. Шамякін. Выступілі таксама А. Вялюгін, М. Бацвіннік, В. Адамчык.

І. Чыгрынаў расказаў аб працы над раманам, падзяліўся сваімі творчымі планамі.

«ВОБРАЗ У. І. ЛЕНІНА Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ»

На такую тэму адбылася лекцыя ў Голацкай сельскай бібліятэцы Пухавіцкага раёна. Лектар — супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР З. Казлова расказала слухачам аб творах савецкіх мастакоў М. Андрэева, І. Бродскага, М. Жукава, беларускіх майстроў А. Бембеля, К. Касмачова і іншых, у якіх шматгранна і ярка адлюстраваны вобраз вялікага правадыра.

А. ПІКУЛІК.

ВЯЛІКІ ПРЫЗ — БЕЛАРУСКАМУ СПЕВАКУ

Віктару Вуячычу, вядомаму беларускаму спеваку, які прадстаўляў Савецкі Саюз на міжнародным конкурсе эстраднай песні ў Токіо, журы прысудзіла Вялікі спецыяльны прыз фестывалю.

Вуячыч — адзін з самых папулярных спевакоў савецкай эстрады. Слухачам імпануе яго рэпертуар лірычных песень, вакальных твораў, напоўненых грамадзянскім пафасам.

Вуячыч часта выступае перад аматарамі савецкай песні ў зарубежных краінах — пабываў ужо ў многіх краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі. Ён — лаўрэат прэміі міжнароднага конкурсу эстраднай песні «Залаты арфей».

На конкурсе ў Токіо Вуячыч выканаў песню беларускага кампазітара Ігара Лучанка «Спадчына», напісаную на словы Янкі Купалы. Спевака з гэтым кампазітарам звязвае даўняя дружба. Песні Лучанка дапамаглі яму выйсці пераможцам на савецкіх і зарубежных конкурсах эстрады.

Сярод святочных дзён, на якія багатая першая дэкада мая, — Дзень друку і Дзень радыё. З вялікай пашанай адносіцца савецкі народ да сваіх журналістаў, і таму святы гэтыя шырока і ўрачыста адзначаюцца.

Няма работніка літаратуры, мастацтва, культуры, які б у паўсядзённай практыцы самым цесным чынам не быў звязаны з газетай, радыё, тэлебачаннем. Таму ўсіх нас цікавіць як сённяшні дзень, так і будучае савецкай журналістыкі.

Вось чаму слова з нагоды гэтых святаў рэдакцыя папрасіла сказаць Б. Стральцова — выхавацеля работнікаў друку, журналіста і літаратара.

Б. СТРАЛЬЦОЎ

ПЕРАД ВЯЛІКАЙ ДАРОГАЙ

УСЁ ПРОСТА і разам з тым урачыста. Ад сцяны да сцяны, праз усю аўдыторыю — доўгі паліраваны стол, за якім сядзяць члены камісіі. Па адным заходзяць студэнты-выпускнікі...

Цяжка сказаць, хто больш хвалюецца: вось гэтыя маладыя людзі, што садзяцца перад сталом камісіі з затоеным напружаннем, яное кожны раз праяўляецца па-рознаму, у залежнасці ад характару чалавека, ці прыцярушаныя снегам сівізны члены камісіі, якім даручана паставіць апошнія кропкі ў студэнцкіх біяграфіях. Відаць, аднолькава. Можа толькі ў апошніх хваляванне памнажаецца на больш яснае ўсведамленне адказнасці за лёс кожнага выпускніка, за агульную справу, якую ім рабіць і вырашаць.

Я гляджу на студэнтаў і стараюся аднавіць у памяці першы дзень сустрэчы з іхнім пачатковым курсам, першую прачытаную ім лекцыю па тэорыі і практыцы савецкай журналістыкі. Дзе хто сядзеў і як кожны з іх сябе паводзіў? Усё прыпомніць немагчыма. Але здаецца мне—і гэта ўражанне ўсё больш і больш акрэсліваецца, быццам то быў нейкі другі курс, нейкія другія маладыя людзі сядзелі тады ў аўдыторыі. Не па знешнім абліччы другія, а па сваёй унутранай сутнасці, па поглядах на жыццё, будучую прафесію і саміх сябе. Яны тады амаль усе без выключэння лічылі сябе завершанымі журналістамі, перад якімі вось-вось адчыняцца дзверы ў прыемнае жыццё, запоўненае падарожжамі на паветраных лайнерах, сустрэчамі ў міністэрскіх і дыпламацкіх кабінетах, нетаропкімі гутаркамі скептычных эрудытаў за рэстараннымі столікамі—якраз у гэткім плане, у якім падаецца прафесія журналіста некаторымі пісьменнікамі і кінарэжысёрамі. Гады вучобы, практыкі ў раённых, абласных, рэспубліканскіх газетах развеялі гэты ружовы міраж. Пасталелі хлопцы і дзяўчаты, хто больш, а хто, па праўдзе кажучы, і менш, але зразумелі, якую нялёгкую ношку яны кладуць на свае плечы, як гэта цяжка і адказна быць сапраўдным журналістам, зразумелі, што не аднымі ружамі і часцей за ўсё не ружамі ўслана дарога газетчыка.

Я гляджу на студэнтаў, і ўспамінаю, як пяць, дзесяць, пятнаццаць гадоў назад вось гэтак жа падыходзілі да стала размеркавальнай камісіі выпускнікі больш блізкіх да майго ўзросту пакаленняў. Сёння яны нясуць, гаворачы словамі паэта, «галоўную службу» ў беларускай і не толькі беларускай журналістыцы. Сёння яны—карэспандэнты газет, якія чытаюцца мільёнамі, і супрацоўнікі сціплых раёнак і шматтыражак. Сёння яны — аўтарытэтныя дзяржаўныя дзеячы, відныя літаратары, салідныя кіраўнікі рэдакцыйных калектываў і тыя безымянныя, самаахвярныя рэпарцёры, пра далёкія і цяжкія дарогі якіх дзеля некалькіх радкоў у газеце і ў песні пяецца. Мы, выкладчыкі факультэта, гэтым ганарымся. Недарэмнымі, значыць, былі гады, праведзеныя будучымі журналістамі ва універсітэце. Не марна, значыць, чыталіся лекцыі, запрашаліся для гутарак з імі старэйшыя таварышы па будучай прафесіі, наогул цікавыя людзі.

Вось так год за годам — адных факультэт праводзіць у самастойнае працоўнае жыццё, другіх сустракае. Прыходзіць моладзь прама са школьнай парты, прыходзяць юнакі, якія адслужылі ў арміі ці адпрацавалі пэўны час на вытворчасці. Ёсць сярод студэнтаў і такія, што ўжо маюць другую спецыяльнасць. Іх паклікала да сябе журналістыка, адна з самых старажытных прафесій на зямлі.

Старажытная і адначасова, калі весці адлік часу ад «Маніфеста Камуністычнай партыі» Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса праз полымя Вялікага Кастрычніка да нашых дзён, прафесія якасна новая. Маркс і Энгельс сфармулявалі законы пераўтварэння свету. Вялікую ролю ў гэтым рэвалюцыйным пераўтварэнні яны адводзілі друку, які лічылі важнейшым сродкам прапаганды ідэй і выхавання мас, незаменным інструментам ва ўмацаванні інтэрнацыянальных сувязей паміж атрадамі пралетарскай арміі. Неацэнны ўклад у развіццё тэорыі і практыкі пралетарскай журналістыкі зрабіў У. І. Ленін. Закладваючы асновы партыйнага друку, ён стварыў той фундамент прынцыпаў партыйнай журналістыкі, на якім і сёння стаіць будынак усёй савецкай прэсы. К. Маркс, Ф. Энгельс, У. І. Ленін самі былі прафесійнымі журналістамі, геніяльнымі публіцыстамі свайго часу. Яны выхавалі і з'ядналі цэлую армію партыйных журналістаў. Паняцце «публіцысты ленінскай школы» сёння з'яўляецца для нас сінонімам рэвалюцыйнай страснасці, партыйнай адданасці і самаахвярнасці, прыкладам беззапаветнага служэння свайму народу, узорам высокага прафесійнага майстэрства. Яны з годнасцю пранеслі высокае званне партыйнага публіцыста, журналіста праз турмы і катаргу, праз полымя рэвалюцыйных баёў і засталіся вернымі справе Камуністычнай партыі да канца. Яны былі палымянымі змагарамі і адначасова аўтарамі летапісу вялікага пераўтварэння свету.

Ці здолеюць жа выпускнікі факультэта журналістыкі працягваць вялікую справу публіцыстаў ленінскай школы? Ці будуць яны ў новых умовах і новых сітуацыях гэткімі ж мужнымі і адданымі, нязломнымі і прынцыповымі прапагандыстамі ідэй Камуністычнай партыі, адказнымі за ўсіх і за ўсё, што адбываецца ў нашай краіне, на ўсёй планеце—адным словам, людзьмі партыйнымі, людзьмі дзяржаўнымі? На мой погляд, здолеюць, будуць, змогуць! Факультэт раскрыў перад імі сутнасць прафесіі савецкага партыйнага журналіста. Студэнты зразумелі веліч і глыбіню ідэй, якія натхнялі на творчасць бальшавіцкіх публіцыстаў. Яны добра ўсвядомілі, чаму газетчыкі перадваенных пяцігодак узнімаліся на рыштаванні Магніткі і Днепрагэса, штурмавалі Паўночны полюс, смажыліся пад гарачым сонцам пустынь, чаму журналісты былі заўсёды на пярэднім краі працоўнага фронту—іх партыйнае слова памнажала энергію мас, яно было трэба народу не менш, чым хлеб і цэмент, вугаль і жалеза. Маладое пакаленне журналістаў ведае пра перакананасць сваіх папярэднікаў і селькораў, якія разам з усім народам праводзілі калектывізацыю сельскай гаспадаркі, ламаючы векавую псіхалогію ўласніка і супраціўленне ўзброеных абрэзамі кулакоў. Добра ведае яно і пра тых, хто з блакнотам і наганам у руках ішоў у атаку на фашысцкія траншэі, пра герояў-газетчыкаў, якія не вярнуліся ў рэдакцыю.

Пераемнасць традыцый—цудоўная асаблівасць журналісцкай прафесіі. І разам з тым сучасны журналіст павінен валодаць новымі якасцямі. Наша эпоха — час вялікіх рэвалюцыйных здзяйсненняў і класавых баёў, глыбокага сацыялістычнага абнаўлення свету, выдатных дасягненняў навукі і тэхнікі. Усе яе вялікія падзеі неаддзельныя ад жыцця і барацьбы рабочага класа і яго баявога авангарду—партыі камуністаў. Савецкія журналісты—неад'емная частка гэтага авангарду. І гэта накладае на іх надзвычай высокія абавязкі, патрабуе акумулівання самай высокай энергіі, тэарэтычных ведаў і практычнага вопыту.

Таму ўсе мы, хто мае дачыненне да выхавання будучых журналістаў, хто сам варыцца ў рэдакцыйным катле, пакуль што не дужа задаволены тым, як выглядаюць нашы калегі на старонках некаторых кніг, на кінаэкранах. Найчасцей нам паказваецца або пышнае «салодкае» жыццё, успомненае мною ў пачатку гэтых нататак (ах, як смакуюць яго абывацелі!), або нейкі абмежаваны пралаза, які толькі раздражняе сапраўдных працаўнікоў. Ці трэба казаць, наколькі далёка і адно, і другое ўяўленне ад сапраўднасці, і як мала падобны савецкі журналіст—прынцыповы і сціплы змагар за інтарэсы партыі і народа—на гэтае крывое сваё адлюстраванне.

Сёння наша краіна жыве і кіруецца задачамі, акрэсленымі XXIV з'ездам КПСС. А гэтыя задачы грандыёзныя і захапляючыя. Прадугледжана далейшае магутнае развіццё індустрыі як падмурка эканамічнага патэнцыялу і абараназдольнасці краіны. Выстаўлена вялікая комплексная праграма развіцця сельскай гаспадаркі, уключаючы ўсе галіны, што вызначаюць поспех гэтага развіцця —механізацыю, хімізацыю, меліярацыю і інш. Рашаючым, вядучым фактарам высокіх тэмпаў развіцця эканомікі партыя вызначыла павышэнне эфектыўнасці вытворчасці на аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу і больш поўнага скарыстання ўсіх яго рэзерваў. Рашэнні з'езда прасякнуты клопатамі аб дабрабыце народа, павышэнні тэмпаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці, павелічэнні яе эфектыўнасці, аб далейшым развіцці палітычнай свядомасці мас, імкненнем яшчэ больш шчыльна спалучыць гаспадарчую і ідэйна-выхаваўчую работу. Акрамя таго, XXIV з'езд КПСС зноў падкрэсліў неабходнасць развіцця крытыкі, патрабаваў больш рашуча вызваляцца ад тых, хто парушае партыйную і дзяржаўную дысцыпліну, злоўжывае службовым становішчам. І да ўсяго гэтага ёсць самы пільны клопат журналістам, як актыўным памочнікам партыі, барацьбітам за ажыццяўленне партыйнай лініі. Вялікі комплекс складаных задач патрабуе глыбокага пранікнення ў жыццё—і ў агульнадзяржаўных, і ў мясцовых маштабах. Савецкі друк павінен па-дзелавому, эканамічна і палітычна абгрунтавана, публіцыстычна востра ставіць усе пытанні, весці аналіз жыццёвых з'яў, заглядваючы наперад, беручы арыенціры на перспектывы росту, на дзень заўтрашні.

Вось у гэтых адносінах—у сэнсе асваення бурных працэсаў рэчаіснасці, набыцця глыбокіх ведаў — выпускнікам факультэта давядзецца працаваць усё жыццё. Журналіст не можа спыняцца ў сваім развіцці, бо ён — пастаянны разведчык палітычных, эканамічных, сацыяльных аспектаў нашага грамадства, чалавек, нацэлены ў будучыню. Ён працуе ў адзеле эканомікі сельскай гаспадаркі —і павінен ведаць па тым пытанні, якое стала прадметам яго даследавання, не менш, чым аграном або заатэхнік. Займаецца эканомікай прамысловасці — і абавязаны пры неабходнасці разабрацца ў канкрэтным працэсе не горш за інжынера, тэхнолага, эканаміста. З вучоным ён павінен гаварыць на мове навукі, з рэжысёрам ці кампазітарам — на мове мастацтва. І ў той жа час, калі мець на ўвазе ўсе сумежныя галіны чалавечай дзейнасці, журналісту трэба мець дыяпазон ведаў куды больш шырокі, чым, скажам, аграному, заатэхніку, рэжысёру. Спецыялізуючыся ў вузкай галіне, сучасны журналіст павінен мець шырокі кругагляд, быць у нейкай ступені універсалам. Бо ён у сваёй паўсядзённай рабоце сутыкаецца з усёй шматграннасцю жыцця. Філасофія, гісторыя, філалогія, эканоміка прамысловасці і сельскай гаспадаркі, эстэтыка і этыка, юрыспрудэнцыя і этнаграфія — усё гэта, хоць бы ў сваіх асновах, павінна ляжаць у «запасніках» памяці журналіста і на працягу яго жыцця папаўняцца, узбагачацца.

Кажуць, што мастацкая літаратура —гэта чалавеказнаўства. Не ў меншай меры чалавеказнаўчы аспект уласцівы і публіцыстыцы. Прычым, публіцыстыка мае справу з рэальнымі асобамі. А пры абмалёўцы канкрэтных людзей, раскрыцці іх псіхалогіі і характараў нецярпімы нават самы дробны фальш. З улікам гэтага можна з поўнай падставай сцвярджаць, што сённяшні журналіст павінен быць і мастаком, здольным стварыць праўдзівы і яркі партрэт сучасніка, і глыбокім псіхолагам, і, вядома ж, сапраўдным публіцыстам, які ўмее аператыўна распараджацца рэальнымі фактамі і здабываць з гэтых фактаў сэнс.

5 мая—дзень нараджэння флагмана нашай прэсы газеты «Правда» — стаў Днём друку, святам савецкіх журналістаў. Гэтае свята не азначана ў календары чырвоным колерам. Журналісты і ў дзень свайго свята на працоўным пасту. Газета выходзіць штодня, і ў кожным нумары газеты—пастаянны журналісцкі пошук, гарачыя рэдакцыйныя будні, а часам і бяссонныя ночы, у кожным нумары—усё тое, чым жывуць і пра што дбаюць савецкія людзі.

...Аб усім гэтым думаю, пазіраючы ўслед сваім вучням, якім заўтра — ў вялікую жыццёвую дарогу.

Вольгу Корбут ведаюць усе чытачы...

Фотаэцюд Ю. ІВАНОВА.

Пісьменнік Алесь Савіцкі працуе над раманам «Верай і праўдай» — кнігай пра мужнасць нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пісьменнік сам быў удзельнікам барацьбы супраць гітлераўцаў, камандаваў у партызанскім атрадзе дыверсійнай групай, потым ваяваў ў дзеючай арміі і закончыў вайну ў Берліне. У новы твор А. Савіцкага, які мы прапануем нашым чытачам, пакладзена шмат з асабістага, перажытага.

Алесь САВІЦКІ

ВЕРАЙ І

КРУПНЯ ўглядаўся ў няроўныя абрысы бяроз, што шнурам цягнуліся паабапал брукаванкі. Углядаўся пільна, поўны цяжкага роздуму і трывогі; ён тоіў у сабе і гэты роздум, і гэтую трывогу, і хваляванне ад прадчування блізкага бою.

Вершаліны дрэў былі добра акрэслены на вечаровым небе, якое слаба ірдзела — у тым баку зайшло сонца, — а камлі патаналі ўжо ў зусім густым змроку; гэты ж змрок ахутаў і малады асіннік, што пачынаўся ад лесу і вострым клінам уразаўся ў белаватую туманную парнасць, і хату дарожнага майстра — відзён быў толькі вільчык чырвонай чарапічнай страхі.

За брукаванкаю ў балацінцы тужліва, але дужа зладжана, крычалі драчы; недзе далёка рыкалі каровы; мяка-мякка шухцеў малады асіннік над галавою. Нечакана памроілася: ніякай вайны няма, гэта Крупня выехаў на звычайную нядзельную рыбалку, і сябры пайшлі стаўляць на ноч донкі, а ён ляжыць непадалёк ля прыгаслага вогнішча і глядзіць, як запальваюцца і гусцеюць на небе зоркі. Ён дужа любіў такія вось дзівосныя, поўныя хараства і чароўнасці часіны, калі на зямлі ўжо гаспадарыць ноч, а ў далёкай высі яшчэ поўна светлых фарбаў, і, памалу звужаючыся, атухае пад небасхілам барвовая істужка: думалася ў такія часіны заўжды лёгка, узнёсла.

Цяпер была якраз такая часіна блізкай ночы, і гэтак жа, як мноства разоў бачанае, ірдзела, атухаючы, палоска неба над шатамі бяроз, і гусцеў зорны россып. Але ў думках Крупні не было звыклай, гаючай лёгкасці: думкі прыгняталі, трывожылі, і ён не ведаў ад іх пагатунку і збавення.

Шостыя суткі Крупня водзіць свой маленькі партызанскі атрад вакол горада. Спачатку іх было трыццаць чалавек. Потым памёр, не зусім разумна ахвяраваўшы сваім жыццём, Богаш. Потым пайшлі на разведку і не вярнуліся з горада Шлык і Коршун. Цяпер у атрадзе дваццаць сем, толькі дваццаць сем... А колькі застанецца пасля гэтага бою? І ці мае Крупня маральнае права кінуць свой маленькі атрад на буйны штаб, які пільна ахоўваецца? Кінуць на тыя два браневікі, на тыя кулямёты, што тырчаць амаль з кожнай машыны ў садку дарожнага майстра? Дзе гарантыя, што ён не пакладзе ўвесь атрад пад нямецкімі кулямі? Дзе гарантыя, што яны паспяхова знішчаць той штаб? І, зрэшты, дзе больш карысці: у тым, каб знішчыць дзесятак машын, захапіць, мажліва, нейкія дакументы і, мажліва, панесці вялікія страты, ці захаваць сілы атрада для разгортвання сапраўды шырокай барацьбы ў тыле ворага?.. Набраць моцы, набраць сілы, а потым ужо ўдарыць па цемцах. Але ж для гэтага патрэбна сувязь са штабам партызанскага руху, а гэтай сувязі пакуль няма... А там, пад тымі бярозамі, у штабных машынах ёсць жа напэўна перадатчыкі! А калі ніякага перадатчыка не знойдзецца? Хоць і ахвяруеш палову атрада дзеля гэтай мэты?

Крупня пакутліва думаў, меркаваў і так і сяк, не знаходзячы дакладных, абгрунтаваных адказаў на свае пытанні і ўсё больш выразна пачынаў разумець — не розумам пакуль што, не сэрцам, а нейкай інтуіцыяй, невядомым раней пачуццём, якое і здзіўляла і абнадзейвала яго, — што рашэнне граміць фашысцкі штаб не толькі правільнае, але і прынцыпова важнае. Для яго асабіста, для лёсу ўсяго атрада цалкам. Ён, Крупня, не мае больш маральнага права вадзіць свой атрад па лясах без бою. Хопіць глядзець, як паўзуць па дарогах матарызаваныя калоны, глядзець на ворага штодня і не страляць па ім, а толькі сціскаць ад ярасці кулакі! Хопіць! Ён павінен павесці людзей у бой, прыняць гэты бой, прыняць разумна, пазбегнуць страт, захапіць рацыю, захапіць зброю і потым рушыць у далёкі рэйд да сваёй базы! Сёння і ёсць якраз той момант, якога чакаў Крупня, вось тая ноч, дзеля якой блукалі яны вакол горада поўны тыдзень, выглядаючы, прымерваючыся!

Нячутна ступаючы, падышоў Лабун, сеў, уздыхнуўшы, нейкі час маўчаў, і Крупня зразумеў, чаму маўчыць яго камісар. Так, яго прыгнятае той жа клопат, тыя ж думкі трывожаць, тая ж, мабыць, развага.

Крупня з непадробленай радасцю спытаў:

— Што, камісар, ударым немца?

— Ты ведаеш, калі мы сёння не раскалашмацім гэты штаб — у душы можа штось надламіцца. Я пачынаю сам сябе зневажаць. Зброя ў руках, а я — туляюся... І вось яшчэ думаю: можа ў гэтую ноч якраз выходзяць на рубяжы нашы дывізіі і пагоняць яны, папруць гэтых нелюдзяў у іхняе воўчае логава! Хіба даруеш сабе потым, калі адседзіш менавіта гэтую ноч у зацішку...

— Здаецца, прадумалі ўсё. А мо дзе чаго і не ўлічылі?

— Ды не... Хлопцы ж нават на зямлі малявалі: дзе, што стаіць у тым садку, куды кожны павінен кінуцца. Кожнае ж вакно ў хаце размеркавана: на кожнае — граната. Тады так і зробім, як вырашылі: наляцелі, ударылі, зніклі. Я папярэдзіў яшчэ раз усіх, і начштаб папярэдзіў: аніякага шуму, аніякага крыку. Каб, як прывіды якія...

Лабун казаў гэта пошапкам, паспешліва, быццам спрабаваў пераканаць Крупню, абнадзеіць, пасяліць у ім, Крупні, упэўненасць, і, разам з тым, праверыць сябе, супакоіць. Крупні гэта падабалася: трывожыцца і Лабун, не толькі ты адзін!

Зварухнулася галіна асінкі, што была крокі за тры ад іх, і з-за дрэўца, як здань, выплыла чалавечая постаць: нават крокаў не чуваць было.

— Хто? — спытаў Крупня. — Шынайка, ты?

— Не, гэта я, Пажога, таварыш камандзір. Шынайка застаўся, вядзе назіранне.

— Якая там абстаноўка? Без змен?

— Змены ёсць.

— А што? Што? — Лабун устрывожана апярэдзіў пытанне Крупні.

— Вартавыя паснулі. Хадзілі, хадзілі ля хаты, потым прыселі пад бэзам — лавачка там стаіць. Гергекалі, гергекалі... Курылі. Адзін толькі курыў, другі, здаецца, не курыць. А цяпер, гады, спяць. Абодвы. Як у сваёй хаце, адным словам. Я блізенька падпоўз, дык ажно чуваць, як пахропваюць...

І Крупня аддаў загад пачынаць аперацыю. Група, якую ён узначальваў сам, павінна была забяспечыць прыкрыццё з боку брукаванкі, зняць без стрэлу вартавых, потым знішчыць бранявік ля ганка і ўварвацца ў хату. Група Лабуна заходзіла ад садка, і ёй трэба было таксама знішчыць другі бранявік, і знішчыць машыны, і захапіць, не пашкодзіўшы пры тым, машыну сувязі.

Крупня націснуў Лабуну руку, папрасіў ціха і сардэчна, а потым пасяброўску крануў за плячо:

— Ты толькі асцярожна, на злом галавы не кідайся пад кулі. Залішне не рызыкуй... Яшчэ раз папярэдзь усіх сваіх: мая ракета — усім маланкава наперад. Ну, жадаю табе...

Крупня ішоў, трымаючы напагатове аўтамат. Побач крочыў Тарлер, потым неяк незаўважна адстаў, і толькі ў канцы асінніку, калі пачалі наперадзе добра акрэслівацца бярозавыя прысады, Крупня ўбачыў справа, за постаццю Голуба, як бліснулі шкельцы акуляраў, і падумаў пра тое, што варта было адправіць Тарлера назад, каб ён са сваім благім зрокам чаго не наблытаў. Але рабіць гэта было позна ўжо: да брукаванкі заставалася крокаў дзесяць.

Пад даланёю сагрэлася драўляная цэўка прыклада, і толькі метал курка, крыху вільготны ад расы, халадзіў палец, і гэты халадок расцякаўся па ўсёй руцэ: ён, гэты халадок, быў як нейкая мяжа паміж тым роздумам, што прыгнятаў Крупню ў асінніку, і той невядомасцю, якая тоілася ў ночы і падпільноўвала іх. Цяпер, калі было прынята рашэнне ісці наперад той невядомасці, наперад той нечаканасці, што тоілася ў начным змроку, калі ніхто ўжо не мог перарабіць, перайначыць рашэння, усё — і жыццё Крупні, і жыццё Лабуна, і жыццё кожнага партызана атрада, і тое будучае, дзеля якога гэты атрад быў створаны, і лёс тых людзей, што звязаны з лёсам кожнага ў атрадзе, — літаральна ўсё гэта, і шмат чаго яшчэ, што было ў кожным сэрцы, у думках, у марах, залежала цяпер ад кемлівасці, асцярожнасці, лоўкасці, вытрымкі. Смерць побач! Смерць... Яна ёсць, яна існуе, але пакуль што маўкліва чакае, загнаная розумам людзей у рабрысты чыгун гранаты, у медзяныя гільзы патронаў, маўкліва чакае імгнення, каб гэты ж розум, які спарадзіў яе, даў ёй прастору, выпусціў на волю, паказаў тое, што яна знішчыць, не беручы пад увагу ні маладосці, ні высакародства, ні прыгажосці, ні самога розуму. Але яна, гэта смерць, што маўкліва стоілася, схавалася ў рабрысты чыгун гранат, у медзяныя гільзы патронаў, у адточаныя і вострыя грані штыхоў — яна, гэтая смерць, можа і ўратаваць гэты розум, супраць якога і накіравана, яна можа ўратаваць розум, уратаваць жыццё, бо тое, супраць чаго яна зараз будзе накіравана, з'явілася тут, на гэтай зямлі, дзеля таго, каб забіваць, гвалтаваць, нішчыць жыццё, якое ёсць, нішчыць жыццё, якое можа быць заўтра, праз год, праз дзесяць год, праз стагоддзі. І таму трэба скіраваць смерць супраць смерці, забіць яе, смерць, забіць у імя жыцця, у імя справядлівасці, у імя выратавання таго святога, у што верыць чалавек, чым жыве, чым можа жыць, чым будзе жыць. І таму трэба забіваць тых нелюдзяў, што зараз спяць у хаце дарожнага майстра, ніколькі не турбуючыся пра тое, дзе і што робіць гаспадар гэтай хаты, дзе пакутуе яго жонка, яго дзеці. І таму трэба абудзіць смерць і забіваць чужынцаў...

Крупня ведаў, што будзе забіваць, будзе забіваць бязлітасна, забіваць без згрызоты, забіваць з чыстым сумленнем, і ўсё ж адчуваў непрыемнае трымценне ў плячах, адчуваў, як грукоча ў грудзях сэрца, адчуваў непазбежнасць таго, што павінен быў зрабіць, і гэтая непазбежнасць вяла яго наперад, спараджала абвостраную рэакцыю на кожны шоргат, на кожны нават зусім слабы гук, на кожны новы пах, на кожнае новае адценне змроку, якое хутка змянялася пад шатамі бяроз.

Крупня моўчкі паказаў рукою, каб Мацко паставіў кулямёт не на брукаванцы, а за ўзбочынаю, ля камля старой бярозы, адкуль было б зручна страляць у любым напрамку. І ў той жа момант, калі ён паварочваўся ад брукаванкі да хаты, злева, побач зусім пыхнуў трапяткі ўсплеск агню і рэзка гакнуў стрэл.

Патрэба ў сігналу ракетай адпадала сама па сабе, у ім не было сэнсу, бо нечаканы стрэл закрэсліваў усе ранейшыя планы, усё паварочваў інакш, зусім не так, як гэтага хацелася Крупні, як гэта яны распланавалі на адвячорку, але ён не мог ужо спыніцца, ускінуў руку з ракетніцай над галавою і стрэліў. Адразу ж кінуўся да хаты дарожнага майстра.

Ён бег, выдзіраючы з гранаты шурпатае колца чакі, і яшчэ не мог дакладна вызначыць, ці немцы гэта мільгацяць між яблынь і сліў у садку, ці ірванулася на штурм група Лабуна.

Ля ганка Крупня параўнаўся з Пажогай. Ракета ўжо распусцілася ў начной высі дзівосна-загадкавай кветкаю. У яе мігатлівым бледна-зялёным святле твар Пажогі быў у чорных мокрых пісягах, барвовых па краях, і Крупня зразумеў, што гэта кроў, але не здзівіўся, не папытаў, ці паранены ён, а вылаяўся злосна і брыдка:

...душу... бога!.. Хто страляў? Без загаду?

— Немец! Немец гэта... Дваіх вартавых мы разанулі, а гэты, зараза, пад бэзам на плашчпалатцы спаў. Шынайку ён ва ўпор, з карабіна. Але і я яго, гада, фінкаю...

— Кідай у тое акно! У тое! Гэта — маё!

Крупня шпульнуў гранату ў акно адначасова з Пажогай і бразнуўся на зямлю ля падмурка. Да ганка нейкімі дзіўнымі скокамі-зігзагамі імчаў Тарлер. Пінжак на ім развяваўся, як крылы, і сам ён увесь быў падобны на курку-квактуху, якая не ратуецца ад небяспекі ці нейкага спалоху, а храбра кідаецца на свайго крыўдзіцеля. Крупня смарганyў яго за крысо пінжака і паваліў на зямлю.

— Куды? Кладзіся!..

Глуха грымнулі два выбухі, і следам за імі яшчэ два — з таго боку хаты таксама кінулі ў вокны гранаты. Траскотна застукалі аўтаматы ў садку, запалалі, ахопленыя агнём, машыны.

Крупня ўскочыў:

— Пажога! За мною! У хату!

Ён штурхануў ботам дзверы і, стоячы на парозе, абмёў аўтаматнай чаргою сенцы. У сенцах было поўна дыму. Адны дзверы ляжалі на падлозе, другія, што вялі направа, скасабочыліся, віселі на адной толькі завесцы. У левым пакоі, куды Крупня ўскочыў, віўся дымны чад згарэлага толу, смярдзела, як смярдзіць на старой прыбіральні, якую пачалі чысціць і разварушылі; падсвечаная полымем машын, што гарэлі ў садку, дзіўным страшэнным вокам бліскала на сцяне люстэрка, а на падлозе курчыліся, стогнучы, белыя постаці, і Крупня ўвагнаў у іх адну за другой чатыры доўгія чаргі... У кутку на стале Крупня заўважыў два партфелі: адзін закрыты, з бліскучымі ад водбліскаў агню замочкамі, а другі адкрыты, які ляжаў ускрай, пляскаты, як блінец. Крупня згроб у партфель планшэткі, цяжкія парабелумы, нейкія паперы і незнаёмыя рэчы са стала, схапіў партфель з бліскучымі замочкамі і мітнуўся на ганак — яшчэ б крыху і ён бы задыхнуўся ад гэтага смярдзючага паветра, густа натоўчанага парахавым дымам, згарэлым толам, пахам крыві і смерці.

Крупня выскачыў на ганак і адхіснуўся, баронячыся ад агняных стужак трасіруючых куль, якія, здавалася, упіраліся яму ў самыя грудзі. Не выпускаючы партфеляў з рук, ён скаціўся па нізкую прыступку, з яе на зямлю, і, скочваючыся, трахнуўся каленкаю аб шырокі рабрысты камень. Цяпер ён бачыў, што агняныя трасеры хуткастрэльнага нямецкага кулямёта і аўтаматныя чэргі грымяць з густога вішняку правей пагрубка, ля якога палаў падарваны гранатамі бранявік.

З акна хаты, як мяшок, выкуліўся Пажога, плёхнуўся на зямлю побач з Крупняй, сыпануў скарагаворкаю:

— Прамаргалі, прамаргалі заразу, прамаргалі... Якую ляпу далі! Гэта ж там у іх асноўны вузел аховы!.. Эх, маржовы я...

— Гранаты і туды! Ёсць гранаты? Да сценкі такіх разведчыкаў ставіць!..

— Нямецкія. У хаце ўхапіў. Ну, камандзір, я вінаваты, я і выпраўлю. Даруй!

Пажога хутка, як вужака, папоўз па зямлі. Крупня, ад болю прыкусіўшы губу, пачаў расціраць каленку. Штаніна была мокрая ад крыві, і ён здрыгануўся, але здрыгануўся не ад таго, што ўбачыў на руках кроў, не ад болю, а здрыгануўся і сцяўся ад думкі, нечаканай, балючай, якая сціснула сэрца, спарадзіла глухі стогн душы. Мёртвага аблаяў! Шынайку забіў ва ўпор вартавы немец. А ты яго, нежывога, аблаяў! І Пажогу аблаяў! І пагнаў яго на кулямёт. А сам ляжы-ыш! Ляжыш і вінаватага шукаеш! А вінаваты сам!.. Разведка не заўважыла? Дык што! Ты павінен быў прадбачыць! Ты камандзір! За ўсё на табе адказнасць першая і галоўная!.. Ты вінаваты! Дык і выпраўляй! Сам выпраўляй!..

Крупня ўскочыў з зямлі, пакульгаў, перасільваючы боль, дагнаў Пажогу, які прапоўз метраў дзесяць, бразнуўся побач на зямлю, загадаў адрывіста:

— Гранату!

Ён выхапіў з рук Пажогі гранату на доўгай драўлянай ручцы. У той жа міг злева, з-за вугла хаты, раскаціста

загрукаў буйнакаліберны кулямёт. Доўгія і вялізныя, агняна-белыя, чырвоныя, сінія пацеркі панесліся ў вішняк, у тыя два светлыя колы, адкуль ляцелі каляровыя істужкі трасірных куль; пацеркі гэтыя скрыжоўваліся з імі, высякалі з тых светлых колаў россыпы зорных кропляў і ламалі, раскідвалі іх на бакі, і кроплі ўзляталі, рассыпаліся ў паветры, згасалі, і на замену ім ляцелі новыя, і ў гэтым карагодзе, здавалася, трасецца, як у ліхаманцы, бліскучы ад водбліскаў агню вішняк; мядзяным воблакам пыхнуў бензабак, асвяціўшы вішняк знутры, і ў гэтым агні прапалі усе каляровыя трасеры, апроч тых, што ляцелі з-за вугла хаты: яны былі такія ж буйныя, гэтыя пацеркі агню, але цяпер толькі чырвоныя, і яны прапорвалі вішняк наскрозь, шчаплялі драўляныя барты машыны, рыкашэцілі аб метал і белымі зоркамі завінчваліся ў трапяткое, дрыгатлівае ад каляровага агню неба.

Грымлівыя чэргі абарваліся раптоўна, і раптоўна наступіла цішыня. Было толькі чуваць, як штось трэскаецца, ламаецца, чмыхае, пыхкае ў полымі ў садку, у вішняку, за хатаю; у водбліскаў агню загадкава і дрогка пабліскваў за бярозамі прысад каменне блізкай брукаванкі.

што вы хочаце? Я кажу: шукаю акуляры. А ён усё сваё чаўпе: «Вас? Вас?»

Адзенне, якое Тарлер прывалок з хаты, палонны адмовіўся надзяваць, нешта горача пачаў даводзіць. Тарлер пераклаў:

— Кажа, што гэта мундзір генерала арміі і ён не мае права надзяваць мундзір генерала. Патрабуе, каб далі яго адзенне, ён маёр, і на яго мундзіры ўзнагароды, якія пачапляў сам Гітлер.

— Тады няхай ідзе ў споднях!

— Надзяваць! Хутка! — загадаў па нямецку Тарлер, і палонны паспешліва пачаў нацягваць мундзір.

З-за хаты, вуркочучы, выпаўз нізкі бронетранспарцёр і Крупня здзівіўся, бо зблізку бачыў такую машыну ўпершыню. На бранi бартоў, наўскасяк зрэзаных, была вялізная лічба «3», а побач з ёю чорны крыж з белай аблямоўкаю. Гусеніцы ішлі да бартавых дзверцаў, пярэднія колы былі гумовыя, з глыбокімі шырокімі пратэктарамі: перад радыятарам — тоўсты рулон звязаных дротам і гладка абстружаных драўляных круглякоў; крыху ўзвышаючыся над бартамі, пабліскваў у святле полымя тоўсты і доўгі ствол буйнакалібернага кулямёта.

і непакой і тое жахлівае, жудаснае адчуванне, якое было ў сэрцы нядаўна, калі ён страчыў з аўтамата па немцах, якія стагналі і курчыліся на падлозе хаты дарожнага майстра.

●

Апоўдні атрад Крупні быў гатовы рушыць у вялікі і доўгі рэйд да асноўнай базы, што была размешчана па левы бок Дзвіны. У бярозавым гаі на поўдзень ад Заполля быў пахаваны Шынайка, які сканаў ад раны на золаку, перад самым узыходам сонца. Яго загарнулі ў нямецкую плашчпалатку, і, калі зарывалі магілу, Пажога даў развітальны салют — страшэнна доўгую чаргу з буйнакалібернага кулямёта...

Праз тры гадзіны пасля пахавання Шынайкі рушылі на Усход Васіль Пажога, Мікола Каленчыц і Віктар Глебка. Гэтая група ішла за лінію фронту з адказным заданнем: даставіць нашаму камандаванню аператыўныя карты, розныя цыркуляры і загады, якія былі захоплены пасля разгрому армейскага штаба. Крупня разумеў, якая цяжкая дарога ў гэтай групы, але спадзяваўся, што яна пройдзе: Пажога — з-пад Смаленска, Каленчыц — з-пад Веліжа, Глебка

быў памыты, паголены, старанна прычэсаны. Выгляд у яго быў даволі інтэлігентны: высокі, разумны лоб, з разумнай хітрынкаю карыя вочы пад густымі брывамі: позірк спакойны, хоць і ўстрывожаны, але без ценю баязлівасці. Маёр убачыў у Крупні на каленях карту, паківаў галавою, сказаў тры словы спагадліва, і Тарлер хутка, амаль адначасова з нямецкім вымаўленнем, пераклаў іх.

— Роздум наіўных стратэгаў...

— Захапленне разумным ворагам, — сказаў Крупня, складаючы ў трафейную планшэтку нямецкую кіламетроўку. — Дакладныя і выдатныя карты...

Нямецкі парабелум замінаў, і Крупня, каб лепей скласці карту, выцягнуў яго і—злавіў позірк маёра, іранічны позірк, поўны пагарды да небяспекі і смерці, тут жа зразумеў, што ён, маёр, будзе паміраць ганарліва ў імя той мэты, да якой заклікае ўсіх немцаў Гітлер—панаваць над усім светам павінны яны, людзі вышэйшай расы.

— Ты не баішся смерці, я бачу, — сказаў Крупня, разглядаючы парабелум.

— Памерці ў імя вялікай перамогі вялікай Германіі — вялікі гонар для кожнага салдата. А я — салдат фюрэра. Хайль Гітлер!

— Значыцца, перамога ў вас ужо ў кішэні?

— Так, безумоўна. І як гэта ў вас гаворыцца? А-а... «Дело в шляпе».

— Нават вывучыў па-руску... Але ж у Расіі яшчэ кажуць, што небяспечна пахваляцца, калі едзеш на рацы!

— Рацы? А-аа, гэта войска. Але ў вас няма войска. Яно разбіта. Таталь ферлорен! Поўны канец! А ваша радыё ўчора раўло і раўло: «Вораг будзе разбіты. Перамога будзе за намі!»

— Гэтак і будзе. Сталін гэта сказаў. Сталін ніколі не памыляецца!

— У гэта ж ніхто не верыць. Ні ён, твой камісар, ні сам ты, ні яны, вашы гэтыя бандыты. З вінтовачкамі вы надумалі перамагчы нашы браніраваныя арміі! Які дурань у гэта паверыць?

Палонны засмяяўся, засмяяўся задаволена, засмяяўся, як чалавек, які ведае, што кожнае яго слова вернае, неаспрэчнае, праўдзівае. І менавіта гэты смех, а не словы маёра, якія хутка перакладаў Тарлер, гэты смех маёра ўзбунтаваў Крупню. Крупня ўскочыў, схапіў маёра аберуч за грудзі, страсянуў з такою сілай, што два верхнія гузікі ад генеральскага фрэнча адляцелі і звaліліся ў верасы, а галава маёра заматлялася, бы трымалася на гнуткай, як гума, шыі.

— Вось так мы вас і пераможам! Вераю пераможам! Верай і праўдай! Запамятай гэта, погань ты фрыцаўская! Мы цябе зараз не расстраляем. Не-ее! — Крупня адпіхнуў ад сябе маёра, паспакайнеў, нечакана для самога сябе знайшоўшы выйсце добрае і разумнае — Пасля нашай перамогі, калі мы выкінем з нашай зямлі апошняга захопніка, мы будзем судзіць усіх вас! Як злачынцаў будзем судзіць. Ты ўсё пабачыш на свае вочы! Пабачыш! — і дадаў, закідваючы планшэтку на плечы. — Вядзіце яго, Тарлер! І нагрузіце паболей, хай цягне!.. Праз дваццаць мінут выступаем!..

Калі атрад быў пастроены на лясной палянцы, Крупня прайшоўся ля невялікай, але дужа стракатай шарэнгі. У Заполлі ў атрад улілося дванаццаць чалавек — пяць камуністаў і сем камсамольцаў — і цяпер яны, апранутыя па-рознаму, але ўсе ў гарнітуры цывільныя, дужа адрозніваліся ад асноўнага атрада, які Крупня выводзіў з горада: у ім усе былі па-вайсковаму і апрануты і падцягнутыя.

Крупня павіншаваў атрад з удала праведзенай баявой аперацыяй па разгрому армейскага штаба, абвясціў падзяку Голубу за ініцыятыву, якую ён праявіў у баі, потым коратка сказаў пра тое, што атрад ідзе зараз на новае месца дыслакацыі.

На правым фланзе пачуўся абураны голас палоннага маёра, на плечы якому ўссадзілі рэчавы мяшок з трафейнымі патронамі.

— Чым ён незадаволены? — спытаў Крупня.

— Не хоча несці патроны. Кажа, што цяжка, — растлумачыў Тарлер.

— Скажы яму, што патроны нямецкія. Ён іх на нашу зямлю прыцёг. Няхай цяпер і валачэ!

Хтось, са смяшком, падаў голас:

— Можа ён квасу хоча Давідавага...

У страі пачуўся стрыманы смех. Варакса зычна, але не вельмі строга, падаў каманду

— Спыніць размовы! Таварыш камандзір! Дазвольце рухацца?

— Так. Час...

Крупня апошнім пакінуў лясную паляну.

ПРАЎДАЙ

З-за вугла хаты выбег Голуб, абвешаны трыма трафейнымі аўтаматамі.

— Эй, другі! Як вам мая гарматка? Добра я ўлупіў!?

Гэта былі першыя словы, якія вымаўляліся на ўвесь голас, вымаўляліся жартоўна, весела. Крупня ўзняўся, нага зноў балела, але ён намагаўся ўтойваць гэта ад усіх, пахваліў Голуба за яго ініцыятыву, пахваліў голасна, каб чулі ўсе. Потым ён зірнуў на гадзіннік. Атаку на штаб яны пачыналі а палове першай. Цяпер жа колькі? Як? Няўжо меней дзесяці мінут ішоў бой? Не можа ж быць!

Ён патрос гадзіннік, прыклаў зноў да вуха. У галаве гуло і звінела ад нядаўніх выбухаў і стрэлаў, але праз гэты гуд і бомканне выразна ўлаўлівала вуха ціхае размеранае «чак-чак»... Гадзіннік ішоў... Час не спыняўся! І сапраўды: мінула толькі дзесяць мінут!..

— Таварыш камандзір! Дазвольце мне гэты бронетранспарцёр крутнуць? Ці можна, а?—папытаў Голуб узбуджана. — Я паспрабую напрамую падключыць. А як завядзецца? Тады пакоцім! І гарматка гэтая спатрэбіцца! Там набояў — поўна!

— Адставіць! Няма часу! — Крупня загадаў гэта і тут жа спахапіўся, зразумеўшы, што машына зараз сапраўды прыдалася б ім вельмі. Паратуны ёсць, забіты Шынайка, не кідаць жа яго тут... — Дзве мінуты табе, — дадаў ён. — Толькі дзве мінуты! — і спытаў ужо ў Лабуна, які падбег да іх. — Дзе начштаб? Браць зброю, боезапас. І дзве мінуты на ўсё — не больш! І адразу ж адыход!..

— Начштаб машыну сувязі курочыць з хлопцамі. Перадатчык ёсць! Удала, удала мы гэты штабік агаралі. Ды і Шынайка толькі цяжка паранены. Пашанцавала!

— Ля ганка партфелі. Там, мабыць, дакументы. Тарлер няхай возьме, паглядзіць. Дзе ён?

— Тарлер, да камандзіра!

— Няма яго.

— А з кім ён быў?

—Ён са мною быў, — азваўся Пажога. — Разам жа ў хату ўскочылі. Можа там і ляжыць...

— Шукаць! Мігам, Пажога!

Пажога ўскочыў у хату. Было чуваць, як ён там клікаў Тарлера. Потым у хаце штось моцна загрукацела, забразджэла, і вось прагучаў радасны голас Пажогі:

— За нагу яго, Давід! За нагу валачы!

На ганку з'явіліся Пажога і Тарлер, яны гналі перад сабою чалавека ў белай майцы і белых споднях.

Тарлер падбег да Крупні, пачаў дакладваць на высокай ноце, потым сарваўся, дакончыў хрыплява:

— Гэта афіцэр аддзела сувязі арміі. Я захапіў яго ў палон. Аказваецца, тут афіцэрскі штаб. Я лезу, ведаеце, пад ложак, бо звaліліся, мае акуляры, а ён там сядзіць і ўсё мяне пытае: «Вас волен зі?» Гэта, маўляў,

Зброю пагрузіць, рыштунак увесь штабны... Выскачыць на брукаванку і на селавую дарогу! Рашэнне было і рызыкоўнае, і дужа заманлівае, але Крупня прыняў яго.

Пазней, калі атрад павярнуў з брукаванкі на селавую дарогу, ён яшчэ пастаяў на ўзбочыне, услухоўваючыся. Аддаляючыся, вуркатала захопленая машына, брукаванка была пустая, аніводнага гуку на ёй, аніводнага знаку, што хтось рухаецца, толькі залаціста свяціліся вершаліны бярозавых прысад, асветленыя водбліскам полымя, што шугала ля хаты дарожнага майстра.

Зусім нядаўна, па вясне, Крупня спыніўся ў хаце дарожнага майстра, і той частаваў яго бярозавікам, а Валяўка ўсё падхваліваў той бярозавік... Як нядаўна, і як даўно быў той час!

Наперадзе голасна гаманілі партызаны, і Крупня, ідучы следам за імі, не перапыняў нікога, слухаў. Ён быў задаволены, што людзі весела гамоняць, радуюцца. Няхай! Атрад цяпер недасягальны. Толькі ўранку, пры святле дня, немцы змогуць адшукаць нейкія сляды. А перад Заполлем машыну можна будзе прыхаваць у лесе, ці затапіць у багну, а ўвесь багаты вайсковы рыштунак трафейны — на коней. І ніякі чорт ім, партызанам, не страшны! Лес — родная хата.

А што гэта яны чэпяцца да Тарлера?

— Слухай, Давід, чаго ты палез пад той ложак? — спытаў хтось даверліва і прастадушна: Крупня не пазнаў, каму належыць гэты голас.

— А хіба я не казаў? Акуляры звaліліся, — палез шукаць.

— А што гэты фрыц у цябе пытаў?

— «Вас волен зі?» Што вам трэба, значыцца. Ён з перапуду гэта толькі і бубніў!

— Значыцца, брэша Пажога. А ён ведаеш, што кажа? Нібыта ты пад ложкам поўзаеш, а фрыц табе шапоча: квас, маўляў, ёсць квас. Але адкуль пад ложкам квас?

Грымнуў рогат, раскацісты, вясёлы.

— Вы сёння рагочаце? Так. А заўтра мы паглядзім, хто будзе ў выгадзе. Палоннага хто захапіў? Тарлер! Узнагарода каму? Тарлеру! І, калі хочаце, будзе заўтра самалёт, бо гэты маёр — птушка не абы-якая! І калі Тарлеру дадуць вялікую ўзнагароду, мы паглядзім, каму будзе дужа весела!

Крупня рагатаў разам з усімі, рагатаў шчыра, рагатаў уголас, не тоячыся, змываючы гэтым рогатам з душы горыч, трывогу, скасоўваючы турботу

добра ведае паддзвінне. Група павінна прайсці лінію фронту і вярнуцца назад. Павінна выканаць заданне і вярнуцца. Абавязкова вярнуцца, бо атрад па-ранейшаму без сувязі: нямецкая рацыя аказалася пашкоджаная ў час бою.

Крупня, схіліўшыся цяпер над нямецкай кіламетроўкаю, што ляжала ў яго на каленях, разглядаў карту з дзіўным пачуццём захаплення і брыдкасці. Брыдкасць з таго, што на паперы былі рудыя пісягі крыві — хтось з параненых немцаў кінуўся да стала, дзе ляжала зброя і гэтая карта, і пакінуў на ёй след смерці. Здзіўляла дакладнасць карты: кожная вёсачка, кожная рачулка, кожны масток і нізінка пазначаны з абсалютнай дакладнасцю. Яго, Крупні, карта была не менш дакладная, але не такая падрабязная і чоткая. Знаёмыя назвы чыталіся па-нямецку неяк дзіўна, спараджалі развагу. Рыхтаваліся, аднак, немцы да вайны грунтоўна і ўсур'ёз. Лісты кіламетровак усёй мясцовасці — ажно да самай Масквы — знайшоў Крупня сярод захопленых дакументаў.

У бярэзніку ўсчалася валтузня, пачулася знаёмае галёканне палоннага маёра, які ўпарта спрачаўся з Тарлерам.

— Што ж «генерал» хоча? — спытаў Крупня ў Лабуна, які падышоў і сеў побач на тоўстую, зімой, відаць, спілаваную, вольхіну.

— Патрабуе зубную шчотку. Не пачысціўшы зубы, маўляў, не можа есці, а не паеўшы, не можа ісці...

— Культурны, аднак. Я вось і думаю, што куля — занадта слабое для яго пакаранне...

— А, можа, ён не ўсё сказаў нам?

— Не-ее, выклаў усё, як на споведзі. Жах яго цяпер распірае. Вось ён і куражыцца. Заві яго, паслухаем!..

Крупня ўпершыню з гэткай уважнасцю і ніколькі не спяшаючыся разглядаў палоннага маёра, які стаяў цяпер перад ім і на якім генеральскі мундзір сядзеў добра, хіба што рукавы былі трошкі караткаватыя. Маёр

Аляксей ПЫСІН

●

...А хтосьці з той стралковай роты
Падняўся першы. І загінуў.
І стаў пяском, травою, глінай.
Ты быў другі. А можа соты.

А можа тысячны, мільённы.
Галоўнае — ты быў не воддаль.
Заслужаны ты маеш ордэн.
Мы ворага перамалолі.

Цяпер ссівелы, пастарэлы,
Усё часцей, часцей міжволі
Сябе ўяўляеш на тым полі:
Ты самы мужны, самы смелы.

І ўжо не соты, не мільённы,
А першы, першы ў той атацы.
Паверце... Дакараць не станьце...
Галоўнае — перамалолі.

●

Вецер па-свойску сустрэчны,
І жураўлі над ракой —
З боку таго, дзе сардэчны
Друг, аднагодак мой.

Бачу скроні сівыя,
Усё ж ён ранейшы ва ўсім:
— Дзеці ў мяне малыя.
Трэба мне быць маладым.

Быццам не белены лёсам,
Быццам не зведаў страт,
Брат гэтым белым бярозам,
Добраму, юнаму брат.

Рана ў дні веснавыя
У поле — з сонцам самім:
— Дзеці ў мяне малыя,
Трэба мне быць маладым.

Дыхае свежай зямлёю,
Чуў ён, што зычылі ёй
Белыя сцюжы зімою,
Белыя птушкі вясной.

Турыць хваробы злыя,
Лечыцца ўздыхам адным:
— Дзеці ў мяне малыя,
Трэба мне быць маладым.

●

— Па-лабавому зноў, дзівіцеся!—
Што адкажу на гэта я?
Была мне школаю мая
Гвардзейская дывізія.

Паспелі —
Шлях быў не малы —
І падрасці і вырасці.
І мы не ведалі няшчырасці,
Халуйства, зайздрасці, маны.

Даўно час выставіў адзнаку
Сумленню мёртвых і жывых.
Я помню, помню радавых,
Што ў поўны рост ішлі ў атаку.

І, можа, болей, чым хто іншы,
Я лёсам абавязан ім,
І болем вернасці
І тым,
Што не нясу благому
Чыншу.

О, слова, слова лабавое,
Нястрымнае, яно ляціць,
Пасля душа мая баліць:
Сказаў не так,
Сказаў не тое...

●

І мне памяняць бы кватэру,
Туды б,
дзе цішэй і ніжэй,
Бо грукату зведаў праз меру,
Няўтульных і дзён і начэй.

Заўсёды гатовы ў дарогу
І ногі і спіны сталоў.
І буду выносіць патроху
Сто важкіх шаноўных тамоў.

І нават фарфоравы коцік,
Якога цярпець не магу,
Свой банцік ружовы падхопіць
І стане за кімсьці ў чаргу.

Агледжу вузлы, чамаданы...
Чакайце, грузавікі, —
А песні, што тут праспяваны
На «горкім» вяселлі дачкі?

А цені сяброў, што ніколі
Не ступяць на іншы парог?
У гэтым абжытым пакоі
Я ўсё дарагое бярог.

Не сплю і сузор'і чытаю.
А можа па іх варажу?
А можа кагосьці чакаю?
Ніякіх выгод не прашу.

КАХАНЫ РОЎ

Ёсць гарадок паміж бароў,
А ў ім нябачны з берагоў
І кручаў Сожа, быццам схоў, —
Каханы Роў.

З былых часоў, з былых вякоў
Таіў і шанаваў любоў,
На шлюбны ложак юных вёў
Каханы Роў.

Святло чаромхавых кастроў
Сышло з падземных вапнякоў.
І вабіць зноў і кліча зноў
Каханы Роў.

Спытайце нават салаўёў,
Спытайце нават матылёў,
Што трэба ім? Адказ без слоў:
— Каханы Роў.

Не прыглядайся да зямлі,
Да тых слядоў, што тут ляглі, —
Пакуты й смерць таксама йшлі
У Каханы Роў.

Святло чаромхавых кастроў
Сышло з падземных вапнякоў.
І вабіць зноў і кліча зноў
Каханы Роў.

СУРОВАЯ ПАМЯЦЬ

НАПІСАНЫЯ па яшчэ гарачых слядах пажараў, вынашаныя і адшліфаваныя самім жыццём, першыя вершы М. Смагаровіча адразу ж прыцягнулі ўвагу яснасцю думкі, стрыманасцю пачуцця, у нейкай ступені суровай паэтычнасцю. Лірычны герой—таварыш паэта па партызанскім атрадзе, брат, якому «лёс у грозны час... узваліў на плечы шар зямны», даверліва дзяліўся сваімі думкамі, перажываннямі.

Зборнікі вершаў «Мой таварыш», «Каля кастра», «Крокі» і іншыя былі прыхільна сустрэты чытачом. І вось новае спатканне—ладны томік, змест якога склалі вершы, што пісаліся ў апошнія гады.

У большасці іх — суровая памяць вайны. Лёс лірычнага героя і лёс аўтара непарыўна звязаны паміж сабой:

Тады
Нылі крывавыя раны.
Губы шапталі:—Вады,
Чуліся мыліцаў стукі,
Гучна, нібы гром званоў.
Голас бубухкаў:—Бязрукі
З ложка зваліўся ізноў.

Гэта суровая праўда, і М. Смагаровіч не баіцца сказаць яе адкрыта. Чалавек мужны ў жыцці, ён гэткім жа застаецца і ў сваіх творах.

Дзень сённяшні і ўчарашні, пражытае і перажытае, трывогі кожнага часу—усё гэта знаходзіць адлюстраванне і ў вершах паэта. Востра публіцыстычныя радкі, якія адрасуе ён амерыканскаму салдату («Пісьмо Джону»):

За табой клубы ўзвіліся дыму:
Выйшаў ты з в'етнамскай вёскі, Джон,
І брыдзеш, закураны, нябрыты,
І сама зямля цябе кляне...
Азірніся, чуеш, Джон! Куды ты?
За цябе балюча стала мне...

Тэма вайны і міру—галоўная ў творчасці М. Смагаровіча. Раскрываецца яна звычайна праз успаміны, праз перажытае, убачанае, вынесенае на сваіх плячах («Размова з доктарам», «І ўстаў салдат...», «Мае сны»).

Піша паэт і пра сённяшняе жыццё. Уменне завастрыць увагу на звычайнай з'яве, сказаць пра яе хораша, светла—гэта не можа не выклікаць адпаведны рэзананс у чытача:

Панесла рэчка прэч ад нас
Зіму, парваўшы на кавалкі.
І вось на лузе фарбы ўраз
Успыхнулі, нібы запалкі.
Пот з твару трактарыст абцёр,
Акінуў позіркам абшары
І загадаў: — Спявай, матор,
Аб тым, што ўжо вясна ў разгары!..

Змешчаны ў зборніку і тры невялікія паэмы. Найбольшую цікавасць выклікае — «Крутыя перавалы». Твор гэты ў многім аўтабіяграфічны. Асабліва ўдаліся паэту наступныя радкі:

Крочылі ў гэтыя хвілі
Міма на працу дзядзькі,
Мне на крысо апусцілі
Жоўтыя тры медзякі.
Лязгнуў, нібы аплявуха,
Звон нечаканы манет.

Яны б'юць у самае сэрца і вельмі ўражваюць сілай свайго ўздзеяння. Але не такі характар у былога франтавіка, каб скарыцца лёсу. Ён верыць у жыццё і па-ранейшаму застаецца ў страі.

Ёсць у кніжцы і тое, што мяне, яе чытача, не можа задаволіць. Гэта сэнсавыя недакладнасці, якія сустракаюцца месцамі, аднастайнасць рытмічнага малюнка некаторых вершаў. Верш «Кісет» перакліканецца з «Пасылкай» П. Глебкі. Далёка не новыя думкі ў вершах «Ручаёк», «Золата», «Камета».

У адным з вершаў аўтар прызнаецца сабе:

Пішу, а здаецца мне—мала,
Сябе суцяшаю ў жыцці.
Што можа ўвесь час запявала
Не ў першай шарэнзе ісці.

Паэтычная муза М. Смагаровіча сапраўды сціплая. Але яго вершы пакідаюць у душы глыбокі след сваёй непасрэднасцю.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
студэнт БДУ імя У. І. Леніна.

М. Смагаровіч. «Разводдзе». Лірыка. Мінск. «Мастацкая літаратура». 1973.

М. ЛЫНЬКОЎ І РАБСЕЛЬКОРЫ

ІШОЎ тысяча дзевяцьсот дваццаць пяты год. Краіна распачала новае жыццё. Вялікія змены адбыліся і ў маёй роднай вёсцы Забалоцце, якая прытулілася сярод балот і лясоў. Мы, тады яшчэ маладыя хлопцы, вырашылі аб зменах гэтых расказаць у Бабруйскай акруговай газеце «Камуніст». Вельмі хваляваліся, калі паслалі свой першы допіс. Здавалася, што напісалі не так, як трэба, і, вядома, нас не надрукуюць. Але, калі праз колькі дзён разгарнулі свежы нумар, прыемна здзівіліся: пад невялічкай нататачкай стаялі нашы прозвішчы. Пісалі мы тады калектыўна — я і мае сябры.

З таго дня і да самага адыходу ў Чырвоную Армію ў 1929 годзе я рэгулярна пісаў у акруговую газету. Амаль усе мае допісы былі змешчаны на старонках «Камуніста». Вялікую дапамогу нам, маладым, нявопытным селькорам, аказваў Міхась Ціханавіч Лынькоў. Ён быў некаторы час адказным сакратаром «Камуніста», а ў хуткім часе стаў рэдактарам.

Просты і сціплы па натуры — М. Лынькоў быў нашым першым літаратурным настаўнікам. Ён вельмі ўважліва ставіўся да селькораўскіх допісаў і па магчымасці сам адказваў нам. Я асабіста атрымаў звыш дваццаці пісьмаў. У іх давалася ацэнка карэспандэнцыям, рабіўся крытычны разгляд некаторых допісаў.

Рэдакцыя «Камуніста» знаходзілася тады ў невялічкім цагляным будынку на адной з цэнтральных вуліц Бабруйска. Бываючы ў горадзе, мы ахвотна заходзілі сюды, бо ведалі, што супрацоўнікі заўсёды сустрэнуць, як жаданых гасцей. Часта даводзілася гутарыць і з самім Міхасём Ціханавічам. У рэдакцыі была добрая завядзёнка: амаль кожнаму селькору ўручалася невялічкая бібліятэчка кніжак. За камплектаваннем яе сачыў сам М. Лынькоў.

Аднойчы Міхась Ціханавіч наведаўся ў раённы цэнтр Глуск, каб правесці сход селькораў і актыўных чытачоў газеты. Помню, сабраліся мы ў будынку райкома партыі. М. Лынькоў расказаў нам аб унутраным і міжнародным становішчы, пазнаёміў з асноўнымі задачамі рабселькораўскага руху. У заключэнне ён сказаў: «Селькор заўсёды павінен быць пунктуальна праўдзівым. Пішыце толькі аб тым, што самі добра ведаеце. Усе факты дэталёва правярайце, змагайцеся за дзейснасць сваіх выступленняў у газеце».

Газета, якую рэдагаваў М. Лынькоў, карысталася вялікай папулярнасцю сярод чытачоў. Яна была багатай і цікавай па зместу, часта на яе старонках змяшчаліся селькораўскія допісы. Перыядычна выходзіў і літаратурны дадатак «Вясна», які адкрыў дарогу ў вялікую літаратуру многім сёння вядомым беларускім пісьменнікам.

Міхась Ціханавіч дапамог выйсці на дарогу жыцця і нам, вясковым юнакам, якія былі на пачатку селькорамі «Камуніста». Я — загадваў хатай-чытальняй, потым працаваў сакратаром сельсавета, служыў у арміі. І ў тым, што потым стаў рэдактарам дывізіённай, а затым і раённай газет, бачу, адчуваю вялікую заслугу і Міхася Ціханавіча Лынькова.

А. ГАНЧАРОЎ,
пенсіянер.

ЛІТАРАТУРА І ДЗЕЦІ

З ПАШЫРАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ПРАЎЛЕННЯ СП БССР

Плённая, творчая размова адбылася на пашыраным пасяджэнні прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР сумесна з секцыяй дзіцячай літаратуры. Пісьменнікі, настаўнікі, бібліятэкары, работнікі выдавецтваў рэспублікі абмяркоўвалі важнейшыя праблемы развіцця літаратуры для дзяцей і юнацтва.

З дакладам «Выхаванне грамадзяніна» выступіла кандыдат філалагічных навук Э. Гурэвіч.

— Мастацкая літаратура, і ў прыватнасці дзіцячая, заклікана выхоўваць актыўнага будаўніка камуністычнага грамадства, — сказала яна. — Лепшыя кнігі для дзяцей сталі мудрымі настаўнікамі юных гледачоў і выхоўваюць высокія маральныя якасці чалавека—любоў да Радзімы, павагу да працы, пачуцці інтэрнацыянальнай дружбы паміж народамі, мужнасць, высакародства, сумленнасць, шчырасць.

Далей дакладчык спыняецца на праблеме станоўчага героя, аналізуе аповесці «Пачакай, затрымайся» А. Васілевіч, «Першы генерал» І. Шамякіна, «Мы з Санькам у тыле ворага» І. Сяркова, «Кастусь Каліноўскі» А. Якімовіча і рад іншых твораў. Гэтыя кнігі вызначаюцца праўдзівым адлюстраваннем жыцця, вастрынёй канфлікту, запамінальнымі вобразамі герояў.

Але названыя аповесці—пра мінулае. Задача ж у тым, каб пісьменнікі больш рашуча асвойвалі тэмы сучаснасці, паказвалі працоўны подзвіг савецкага народа. Такія творы ў нас ёсць, хаця іх яшчэ і не багата.

Не абмежаваныя магчымасці мастацкай публіцыстыкі для дзяцей. Выйшаў у свет зборнік нарысаў «Рубяжы і крылы», які расказвае пра новабудоўлі дзевятай пяцігодкі.

Добры нарыс напісаў А. Чаркасаў—«Мой магутны зямляк», які апавядае пра трактарны завод.

І дзіцячая паэзія ўносіць дастойны ўклад у справу выхавання падрастаючага пакалення. Вершы Э. Агняцвет, А. Вольскага, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, М. Калачынскага, А. Пысіна, С. Шушкевіча і іншых паэтаў лепшае таму сведчанне. Разам з тым, наша паэзія, асабліва для дзяцей сярэдняга і старэйшага ўзросту, не пазбаўлена яшчэ дэкларацыйнасці, дыдактыкі і рыторыкі.

Асобай увагі заслугоўвае літаратура для маленькіх. Паспяхова працуюць на гэтай ніве пісьменнікі В. Вітка, Ул. Дубоўка, С. Шушкевіч. Кніга «Чытанка-маляванка» Васіля Віткі—цудоўны падарунак дзецям. Добрыя апавяданні для маленькіх пішуць В. Гарбук, В. Хомчанка, Ул. Юрэвіч.

Дакладчык звяртае ўвагу і на тое, што слаба развіваюцца ў апошні час у беларускай літаратуры для дзяцей і юнацтва буйныя формы паэзіі—паэма, у прозе адсутнічае раман. Гаворка тут ідзе не пра вузка жанравую праблему, а пра неабходнасць пашырыць жыццёвую сферу ў творах для юнацтва.

—Рашэнні XXIV з'езда КПСС, — сказала ў заключэнне Э. Гурэвіч, — звяртаюць увагу пісьменнікаў на неабходнасць узмацніць выхаваўчае ўздзеянне літаратуры для дзяцей, павысіць яе ідэйна-мастацкі ўзровень. Гэта—баявая задача ўсіх беларускіх літаратараў, чые творы адрасуюцца юнаму гледачу.

У спрэчках па дакладу выступіла 10 чалавек. Алесь Якімовіч падзяліўся ўражаннямі аб міжнароднай сустрэчы ў Маскве «Пісьменнікі свету і выхаванне падрастаючага пакалення».

— Тым, хто займаецца педагагічнай навукай у рэспубліцы, хто выкладае літаратуру ў школе, — гаварыў Ул. Юрэвіч, — трэба сур'ёзна ўзважыць нашы падручнікі і праграмы. Менш за ўсё тут павінна быць маралізатарства і голай дыдактыкі.

Прамоўца ўзнімае пытанне і аб тым, каб творы дзіцячых пісьменнікаў выхоўвалі ў юнага пакалення павагу да працы. Тут яшчэ многа трэба зрабіць нашай літаратуры.

— Паездкі па рэспубліцы, сустрэчы ў школах пераконваюць у тым, што ў многіх бібліятэках, асабліва пачатковых школ, нашых кніг, на жаль, няма, так пачаў сваё выступленне Алесь Пальчэўскі. — Гэта тлумачыцца тым, што і тыражы выданняў дзіцячай літаратуры яшчэ невялікія, хаця яны з году ў год растуць.

Аб вялікай адказнасці пісьменніка перад чытачом гаварыла Алена Васілевіч.

Метадыст Міністэрства асветы БССР К. Краўцова заклікала пісьменнікаў больш актыўна ўдзельнічаць у стварэнні праграм і падручнікаў для школ рэспублікі. Вопыт супрацоўніцтва А. Клышкі і Р. Шкрабы дастойны шырокага пераймання. Прамоўца лічыць неабходным стварыць мастацкія біяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Гэтыя кнігі ажывілі б выкладанне роднай літаратуры ў школе.

Крытыка М. Яфімаву хвалюе мастацкі ўзровень літаратуры для маленькіх, аспіранта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта Р. Літвінава — грамадзянскасць у паэзіі для дзяцей і пытанні мастацкага перакладу. Пра гэта яны гаварылі ў сваіх выступленнях.

Рад важных пытанняў узняла ў прамове Эдзі Агняцвет. На думку паэтэсы, каб лепш наладзіць прапаганду дзіцячай літаратуры, займацца ёю кваліфікавана, з веданнем справы, у сталіцы рэспублікі неабходна адкрыць спецыялізаваную кнігарню.

— Усё жыццё пісьменніка, —зазначае яна, — гэта творчасць. Трэба, каб і літаратараў, што пішуць кнігі для дзяцей, не забывалі ў саюзе, пасылалі іх у камандзіроўкі на будоўлі пяцігодкі, у братнія рэспублікі.

— Рэспубліканскі друк, на жаль, не аддае яшчэ належнай увагі дзіцячай літаратуры, — гаварыў у сваім выступленні паэт Іосіф Васілеўскі. Вынікі абмеркавання падвёў Іван Шамякін.

СЯРОД КНІГ

У ТВОРЧАЙ ХАДЗЕ

ВЫДАННЕ выбраных твораў для кожнага пісьменніка заўсёды, жадае ён таго ці не жадае, з'яўляецца падвядзеннем вынікаў пэўнага этапу творчасці, аглядам ўсяго, што створана ім. Безумоўна, ведаючы гэта, аўтар адбірае лепшае. Але разам з тым трэба ўлічваць жаданне яго паказаць «крывую» свайго творчага росту, даць паўнейшую жанравую і тэматычную карціну. Таму выбранае шмат гаворыць аб пісьменніку, аб яго эстэтычнай пазіцыі.

Кніга Міколы Ваданосава «Дзе віруе Бяроза» — гэта творы, якія пісаліся ў 60—70-я гады, у гады творчай сталасці аўтара. Усе яны разлічаны на дарослага чытача. Гэта варта падкрэсліць, бо Ваданосаў многа і плённа працуе для дзяцей. Але і ў кнізе для дарослых пісьменнік ўсё ж арыентуецца на моладзь і адпаведна гэтаму шукае тэмы, герояў, маляўнічыя сродкі, будуе сюжэт.

М. Ваданосаў умее зацікавіць чытача, удала спалучаючы ў сваіх творах спецыфіна беларускую тэматыку, нацыянальныя характары, каларыт з прыкметамі сучаснага стылю, які, праўда, хутчэй праяўляецца ў сюжэце, чым у мове. Аднак і ў яго кожная фраза нясе новую інфармацыю, не спатыкаючыся на апісаннях, і гэта робіць стыль напружаным, мабільным. Сюжэт заўсёды імклівы, характары раскрываюцца ў дзеянні.

У такой манеры напісана аповесць «Пад чужым паролем» (1971 г.) Яна — аб партызанскай барацьбе на Беларусі. Па сваіх калізіях гэты твор у многім прыгодніцкі. Сапраўды, ён інтрыгуе з самага пачатку, з першага раздзела, у якім прыгожая, вясёлая дзяўчына Зося, што з'явілася ў партызанскім злучэнні, аказваецца шпіёнкай. А пад яе паролем у далейшым дзейнічае партызанка Зіна. З гэтай сітуацыі завязваецца сюжэт. Праўда, такі прыём не новы ў прыгодніцкай літаратуры, але ў даным выпадку ён «іграе». Пісьменнік паставіў задачу паказаць гераізм самых звычайных, нават не без недахопаў, юнакоў і дзяўчат. Выкрыванне вельмі небяспечнага дыверсанта Шпака эфектна праводзіцца капітанам Крайко з удзелам Зіны і закаханага ў яе радыста Кастуся.

Праўда, Шпаку даволі хутка ўдаецца ўцячы, але ён вымушаны вярнуцца, каб давесці заданне да канца — канчаткова знішчыць партызанскую радыёстанцыю і радыстаў. Гэтая акцыя значна аблегчыла б блакаду немцамі партызан. У лесе Шпак зноў сустракаецца з Кастусём, які павінен перадаць радыёграму ў Маскву. З вельмі небяспечнага становішча Кастуся выратоўвае яго сябра Алесь. Ён забівае Шпака, а Крайко тым часам выкрывае яшчэ адну групу дыверсантаў. Такім чынам, варожыя агенты знішчаны, радыёграма перададзена, Масква прышле медыкаменты і харч...

Сюжэт аповесці разгортваецца дынамічна. Твор пабудаваны па законах прыгодніцкага жанру. Аднак гэта не замінае, а наадварот, дапамагае пісьменніку паказаць праўдзівую карціну штодзённага жыцця вялікага партызанскага злучэння, цяжкасці змагання з дыверсантамі ва ўмовах блакады. І нават у неверагодныя сітуацыі верыш: так было ці магло быць у той час. Аўтар у вайну сам быў радыстам, і гэта значна памагло яму ў вырашэнні творчай задачы.

Цікавыя, хоць і не поўнасцю раскрытыя, характары медыцынскай сястры Зіны, радыстаў Кастуся і Алеся. Яны здолелі захаваць у цяжкіх умовах нешта юнацкае, непасрэднае. Звяртае на сябе ўвагу і вобраз капітана Крайко, вопытнага разведчыка, спакойнага, мужнага, пільнага, які ўвасабляе, калі можна так сказаць, рацыяналістычны пачатак побач з эмацыянальнымі, няўрымслівымі юнакамі. Увогуле, многія характары будуюцца па аналогіях і супроцьпастаўленнях: Алесь і Кастусь, Зося і Зіна, Крайко і Кавальчук, Крайко і Шпак і інш.

М. Ваданосаў добра ведае асаблівасці жанру, у яго ёсць тое, што называюць «чуццём кампазіцыі», у разгортванні сюжэта ён амаль не губляе належнага густу і пачуцця меры.

Аповесць «Адзінай маці сыны», якой адкрываецца зборнік, была напісана ў 1969 годзе. Твор гэты таксама аб вайне, аб падпольшчыках, але ў ім не некалькі, а адзін галоўны герой, дакладней, гераіня — Кацярына Квяткоўская, простая, немаладая ўжо беларуская жанчына з цяжкім лёсам. Адзін сын яе памёр ад тыфуса, другога забіла ў першыя дні вайны, муж Стэфан — пад арыштам па фальшываму абвінавачванню яго былога сябра Андрэя Змачынскага, у далейшым паліцая, фашысцкага паслугача.

У першыя дні акупацыі Кацярына ў адчаі, у разгубленасці... Жыццё страціла для яе ўсякі сэнс, але яна бачыць, што гора прыйшло не толькі ў яе дом. І яна пачынае змагацца, спачатку па-свойму, па-жаночы: выратоўвае з нямецкага лагера шаснаццаць палонных савецкіх салдат, якіх называе сваімі сынамі... Аб яе подзвігу аўтар гаворыць проста, стрымана, сурова. Ён імкнецца стварыць тыповы вобраз савецкай жанчыны-маці. Адпаведна такой высокай задуме пісьменнік уздымае гэты вобраз да сімвалічна-алегарычнага абагульнення. У канцы аповесці ён прама падкрэслівае гэта: «І пакацілася чутка па зямлі беларускай, што сівая маці водзіць начамі ў бой сваіх адважных і смелых сыноў. І не было фашыстам ратунку там, дзе з'яўлялася з імі старая. Сталі ворагі баяцца той адважнай сівой жанчыны, бо ведалі, што ні куля яе не бярэ, ні граната, што яна, як здань, можа прайсці праз полымя пажару і стальную браню машын».

Акрамя ўзвышанай канцоўкі, агульны тон твора знешне спакойны, стрыманы, ён добра перадае цяжкія ўмовы змагання патрыётаў у час фашысцкай акупацыі. Характары М. Ваданосаў малюе буйнымі мазкамі, прывязваючы іх да калізій і кампазіцыі. Героі яго ваенных аповесцей і апавяданняў у большасці выпадкаў выпісаны праўдзіва і даволі пераканаўча.

Гэтага не скажаш пра многіх персанажаў самай вялікай аповесці «Надзеі і здзяйсненні», твора на сучасную тэму. Вельмі прыгожая і адукаваная дзяўчына Лена, што прыехала пасля заканчэння вучобы працаваць у родную вёску, апынулася... ў атмасферы чэрствасці, бяздушша і зайздрасці з боку яе аднавяскоўцаў, якія, дарэчы, выхавалі яе, сірату. Ненатуральна... Гэта адразу насцярожвае. Увесь час у думках Лена кагосьці папракае, на некага злуецца, і, здаецца, незадаволена ўсім на свеце, нікога не любіць, акрамя сябе. Здзіўляе, што побач з зацікаўленасцю да сваёй работы, шчырым імкненнем падняць культурны ўзровень калгаснікаў — нейкая неапраўданая нічым злосць на людзей.

Тэарэтычна Лена вельмі добрая, на справе ж не зусім так. Увесь час у тэксце сустракаеш: «...у злосці і крыўдзе падумала Лена», «...незадаволена падумала Лена», «Лена перамагла пачуццё непрыязні да гэтага чалавека» і г. д. Ці можа сапраўды добрая дзяўчына, якой яна ўяўляецца аўтару, амаль увесь час на некага злавацца, нават калі і ёсць за што?

Праўда, к канцу аповесці Лене ўжо хочацца знаходзіць у людзях толькі добрае. Але чытачу застаецца не зразумелым, чаму ў ёй адбываецца такая перамена, бо амаль увесь час яна адчувае сябе няшчаснай.

Нельга сцвярджаць, што такі характар увогуле не сустракаецца. Аднак, па-першае, калі ўжо паказваць яго эвалюцыю, дык пераканаўча, а па-другое, нельга не здзівіцца непамернаму захапленню аўтара сваёй гераіняй, бо аб'ектыўна, у адносінах з многімі людзьмі асабліва з Волькай, Алесем, Васілём, Пятром, яна паказана не з лепшага боку. Па сутнасці, Лена нікога не кахае, нікога не любіць, адно ёй хочацца мець абаронцу, памочніка, прасцей, кажучы, «рыцара». Ва ўчынках і думках Лены, ды і некаторых іншых персанажаў, многа супярэчнасцей.

Некалькі меладраматычныя і сентыментальныя, любоўныя гісторыі адбываюцца ў аповесці на фоне сатырычных карцін з жыцця вёскі. Плёткі і крывадушша жанчын, п'янства Віктара і Алеся, на якое ніхто да часу не звяртае ўвагі, гісторыя з хцівым дырэктарам школы Круцько і інспектарам з раёна Дзеравягам, паездкі калгасніц у рабочы гарачы час на кірмаш — усё гэта павінна садзейнічаць яшчэ большаму ўзвышэнню станоўчых герояў — Лены, Васіля, Пятра, паказваць, у якіх цяжкіх умовах прыходзіцца працаваць на вёсцы маладым спецыялістам. І хоць такая пазіцыя аўтара не можа не выклікаць здзіўлення, самі па сабе гэтыя малюнкі і сітуацыі зроблены нядрэнна і сведчаць аб несумненным сатырычным майстэрстве пісьменніка.

Дзеянне большасці апавяданняў, сабраных у зборніку, вядзецца ў двух планах. Мірнае жыццё і вайна, як змяняе яна лёс людзей — вось тэмы апавяданняў М. Ваданосава. У адным з іх «Да заўтрага...» з хваляваннем апісваецца сустрэча сталага чалавека са сваёй першай каханай, з якой так многа прыйшлося перажыць у гады вайны. У апавяданні «Залаты пярсцёнак» адзін з герояў канчае самагубствам. І толькі адзін чалавек у вёсцы, Сцяпан, ведае, што той быў здраднікам і забойцам яго, Сцяпанавай жонкі. Такі чалавек не павінен жыць сярод сумленных людзей. Праўда, яшчэ можна спрачацца аб пазіцыі Сцяпана, які не выдае злодзея людзям, а дае яму магчымасць самому вырашыць свой лёс.

Апавяданні «Галасы на вадзе», «Ля старарэчышча», «Журавы»—аб нашым часе, але і ў іх жыве ўспамін — успамін аб юнацтве, аб каханні. Таму апавяданні гэтыя набываюць характар лірычнай споведзі, у іх чуецца прызнанне ў любові да роднага краю, родных мясцін. Манера пісьменніка тут больш спакойная, інтанацыя больш удумлівая. І ўсё ж, варта адзначыць, што лірыка не заўсёды дапамагае аўтару стварыць паўнакроўныя вобразы, яму больш удаецца аб'ектыўнае апавяданне аб падзеях і героях.

Нягледзячы на некаторыя, часам і значныя недахопы, выбранае М. Ваданосава сведчыць, што пісьменнік — у творчых пошуках, а калі гэта так, ад яго можна чакаць новыя цікавыя творы.

Т. ШАМЯКІНА.

М. Ваданосаў. «Дзе віруе Бяроза». Аповесці і апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973 г.

МІНСКІМ ГЕРОЯМ — ПАДПОЛЬШЧЫКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

БОЛЬШ за два гады аб'яднанне тэлевізійных фільмаў студыі «Беларусьфільм» працавала над эпапеяй, прысвечанай героям Мінскага падполля ў Вялікую Айчынную вайну. Узнаўляючы велічныя і трагічныя старонкі гісторыі, творчая група (сцэнарысты І. Новікаў, І. Чыгрынаў, рэжысёр-пастаноўшчык В. Чацверыкоў, аператар Б. Аліфер, мастак Ул. Белавусаў, кампазітар А. Мураўлёў, гукааператар Ул. Мушперт, рэдактар В. Булавіна), можна сказаць, прайшла выпрабаванне на мастацкую сталасць. Завершаная работа — шасцісерыйны фільм «Руіны страляюць...» пацвярджае, што сур'ёзны творчы экзамен вытрыманы

З першымі чатырма серыямі фільма тэлегледачы пазнаёміліся яшчэ ў верасні 1971 года. Тады ж мне і давялося пісаць пра яго на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» («Руіны змагаюцца...» у нумары за 24 верасня 1971 года). І тады, і зараз я лічу гэты кінатвор значным, вартым таго, каб яго паглядзеў кожны, і адчуў гарачы подых тых суровых дзён, калі ішла жорсткая барацьба супраць фашысцкай навалы, калі савецкія людзі праходзілі праз цяжкія выпрабаванні. Ідэйна-мастацкую значнасць першых чатырох серый абумовілі арганічнае спалучэнне праўды гісторыі і публіцыстычнага пафасу, глыбокае асэнсаванне фактаў і дакументаў.

У заключных — пятай і шостай серыях, якія будуць паказаны па тэлебачанні ў бліжэйшы час, стваральнікі тэлевізійнай карціны не парушылі абраны прынцып. Яны ішлі ад жыцця, ад канкрэтных фактаў і падзей.

У апошніх серыях узнаўляюцца падзеі вельмі цяжкага перыяду — барацьбы мінскіх падпольшчыкаў супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Першыя кадры 5-й серыі — змрочныя: няўстойлівае асвятленне, трывожная музыка, нервова-напружаны мантаж — усё падкрэслівае, што над патрыётамі навісла смяротная небяспека. «За некалькі дзён сакавіка 1942 года, — чуецца голас з-за кадра, — падполле страціла звыш трохсот найбольш актыўных барацьбітоў. Загінуў душа і кіраўнік мінскага падполля Ісай Казінец»...

Прыгадаем, што менавіта сцэнай пакарання Казінца і кадрамі насцярожаных руін, у якіх прытаіўся актыўны яго памочнік Жан, заканчвалася 4-я серыя фільма.

Тая ж трывога і напружанасць — асноўная інтанацыя 5-й серыі. Акупанты праводзяць «акцыю» па ліквідацыі сіл супраціўлення: па ўсяму гораду ідуць арышты і расстрэлы. І ўсё ж генеральны камісар акупантаў Вільгельм Кубэ не задаволены, бо разумее, што падполле мае глыбокія карэнні і яны дадуць новыя парасткі.

Обер-кат не памыліўся — патрыятычная барацьба не заціхла з пакараннем тых, хто трапіў у рукі карнікаў. У другой палавіне 5-й і ў 6-й серыях аўтары паказваюць, як у барацьбу ўключаліся ўсё новыя героі, як яны ішлі на змену патрыётам, якія загінулі на шыбеніцах ці ў гестапаўскіх камерах смерці. Адны з такіх герояў дзейнічаюць у многіх эпізодах, другія — у 2—3-х, але амаль кожны нечым запамінаецца, бо мае сваё месца і задачу ў сюжэце фільма.

Дамініруючай тэмай у новых частках шматсерыйнай эпапеі з'яўляецца паказ паядынку дзвюх процілеглых сіл — савецкіх патрыётаў і фашысцкіх захопнікаў.

...На пасяджэнні Мінскага падпольнага гаркома вырашана мяняць формы работы, наладзіць рэгулярную сувязь з партызанскімі атрадамі, з Мінскім абкомам і ЦК Кампартыі Беларусі. Бясстрашны Жан прапануе забіць самога Кубэ, а журналіст У. Амельянюк — выпусціць газету. Гэтым эпізодам адведзены ў фільме даволі значны метраж, яны ў многім вызначаюць ідэйны змест кінатвора. Мы бачым і адчуваем, колькі патрабавалася смеласці і мужнасці, вынаходлівасці і рызыкі, каб пакараць самога гітлераўскага намесніка, каб раздабыць друкарскае абсталяванне, каб выпусціць і распаўсюдзіць газету.

Вось ён з'явіўся, маленькі лісточак «Звязды». Пайшоў у масы, панёс заклік да барацьбы і веру ў перамогу. Кінакамера, нібы прыглядаючыся да актывістаў падполля, перадае іх настрой: рэдактара газеты — У. Амельянюка (Ул. Паначэўны), наборшчыка Александровіча (П. Кармунін), іх памочніцы Олі (С. Нікіпелава). З якой любоўю і рызыкай для жыцця рабілі яны родную газету.

Але да гэтых людзей хацелася б прыгледзецца больш уважліва, асабліва да самога рэдактара — маладога журналіста Валодзі Амельянюка. Што ён быў за чалавек, які меў характар, унутраны свет? Хацелася б не інфармацыю атрымаць, а перажыць гэта эмацыянальна.

Рэжысёр, відаць, і сам адчуваў, што ў дадзеным выпадку не ўзняўся на вышыню адлюстраваных фактаў рэчаіснасці і таму экраннае жыццё героя завяршыў прачытаным дыктарам Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні (пасмяротна) Уладзіміру Сцяпанавічу Амельянюку, члену Мінскага падпольнага камітэта партыі, звання Героя Савецкага Саюза — «за асобыя заслугі, мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі».

І яшчэ прыгадвае дыктар аб тым, што пройдуць гады, дзесяцігоддзі, і гэты сціплы газетны лісток «Звязды», выпушчаны Амельянюком і яго сябрамі, зойме сваё месца пад шклом у Музеі Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя спасылкі дапамагаюць рэжысёру і аператару больш дакладна перадаць сэнс, значэнне таго, што зрабіў журналіст-патрыёт. Вобраз жа яго застаўся прыблізным, незавершаным.

У папярэдняй, 4-й серыі «Руін» адчувалася недастатковая распрацаванасць эпізодаў з піянерам-героем Валодзем Шчарбацэвічам і яго маці. Можа рэжысёр палічыў не абавязковым акцэнтаваць увагу на гэтых героях таму, што раней стварыў кінанарыс «Пакараны смерцю ў сорак першым», дзе шлях піянера-героя на шыбеніцу быў праследжаны падрабязна. Пра гэты хвалюючы фільм мы памятаем, яго нельга забыць. І не аб тым ідзе гаворка. Я гавару пра тое, што ў кінаэпапеі варта было б стварыць эмацыянальныя вобразы Валодзі Шчарбацэвіча і яго маці, а не задавальняцца толькі схемай. Так, ёсць у стужцы асобныя, павярхоўна адлюстраваныя сітуацыі, не раскрытыя характары. Але глядзіцца яна ад пачатку і да канца з вялікай цікавасцю, бо аднаўляе незабыўнае, велічнае, хвалюючае.

Шлях у неўміручасць быў складаным і цяжкім. Былі памылкі, залішняя даверлівасць, і самае страшнае — здрада, ахвяры. Няхмернае абурэнне выклікае злачынная дзейнасць былога савецкага ваеннаслужачага Рудзянкі. Артыст А. Шурна гэту ролю іграе вельмі пераканаўча. Ён паказвае, што прывяло Рудзянку да здрады Радзіме — баязлівасць, бязволле, хцівасць.

Але сапраўдныя савецкія патрыёты мужна змагаюцца супраць фашызму. Яны, героі-падпольшчыкі — партыйныя работнікі, служачыя, ваенныя — былі рознымі. У кожнага — свой шлях да барацьбы. Адны запамінаюцца больш, другія менш, а разам — ствараецца вобраз савецкага народа, які не скарыўся, а выстаяў і перамог у жорсткай барацьбе з захопнікамі.

КАДРЫ З КІНАФІЛЬМА «РУІНЫ СТРАЛЯЮЦЬ...»,

У. Амельянюк — У. Паначэўны, І. Матусевіч — А. Чарноў, І. Казінец — А. Козел, Д. Караткевіч — Л. Залатухін.

Сямён — В. Тарасаў, Жан — І. Ледагораў.

Х. Александровіч — П. Кармунін, Вольга — С. Нікіпелава.

Цэнтральны персанаж 5-й і 6-й частак фільма — Жан (І. Ледагораў). Вобраз яго — найбольшая ўдача кінематаграфістаў, хоць яны і паказваюць героя толькі ў падполлі, не выкарыстоўваючы іншых біяграфічных звестак. Толькі ў канцы 6-й серыі называецца сапраўднае імя гэтага чалавека — савецкага афіцэра Івана Канстанцінавіча Кабушкіна.

У фільме, заснаваным на дакументальным матэрыяле, канкрэтных героях, вельмі важна было дакладна падабраць выканаўцаў. Мы бачым, што амаль кожны акцёр адчувае «зерне» сваёй ролі і даносіць яго да нас, гледачоў. Прынцыповае значэнне гэтага твора заключаецца яшчэ і ў тым, што рэжысёр патрабаваў пераканаўчасці, абгрунтаванасці, псіхалагічных матывіровак як ад стваральнікаў станоўчых вобразаў, так і адмоўных. Напрыклад, Жан І. Ледагорава і Кубэ Г. Кураўскаса, або Багамолаў-Козыраў Г. Гая і Алекс А. Мілаванава — партнёры, вартыя адзін аднаго па ўзроўню акцёрскага майстэрства. Дакладнасць акцёрскай ігры ў многім і забяспечыла несумненны поспех фільма, як мастацкага твора. А гэта — зарука таго, што ён пакіне глыбокі след у сэрцах гледачоў.

«Жыццё і барацьба герояў фільма — адзін з самых пераканаўчых доказаў нашай праўды». Гэтым каментарыем аўтары суправаджаюць фатаграфіі герояў-падпольшчыкаў, што ўзнікаюць двайной экспазіцыяй у фінале. Тэлефільм «Руіны страляюць...» — гэта помнік іх неўміручаму подзвігу. Гэта гімн патрыятызму і мужнасці савецкага чалавека і разам з тым заклік да жывых, каб заўсёды помнілі пра барацьбітоў за свабоду і шчасце народнае.

Е. БОНДАРАВА.

РОЗДУМ УСХВАЛЯВАНАГА СЭРЦА

ДЗМІТРЫЙ КАМІНСКІ паслядоўна і мэтанакіравана працуе ў жанры інструментальнага канцэрта. Пачаўшы ў 1947 годзе з Першага канцэрта для скрыпкі з аркестрам, кампазітар на працягу 25 гадоў актыўна і плённа выпрабоўвае сябе ў гэтым жанры.

Як вядома, інструментальны канцэрт дае кампазітару вялікія магчымасці для прасторы творчай фантазіі, для паказу спаборніцтва салірующага інструмента і сімфанічнага аркестра. Менавіта гэта заўсёды вабіць Д. Камінскага. Ён шукае разнастайныя мастацкія фарбы, розныя формы ўвасаблення «духу спаборніцтва» інструмента і аркестра, новыя выразныя сродкі. Яго чатыры канцэрты для фартэпіяна з аркестрам (акрамя іх пяру Д. Камінскага належаць два канцэрты для скрыпкі з аркестрам, два канцэрты для цымбалаў, віяланчэльны канцэрт, канцэрціна для фартэпіяна з аркестрам) — гэта чатыры творы, вельмі розныя, увогуле, па форме, метаду развіцця музычнага матэрыялу. Першыя два — у класічных традыцыях, з разгорнутай драматургіяй, у абодвух аўтар выкарыстоўвае ў асобных частках інтанацыйную сферу беларускай народнай песеннасці. Трэці фартэпіянны канцэрт-фантазія на тэму беларускага народнага танца «Юрачка» пабудаваны на прынцыпе варыяцыйнага развіцця адной тэмы ў чатырох кантрастных па характары разгорнутых эпізодах. І нарэшце, апошні, Чацвёрты канцэрт, прэм'ера якога днямі адбылася ў зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

У гэтым творы Дзмітрый Раманавіч адышоў ад тых метадаў і мастацкіх рашэнняў, якія вабілі яго ў папярэдніх работах. Гэта вельмі лаканічны твор. Можа паказацца, што кампазітар звузіў у канцэрце вобразную сферу магчымасці музычна-тэматычнага развіцця, абмежаваў сябе ў галіне формаўтварэння. Але гэта можа паказацца толькі з фармальнага пункту гледжання, па знешнім адзнакам. На самой жа справе кампазітар у невялікім па памерах, простым па форме сачыненні дасягнуў новай мастацкай вышыні, стварыўшы эмацыянальны твор сапраўды канцэртнага плана.

Адзін настрой пераважвае ў Чацвёртым фартэпіянным канцэрце — настрой святочнай прыўзнятасці, жыццярадаснасці, светлага светаўспрымання. Ён «пераліваецца» ад аркестра да салірующага фартэпіяна, чаргуецца з кароткімі момантамі ласкавай, сардэчнай лірыкі, жарту або трывогі.

Тры раздзелы канцэрта гучаць адзін за адным без перапынку, як быццам «на адным подыху», ствараючы адзіны «паток пачуццяў». Кампазітар звужае рамкі формы, адыходзіць ад традыцыйных прынцыпаў шырокага санатнага развіцця. Але ні ў якім разе не абмяжоўвае сябе ў сэнсе мастацкай выразнасці, душэўнага руху, наадварот, чым больш сціплыя элементы формы, тым ярчэй тут эмацыянальны струмень, тым больш значная ў мастацкіх адносінах думка, больш моцнае пачуццё.

Першы раздзел канцэрта кампазітар стварыў у традыцыях старадаўняй клавесіннай санаты, даўшы шырокую экспазіцыю двух кантрастных тэм-вобразаў. Першая тэма энергічная, напорыстая, маторнага складу (яна з'яўляецца ў аркестры адразу пасля чатырох пачатковых акордаў,

СЛОВА ПРА ФРАНТАВОГА КІНААПЕРАТАРА

РАДАСНА і хвалююча было ў той дзень на душы аператараў І. Вейняровіча, У. Цеслюка, М. Берава, ды ва ўсіх удзельнікаў сустрэчы. Праз многія гады ў сяёе на студыі яны прымалі дарагога госця, старога франтавога сябра рэжысёра-аператара Талінскай студыі Сямёна Сямёнавіча Школьнікава. У шчырай гутарцы зноў прыгадалі ваенныя гады, кіназдымкі ў партызанскіх атрадах, сваіх сяброў — аператараў М. Капкіна, М. Сухаву, В. Мурамцава.

З усяго, што здымаў некалі С. Школьнікаў, беларускім калегам ён паказаў асабліва каштоўную кінастужку аб жыцці і дзейнасці аператара Віктара Мурамцава «Усю ноч вайна» (сумесная вытворчасць студыі Югаславіі фільмскі-студзіо — Цітаград, ФРЗ—Белград і «Талінфільм», СССР. Аўтар сцэнарыя Ус. Ільінскі, рэжысёр С. Школьнікаў, аператар В. Школьнікаў).

Цяжкі шлях прайшоў кінадакументаліст разам з партызанамі Югаславіі і Славакіі. З ліпеня 1944 і да 30 красавіка 1945 года. А загінуў у жорсткім танкавым баі пад Трыестам усяго за дзевяць дзён да Перамогі.

Здымаў фільм сын С. Школьнікава — Віктар. Югаслаўская газета «Нядзеля» паведамляла, што праз дваццаць сем гадоў старэйшы Школьнікаў зноў прыехаў на кіназдымкі, прысвечаныя яго баявому сябру...

У пошуках матэрыялу пра С. Школьнікава я натрапіў на дакумент, які раскрыў «сакрэт» яго ваеннай біяграфіі. Маецца на ўвазе характарыстыка на кінааператара С. Школьнікава (у сувязі з прадстаўленнем да ўрадавай узнагароды) за подпісам Героя Савецкага Саюза У. Я. Лабанка.

Калі «расшыфроўваеш» характарыстыку ўспамінамі журналістаў, камандзіраў, сяброў С. Школьнікава, то яшчэ выразней перад табой паўстае вобраз байца, аператара, чалавека.

З характарыстыкі:

«Таварыш Школьнікаў С. С. з 1-га красавіка 1944 года знаходзіўся ў тыле ворага ва Ушацкай і Вягомльскай партызанскіх зонах, дзе выконваў спецыяльнае заданне па кіназдымцы фільма «Беларусь».

За час знаходжання ў тыле ворага тав. Школьнікаў С. С. здымаў баі на Дзвіне ў брыгадах Мельнікава... 1-й антыфашысцкай, Аляксея і іншых»...

. . . . . .

У цяжкай абстаноўцы жалезнага кальца блакады, знаходзячыся 5 дзён у руху па непраходных балотах, тав. Школьнікаў С. С. паказаў сябе як дысцыплінаваны, тактычна пісьменны камандзір...»

Сямён Сямёнавіч стаў франтавым аператарам толькі ў сярэдзіне 1942 года. А да гэтага ён быў у дзеючай арміі на Паўднёва-Заходнім фронце ў групе артылерыйскай разведкі. Пад г. Бельцы яго параніла. Прыйшлося «падарожнічаць» у тыл, у г. Пугачоў... Пасля папраўкі — вучэбны батальён. Курсы мінамётчыкаў. Фронт. Начальнік разведкі асобнага мінамётнага дывізіёна. Вызваленне рускага горада Калініна...

У баі пад Ржэвам у ліпені 1942 зноў раненне і зноў шпіталь. На гэты раз у г. Іванаве. Тут і адшукаў яго Р. Р. Грыгор'еў, у той час начальнік франтавых кінагруп, намеснік начальніка глаўка кінахронікі. Так С. Школьнікаў быў выкліканы ў Маскву на Цэнтральную студыю кінахронікі. Адтуль у другі раз—на Калінінскі фронт. Толькі цяпер у якасці кінааператара.

З характарыстыкі:

«14 мая ўдзельнічаў пры разгроме нямецкага гарнізона на раз'ездзе Посін. Улічваючы, што ў начны час здымкі праводзіць нельга, тав. Школьнікаў выказаў жаданне пайсці з групай гранатамётчыкаў, другім прарваўся пад дрот і закідаў гранатамі варожы кулямёт»—так пісала газета «Красная звезда» 15 жніўня 1943 года».

...З Калінінскага фронту ваенныя дарогі прыводзяць С. Школьнікава да беларускіх партызан, якія ў гэты час вырваліся з блакаднага кальца ва Ушацкай аперацыі і рухаліся на злучэнне з брыгадай Дуброўскага. Страшэнна стомленыя, яны ледзь не спалі на ходу. Здарылася так, што дзевятнаццаць чалавек, у тым ліку і Сямён Школьнікаў, адарваліся ад ар'ергарду. Праўда, напрамак быў ім вядомы: чыгунка Лепель—Докшыцы. Узнікла пытанне: хто павядзе? Доўга не думаючы, С. Школьнікаў папрасіў яму даручыць гэту справу. Ішоў наперадзе атрада, рызыкуючы першым падарвацца на міне або загінуць ад варожай кулі.

На шчасце, усё закончылася добра. Пад вечар таго ж дня, пасля некаторых дарожных прыгод атрад дабраўся ў лагер брыгады Дуброўскага.

З характарыстыкі:

«У час бамбёжкі вёскі Вялікія Дольцы здымаў падпаленую вёску, апрача таго, нягледзячы на бомбы, што ўзрываліся наўкол, аказваў дапамогу смяротна параненаму камандзіру брыгады тав. Данукалаву Аляксею Фёдаравічу».

...Калі пачалася бамбёжка ў лагеры, дзе размяшчалася брыгада Данукалава, партызаны адпачывалі. Хутка падхапіўшыся, яны пачалі рыхтавацца да бою. Адзін за адным пікіравалі на вёску нямецкія бамбардзіроўшчыкі, скідваючы свой смертаносны груз. С. Школьнікаў імкліва пачаў здымаць на плёнку ўсё гэта пекла. І раптам скрозь полымя агню ўбачыў, як упаў камандзір. Крыкнуў М. Пісараву, каб той працягваў здымкі, а сам пабег у бок Данукалава. І першае, што кінулася ў вочы—гэта акрываўленая кашуля. С. Школьнікаў перабінтаваў параненага. Неўзабаве падаспела журналістка В. Сіманава. Разам з ёю вынеслі камандзіра ў бяспечнае месца. Прыглядалі за ім, але ён памёр ад цяжкіх ран...

І ўжо зусім нядаўна на праглядзе фільма І. Вейняровіча «Балада аб мужнасці і любві» С. Школьнікаў зноў сустрэўся з В. Сіманавай. З экрана яна расказала, як немцы, адкапаўшы магілу, на кавалкі пасеклі цела Данукалава... Нават мёртвы ён быў ім страшны. Невядомая дзяўчына сабрала астанкі і перазахавала іх на вясковых могілках.

З характарыстыкі:

«Таварыш Школьнікаў С. С. у час цяжкага жалезнага кальца нямецкай блакады ішоў на прарыў у перадавім штурмавым ланцугу партызан, здымаючы ўсё гэта на кінаплёнку. Толькі за дзень было прарвана чатыры варожыя кальцы, пры гэтым, тав. Школьнікаў С. С. здымаў шлях прарыву. Асабіста падпаліў дом, з якога адстрэльваліся два немцы...»

У тую памятную красавіцкую раніцу 1944 года, змучаныя бясконцымі баямі партызаны выходзілі з акружэння. З імі быў С. Школьнікаў. У руках кінакамера «Аймо», на шыі аўтамат, за плячыма—рэчавы мяшок з плёнкай. У пошуках кропкі агульнага плана С. Школьнікаў апярэдзіў калону партызан, прыціснуўся да сцяны адзінокай хаты і пачаў здымаць. Раптам, што такое? Праз візір апарата ён убачыў, як адзін за другім падаюць партызаны. У гэты ж момант пачуў над галавою кулямётны трэск. Відаць, немцы, засеўшыя па гары, падпусцілі аператара і чакалі, пакуль наблізіцца партызанская калона.

«Што рабіць»?—думаў С. Школьнікаў. І тут нехта крыкнуў: «Сямён, падпальвай!» Азірнуўся. Саломы побач не было. А хата на высокім каменным падмурку. Бярвенні ж запалкай не падпаліш... Ускочыў у хату. Схапіў на сцяне газоўку, разбіў... Так ў тым агні знайшлі свой канец фашысты.

Доўгі час кінааператар С. Школьнікаў адточваў сваё майстэрства ў партызанскіх атрадах. Хочацца прыгадаць эпізод, які зняў ён для поўнаметражнага дакументальнага фільма «Вызваленне Савецкай Беларусі»:

«...Роў. На дне цячэ ручаёк. Чатыры падрыўнікі прабіраюцца да берагу ракі. Затаіўшыся, прыслухоўваюцца. Буйным планам—твары маладых хлопцаў. Атрымана баявое заданне: у што б ні стала—узарваць мост. Навокал цішыня. Аператар здымае, як два народныя мсціўцы спрытна ўзбіраюцца наверх, а астатнія застаюцца на месцы сачыць, каб не з'явіліся немцы. Між тым, партызаны падпальваюць шнур... Усе разумеюць, што цяпер адсюль бягом...

Аператар дазняў кадр, калі хлопцы дабеглі да рова, і толькі пасля гэтага кінуўся за імі. Азірнуўся. З гэтага месца добра відаць мост. Секунду пачакаў, прыціснуўшыся да высокага берагу. Замёр з кінакамерай напагатове. Ідуць пакутлівыя секунды. Школьнікаў нібы камандуе сам сабе: «матор». Грымяць выбухі. Стракоча апарат...

У любых складаных умовах С. Школьнікаў заўсёды знаходзіў цікавыя вобразы, «лавіў» характэрныя дэталі, ніколі не забываў пра асаблівасці баявога аператарскага майстэрства.

Вось яшчэ некаторыя кадры С. Школьнікава:

...Дзяўчына-партызанка цыруе рукаў кофтачкі. У гэтым нічога асаблівага. Але закончыўшы работу, яна вымае адтуль «грыбок». Аказваецца, гэта граната...

...Жанчына доіць карову. Звычайны мірны сялянскі занятак. Потым план змяняецца і мы заўважаем, што на баку «даяркі» прымацаваны пісталет, што ў любы час ёй, як усім партызанам, трэба быць начаку....

Пасля ад'езду з Беларусі С. Школьнікаў здымаў баявыя аперацыі на трэцім украінскім фронце. А ў канцы кастрычніка 1944 года разам з Чырвонай Арміяй прыйшоў на югаслаўскую зямлю. Тут з В. Мурамцавым ён здымаў партызан братняга народа.

«Народныя мсціўцы», «Вызваленне Савецкай Беларусі», «Югаславія» — вось далёка не поўны пералік стужак, у якія ўвайшлі эпізоды франтавой і партызанскай барацьбы, знятыя аператарам - дакументалістам С. Школьнікавым.

...З вайны ён вярнуўся з ордэнамі «Чырвонага Сцяга», «Айчыннай вайны», «За заслугі перад народам» (Югаславія). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі... Сямён Сямёнавіч Школьнікаў і сёння ў баявым страі...

Анатоль АЛАЙ,
кінааператар студыі «Беларусьфільм».

якія адыгрываюць ролю своеасаблівага «зачыну») і настрой, які заданы тэмай (яна пераходзіць ад аркестра да фартэпіяна), становіцца галоўным у гэтым і іншых раздзелах Канцэрта, хоць кампазітар і пакідае месца для мастацкіх кантрастаў. І калі з'яўляецца другая тэма ў раяля, у аснове сваёй лірычная, усё ж яркае аркестравае суправаджэнне не дае адчування заспакоенасці. Паток руху не вычэрпваецца, душэўны парыў працягваецца...

Мне здалося, што ў момант уступу другой тэмы адбываецца невялікі, але выразны «зрух» настрою іншага плана: у «закліках» валторн адчуваецца нейкая заклапочанасць, нават трывога, яна ў пэўнай ступені перадаецца віяланчэлям і кантрабасам (піцыката), саліруючаму фартэпіяна, скрыпкам... І ўсё ж гэтаму новаму настрою не ўдаецца засланіць асноўнага, таго, што пануе з самага пачатку—накіраванасці, яркага святочнага «дзейства»...

І неяк вельмі арганічна ўзнікае паэтычны вобраз другога раздзела Канцэрта. Ён з'яўляецца ў пяшчотным спяванні флейты, потым кларнета, габоя. Тут жа тэму «перахопліваюць» скрыпкі і вядуць яе захоплена, з вялікай цеплынёй. На гэтым фоне — светлая, летуценна-рамантычная тэма фартэпіяна. Момант нічым не замутненага святла, прыгажосці і натхнення. Яго «разбівае» сярэдні эпізод — крыху скерцознага характару, хоць можна ўлавіць тут і няясныя хваляванні, пытанне і надзею. І зноў — светлая мара (рыпрыза раздзела), і толькі недзе на самым дальнім этапе, як мне здалося, у спяванні скрыпак прамільгнуў нейкі жаль...

У другім раздзеле Канцэрта фартэпіяна мае цікавыя сольныя эпізоды, у якіх кампазітар, напэўна, мае на ўвазе не толькі даць піяністу прадэманстраваць віртуозныя магчымасці інструмента, але, галоўнае, дасказаць, развіць асноўныя думкі.

У гучанні літаўраў прадугадваецца з'яўленне трэцяга раздзела канцэрта. Зноў, як і ў самым пачатку—той жа святочны настрой, той жа пачатковы, вельмі характарны рытм першай тэмы (як добра гэтыя дэталі «цэментуюць» твор, «працуюць» на агульную задуму), але сама тэма іншая. І тут, у гэтым невялікім фінальным раздзеле (кампазітар будуе тэматычнае развіццё на элементах формы ронда) адбываецца сцвярджэнне светлага пачатку. Хваляванне пачуццяў у раяля, які «спрачаецца» з аркестрам і ў той жа час злучаецца з ім; гэтыя пачуцці распаленыя і гранічна эмацыянальныя... Светлымі мажорамі заканчвае кампазітар сваё хвалюючае апавяданне аб прыгажосці, гордай сіле чалавечага пачуцця.

Музыка канцэрта «дыхае», яна захапляе і хвалюе слухача, таму што сам аўтар не быў раўнадушным, калі пісаў яе, ствараў вобразы, звязаныя з сучасным светаўспрыманнем чалавека, аптымістычныя вобразы жыцця...

Заслужаная артыстка БССР Ева Эфрон у вечар прэм'еры, здаецца, пераўзышла сябе. Мы ведаем таленавітую беларускую піяністку як цудоўнага інтэрпрэтатара многіх яркіх фартэпіянных сачыненняў камернага і канцэртнага жанраў, у тым ліку і беларускіх кампазітараў. Да гэтага часу ў нас непераўзыдзеным з'яўляецца яе выкананне Першага фартэпіяннага канцэрта Д. Камінскага і яго Фантазіі на тэму «Юрачкі». Зараз Ева Эфрон яшчэ раз пацвердзіла сваю рэпутацыю чадзвычай тонкага музыканта, здольнага раскрываць з гранічнай выразнай сілай самыя разнастайныя эмацыянальныя станы. Чацвёрты канцэрт Дзмітрыя Рамановіча Камінскага яна сыграла з вялікім натхненнем і запалам, з тым сапраўдным артыстызмам, які ўласцівы выканаўчай манеры піяністкі.

Алена РАКАВА.

АД НАШАГА «ГАЛОЎНАГА КАРЭСПАНДЭНТА»...

Дайняя дружба звязвае калектыў Гомельскага абласнога драматычнага тэатра з рабочымі завода «Гомсельмаш». І вось чарговая сустрэча ў тэатры: цёплая, прыязная, прынцыповая.

Электразваршчыца завода, Герой Сацыялістычнай Працы Р. Казлова выказала пажаданне, каб кожны спектакль тэатра выходзіў у жыццё са знакам якасці. Вядома, не ў літаральным сэнсе гэтага слова, але каб кожная прэм'ера хвалявала гледачоў, прымушала іх думаць, спрачацца. Пра гэта ж гаварылі і інжынер-эканаміст Л. Пакуленка, слесар-зборшчык В. Каваленка, урач Л. Хаздан.

Са словам у адказ выступілі дырэктар тэатра Т. Карпава і галоўны рэжысёр тэатра І. Папоў.

Былі паказаны ўрыўкі са спектакляў «Дзень добры, Крымаў», «Твае шаснаццаць», «Даходнае месца», «Не трывожся, мама».

На гэтым жа сходзе паміж абодвума калектывамі быў заключаны дагавор аб садружнасці.

Раіса КАЗЛОВА,
настаўніца.

Буда-Кашалёўскі раён.

У калектыве мастацкай самадзейнасці калгаса «Другая пяцігодка» ўдзельнічаюць жывёлаводы, паляводы, механізатары. Ёсць моладзь, а ёсць і людзі пажылога ўзросту. У сельскім клубе адбыўся першамайскі канцэрт. Хораша, задушэўна спявалі народныя песні калгасніцы З. Чэхава, Г. Ткачова, П. Шлага, М. Дубкова, Ф. Мартыненка. У праграме канцэрта былі сучасныя песні, чыталіся байкі К. Крапівы. Кіруе самадзейнасцю загадчыца клуба В. Паўлушкіна.

Іван ВЕРАБ'ЁЎ.

Чэрыкаўскі раён.

Жыве ў Юрацішках усімі паважаны чалавек. Яго ведаюць і стары і малы. У час Вялікай Айчыннай вайны Рыгор Васільевіч Івашкевіч быў камісарам партызанскага атрада, якім камандаваў Кірыл Пракопавіч Арлоўскі. За адвагу, мужнасць Р. Івашкевіч узнагароджаны 14 баявымі ардэнамі і медалямі.

Сёння Рыгор Васільевіч працуе ў школе, выкладае гісторыю. Яго часта запрашаюць у дом культуры, каб паслухаць расказ партызана. А бывае і так, што Р. Івашкевіч чытае са сцэны ўрыўкі з кнігі «Птушкі спяваюць на досвітку» Я. Цвяткова. Дакументальная аповесць расказвае пра баявыя справы партызанскага атрада, які ўзначальвалі К. Арлоўскі і Р. Івашкевіч. І тады ў зале ціха, ціха. Цікава, калі сам герой твора чытае пра даўно перажытае...

Я. МАКОЎСКІ.

г. п. Іўе.

Пісьмы... Яны жывяць газету, далучаюць яе да вялікага шматграннага жыцця народа.

Штодзень на рэдакцыйны стол кладуцца дзесяткі рознакаляровых канвертаў, паштовак. Нашы карэспандэнты паведамляюць пра найбольш значныя падзеі ў культурным жыцці рэспублікі. У іх пісьмах — трывога і боль, радасць і неспакой людзей, зацікаўленых, людзей, якія сваімі допісамі, карэспандэнцыямі, вострымі сігналамі памагаюць нашай партыі змагацца за паспяховае выкананне планаў трэцяга рашаючага года пяцігодкі, а газеце стаць сапраўдным прапагандыстам і агітатарам неўміручых ленінскіх ідэй.

Сёння мы друкуем некаторыя пісьмы з нашай рэдакцыйнай пошты.

Кнігарня ў Рэчыцы мае звыш 500 пастаянных наведвальнікаў. Адных толькі падпісчыкаў на творы У. І. Леніна, Вялікую Савецкую Энцыклапедыю, творы беларускіх пісьменнікаў, БелСЭ і іншыя выданні тут звыш 400 чалавек. План першага квартала па продажу кніг работнікі кнігарні выканалі паспяхова.

І. САВІЦКІ.

г. Рэчыца.

Перад студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта часта выступаюць вучоныя, пісьменнікі, кампазітары, знатныя людзі заводаў сталіцы. На гэты раз госцем студэнтаў факультэта журналістыкі быў Іван Шамякін. Ён расказаў аб сваёй рабоце над новым раманам, адказаў на пытанні.

І. СЦЯПУРА.

ФІЛЬМЫ, ПАТРЭБНЫЯ ШКОЛЕ

У рэспубліцы створана некалькі добрых дакументальных стужак пра К. Каліноўскага, Я. Купалу, Я. Коласа і іншых беларускіх пісьменнікаў. На жаль, гэтым патрэбным, як паветра, ілюстрацыйным матэрыялам мы, настаўнікі, карыстаемся вельмі рэдка. Справа ў тым, што здымаліся гэтыя фільмы на звычайнай плёнцы, а ў школах кінаапаратура разлічана на вузкую.

У школьных праграмах значацца творы «Хто смяецца апошнім» і «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона. Зняты добрыя стужкі па гэтых творах. Але паспрабуйце атрымаць іх у кінапракаце. Дарэмныя спадзяванні. Знаходзяцца дзесяткі прычын (карціны па мастацкім і тэхнічным узроўні састарэлі і г. д.), каб давесці, што іх ужо сёння нельга паказваць гледачу.

Нямала робіць па прапагандзе роднай літаратуры творчае аб'яднанне «Тэлефільм». Тут і экранізацыя вядомых твораў беларускіх аўтараў, такіх, як «Людзі на балоце» І. Мележа, «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна, «Трэцяе пакаленне» К. Чорнага і рад іншых. Наладжваюцца перадачы, прысвечаныя творчасці асобных пісьменнікаў. За гэта мы ўдзячны работнікам Беларускага тэлебачання. Толькі не заўсёды ёсць магчымасць паглядзець перадачу. Многія школьнікі ў гэты час вучацца і не ва ўсіх раёнах трансліруюцца мінскія праграмы.

І апошняе: мне здаецца, што ўсё яшчэ мала выпускаецца ў свет хранікальна-дакументальных стужак пра жыццё і творчасць пісьменнікаў і дзеячоў мастацтва рэспублікі. Да гэтай справы трэба прыкласці добрыя руплівыя рукі.

І. БЫХАВЕЦ,
настаўнік Лынтупскай сярэдняй школы Пастаўскага раёна.

ЧЫТАЧ ПАДТРЫМЛІВАЕ, ПАВЕДАМЛЯЕ...

Прачыталі ў «ЛіМе» артыкул Алы Сычовай «Ландшафт — катэгорыя архітэктурная», надрукаваны 30 сакавіка г. г. Пытанні, узнятыя газетай, актуальныя. У час паездак па Валожынскім, Ашмянскім, Лідскім, Навагрудскім раёнах мы з болем у сэрцы глядзелі, як на старых гасцінцах выкарчоўваюць прысады. Гэта робіцца, мусіць, дзеля таго, каб пашырыць дарогу. Пры гэтым знішчаюцца векавыя дрэвы, не кажучы ўжо аб тым, што губляецца такі каштоўны помнік, як гасцінец.

Думаем, можна было б зрабіць інакш — побач з існуючай дарогай пракласці другую і па кожнай з іх зрабіць аднабаковы рух. Мы не спецыялісты ў гэтай галіне, але нам усё ж здаецца, што горш не будзе (для руху), не кажучы ўжо аб тым, што прапанаваны варыянт абыдзецца танней.

А. СТУПЕНЬ,
М. КУПАВА,
Хв. ЛАДУЦЬКА.

г. Мінск.

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КНІГІ

Нядаўна мне нечакана трапіў у рукі зборнік апавяданняў беларускіх пісьменнікаў на англійскай мове «Фарбы роднага краю», выдадзены выдавецтвам «Беларусь». Я вучуся ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў. Вывучаю англійскую мову. Зразумела мая цікавасць да гэтай анталогіі. Чытаць творы родной літаратуры ў перакладзе на англійскую мову — якое задавальненне! Але тут жа ўзнікла пытанне, як нарадзілася гэтая кніга, бо, наколькі мне вядома, падобная выданне ў рэспубліцы ажыццёўлена ўпершыню.

Ігар ГЕРАСІМОВІЧ.

ЧЫТАЧУ ГАЗЕТЫ АДКАЗВАЕ ПІСЬМЕННІК Янка БРЫЛЬ:

— Некалькі гадоў назад я разам з Міхаілам Максімавічам Севярнёвым зараз намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР, два тыдні правёў у дружалюбнай Індыі. У некаторых гарадах штата Мансур мы сустракаліся з дзеячамі навукі, культуры, мастацтва. У час адной з такіх сустрэч ад аднаго з выдаўцоў паступіла прапанова выдаць кнігу беларускага апавядання на англійскай мове.

Карысную справу, якая заклікана ўмацоўваць дружалюбныя, прыязныя адносіны з народамі Індыі, у Мінску, горача падтрымалі, і я ахвотна ўзяўся за ўкладанне гэтай кнігі. Да перакладаў былі запрошаны мінскія знаўцы англійскай мовы Р. Ліпатаў, А. Вейзэ і М. Мінц. Рукапіс перакладу адрэдагаваў вядомы англійскі пісьменнік Уолтар Мэй.

У зборніку змешчаны апавяданні прадстаўнікоў старэйшага пакалення беларускіх празаікаў Я. Коласа «Як птушкі дуб ратавалі», К. Чорнага «Начлег у вёсцы Сінегах», М Лынькова «Андрэй Лятун», Я. Скрыгана «Слепата», П. Пестрака «Лясная песня».

Анталогія знаёміць зарубежных сяброў таксама з творамі І Мележа «У гарах дажджы», І. Шамякіна «Непрыгожая», В. Быкава «Незагойная рана», А. Кулакоўскага «Усюды вала», М. Лупсякова «Дняпроўская чайка», І. Навуменкі «Вераніка».

Чытач знойдзе тут і апавяданні А. Васілевіч, У. Караткевіча, І. Пташнікава, М. Стральцова, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава, а таксама маё апавяданне «Дваццаць». Зборнік, вядома, не прэтэндуе на поўны паказ беларускага сучаснага апавядання.

Шчырай падзякі заслугоўвае рэдактар кнігі Н. Воўк-Левановіч. Зборнік вызначаецца высокай культурай паліграфічнага выканання. Друкаваўся ён на Мінскім паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа.

Цікавы яшчэ адзін факт. У свой час рукапіс гэтай кнігі быў пасланы ў Індыю. Стала вядома, што на мову канара двойчы перакладзены ўжо два апавяданні: А. Васілевіч «Звычайная справа» і Я. Скрыгана «Слепата». Іх перакладалі вядомы пісьменнік штата Майсур лаўрэат прэміі Д. Неру газеты «Саветланд» Басаварадж Катцімані, Б. Р. Малатхі і Аралумаліге Палтхасаратхі. Будуць перакладацца і іншыя творы.

НЕ ДЗІЦЯЧЫЯ КЛОПАТЫ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Дзіцячыя кнігі пішуцца для выхавання. Аднак быць незаменным падручнікам жыцця суджана, па многіх прычынах, не кожнай кнізе. Адна з прычын — не кожны твор можа закрануць сэрца чытача. Таму толькі самыя лепшыя, самыя праўдзівыя кнігі, напісаныя для дзяцей, вытрымалі выпрабаванне часу. У нас гэта творы Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Маўра, М. Лынькова.

Вялікім попытам у чытачоў нашай бібліятэкі карыстаюцца многія кнігі беларускіх пісьменнікаў. Яшчэ не ўмеючы чытаць, нашы самыя маленькія сябры з задавальненнем завучваюць напамяць вершы В. Віткі, Э. Агняцвет, С. Шушкевіча, А. Вольскага і іншых паэтаў.

Чытачы старэйшага ўзросту з цікавасцю чытаюць кнігі Я. Брыля «Зялёная школа», А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся», Г. Васілеўскай «Маланка ўначы», кнігі В. Вольскага, П. Валкадаева «Чый хлопчык?», М. Герчыка «Вецер ірве павуцінне», М. Гамолкі «Шосты акіян», В. Марозава «Ім было па чатырнаццаць», І. Навуменкі «Вайна каля Цітавай копанкі», Ул. Паўлава «Пажарніца», А. Пальчэўскага «Ты не адзін», Л. Прокшы «Мальчик в больших башмаках», П. Рунца «Алёшка-верхалаз», І. Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага», В. Хомчанкі «Чырвоны мак», У. Шахаўца «Чорны снег», аповесці А. Якімовіча і інш.

Сярод кніг, якія выйшлі ў апошнія гады, хочацца назваць творы А. Васілевіч, І. Сяркова, М. Гамолкі, якія цёпла прыняты чытачамі нашай бібліятэкі.

На жаль, тыражы добрых кніг недастатковыя. Напрыклад, амаль зусім адсутнічае ў бібліятэках горада аповесць І. Шамякіна «Першы генерал», мала экземпляраў кніг М. Гамолкі «Дзяўчына ішла па вайне». Патрэбны нам творы Я. Маўра, Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Чарота, Ц. Гартнага, М. Лынькова. Яны ў нас ёсць, але іх не хапае.

Пытанні выдання мастацкай літаратуры для дзяцей, якая неабходна чытачу, і камплектаванне ёю бібліятэк, заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі. Вельмі хацелася б, каб нашы выдавецтвы ў сваёй рабоце кіраваліся парадай Вальтэра: «З твораў пісьменніка трэба друкаваць толькі тое, што варта чытання. Гэта мудрае правіла прывяло б да таго, што было б менш кніг, а больш густу ў чытачоў».

Бібліятэка заклікана ўсімі даступнымі ёй сродкамі прапагандаваць кнігу, прывіваць дзецям любоў да ведаў, да роднай зямлі, да яе герояў. У бібліятэцы праводзяцца літаратурныя вечары, абмеркаванне кніг, на якія запрашаем аўтараў, ранішнікі, прысвечаныя творчасці асобных пісьменнікаў, сустрэчы з героямі кніг, напісаных на дакументальным матэрыяле. Прыгожа афармляюць нашы чытачы інфармацыйныя лісткі пра пісьменнікаў-юбіляраў.

Дапамагаць бібліятэкам прапагандаваць кнігу заклікана бюро прапаганды беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР. Аднак з таго часу, як з'явіўся гэты пасрэднік паміж намі, бібліятэкарамі і пісьменнікамі, прапаганда дзіцячай кнігі ў бібліятэках істотна не палепшылася. На мой погляд, справа тут, відаць, у тым, што бюро прапаганды мае тэндэнцыю хінуцца да чыста камерцыйных аперацый. Для сур'ёзнай, паглыбленай прапаганды кнігі, якая патрабуе і часу і ўмельства, і пошукаў новых форм, у работнікаў бюро, відаць, часу нестае.

Калі раней, да стварэння бюро, бібліятэка дамаўлялася аб сустрэчах непасрэдна з пісьменнікам, то цяпер, каб быць поўнасцю ўпэўненым у тым, што мерапрыемства адбудзецца, нам неабходна звяртацца за дапамогай у бюро і, акрамя таго, яшчэ і асабіста дамовіцца з пісьменнікам. Па віне бюро прапаганды ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага было сарвана тры мерапрыемствы і не абы калі, а ў час Тыдню дзіцячай кнігі. Бывае і такое, калі бібліятэка рыхтуе абмеркаванне твораў аднаго пісьменніка, а на сустрэчу з чытачамі бюро пасылае іншых аўтараў. Нагадаю адзін выпадак. У нашай бібліятэцы наладжвалася абмеркаванне аповесці В. Марозава «Ім было па чатырнаццаць». Меркавалася сустрэча з пісьменнікам. І раптам, разам з В. Марозавым да нас прыехала паважаная госця з сонечнай Малдавіі пісьменніца Раіса Лунгу. Вядома, мы разгубіліся, бо не былі падрыхтаваны да сустрэчы з ёю. Няёмка адчувала сябе і госця, і мы...

Ствараецца ўражанне, што прапаганда літаратуры праз бюро ў нас вядзецца стыхійна. Нават вядучыя бібліятэкі горада не ведаюць планаў работы бюро, як не цікавіцца яно і нашымі планамі. Вельмі добра было б, каб бюро шырэй прапагандавала творчасць пісьменнікаў-юбіляраў, праводзіла месячнікі паэзіі для дзяцей, месячнікі краязнаўчай літаратуры, нейкія іншыя тэматычныя цыклы сустрэч па надзённых пытаннях жывога літаратурнага працэсу.

Калі гаварыць аб сур'ёзнай прапагандзе беларускай літаратуры, то ў ёй павінны быць зацікаўлены перш за ўсё самі пісьменнікі. Вельмі карысна, калі аўтары кніг будуць часцей бываць у бібліятэках, сустракацца з іх работнікамі—праваднікамі сваіх твораў у шырокія масы чытачоў.

А. ЛІСОЎСКАЯ,
загадчыца Мінскай дзіцячай бібліятэкі № 2.

ЛЁТЧЫК ВАСІЛЬ

АДНОЙЧЫ на сустрэчы партызан брыгады «Іскра» атрада «За Савецкую Беларусь», якая дзейнічала ў гады ваеннага ліхалецця ў Лідскіх лясах, мне давялося пачуць аб лядовым аэрадроме на возеры Чырвоным. Пра гэта гаварылі з захапленнем людзі, якіх, здавалася, не здзівіш подзвігам. З нейкім асаблівым гонарам яны расказвалі аб «каменданце лядовага аэрадрома» лётчыку Васілю.

Сустрэча тая адбылася некалькі гадоў назад і я, шчыра кажучы, забыўся пра лётчыка Васіля. Але вось неяк у рэдакцыю прыйшло пісьмо ад слесара кіеўскага завода «Арсенал» Сямёна Міхайлавіча Стаднюка:

«Дарагія сябры-беларусы! Звяртаецца да вас былы партызан легендарнага злучэння двойчы Героя Савецкага Саюза С. Каўпака. У вас у Мінску жыве выдатны чалавек — Васіль Галота, якога ўсе гэтыя гады ўспамінаю з вялікай удзячнасцю, бо ён выратаваў мне жыццё. У 1943 годзе наш атрад, ідучы з баямі да Карпат, аказаўся ў лясах Беларусі на Прыпяці. Фашысты паставілі перад сабой мэту любымі сродкамі знішчыць нас — сцягнулі артылерыю, авіяцыю, эсэсаўскую дывізію «Мёртвая галава». У адным з баёў я быў цяжка паранены ў жывот. Параненых сабралася некалькі соцень чалавек. На Вялікую зямлю вывозіў нас лётчык Вася — так яго ўсе звалі. Ён сам адмарозіў абедзве нагі, але пакуль не пасадзіў у самалёт апошняга параненага партызана, не пакінуў аэрадром.

Вельмі хацелася б яго знайсці, даведацца, як ён жыве, чым займаецца, нізка пакланіцца нашаму баявому таварышу...»

Пісьмо было хвалюючае. Захацелася адшукаць чалавека, пра якога ў ім напісана. Не буду расказваць, як вяліся пошукі. Доўгі час яны былі беспаспяховыя. Але неяк у Музеі гісторыі Айчыннай вайны знаёмяць мяне з сівым чалавекам, пра якога расказваюць, што ён быў у час вайны пілотам, лятаў да партызан. Назваўся ён Бугрымовічам. Я спытаў, ці не ведаў ён такога лётчыка — Галоту, які таксама рабіў палёты да партызан.

— Галота гэта я, — усміхнуўся ў адказ Бугрымовіч.

Я сумеўся ад нечаканасці.

— Вы ж — Бугрымовіч.

— Так. І Галота.

— А як ваша імя?

— Васіль Іванавіч.

...У той жа вечар мы сядзелі ў яго дома. Васіль Іванавіч, хвалюючыся, расказваў пра сваіх баявых таварышаў. Паказваў пісьмы, фатаграфіі. Ля невялікага самалёта — група партызан: хто ў шынялі, хто ў паўкажушку, хто ў фуфайцы. Пасярод — чалавек у камбінезоне, ў лётным скураным шлеме — гэта ён, лётчык Вася. На другой фатаграфіі — самалёт цягнуць коні. Перадыслакацыя. А вось два барадачы. На грудзях — залатыя зоркі. Гэта Сідар Арцем'евіч Каўпак і Пётр Пятровіч Вяршыгара. Яшчэ фатаграфія — сам Васіль Іванавіч з ордэнамі і медалямі.

Як дарагую рэліквію, паказвае Бугрымовіч пісьмо ад Героя Савецкага Саюза, адказнага сакратара Савецкага камітэта ветэранаў вайны Аляксея Марэсьева, які павіншаваў яго з 60-годдзем.

Слаўнае мінулае ў чалавека. Вось толькі некаторыя старонкі яго біяграфіі.

...Ішлі першыя дні вайны. Гарачыя баі разгарэліся на подступах да Магілёва. А лётчык грамадзянскай авіяцыі Бугрымовіч усё яшчэ лётаў на ціхаходным самалёце «ПО-2», на якім і кулямёт не паставіш.

У тыя грозныя дні ў Магілёве быў Клімент Яфрэмавіч Варашылаў. Ён запрасіў да сябе групу лётчыкаў і сказаў, што трэба наладзіць сувязь з сотай дывізіяй, якая трапіла пад Мінскам у варожае кальцо. Узяўся за гэтую справу Бугрымовіч.

— Толькі на маёй «страказе» і прарвацца, таварыш маршал. Магу сесці на любой лясной паляне, пад капой сена, і тут жа зноў узляцець.

Клімент Яфрэмавіч дазволіў. Пяць разоў даводзілася Бугрымовічу садзіць самалёт проста «на жывот», каб выратавацца ад «месершмітаў», і потым зноў працягваць палёт пад агнём ворага. Пад Оршай тры «месеры» нечакана вынырнулі з-за воблакаў. Аднак Васіль Іванавіч здолеў пасадзіць машыну на «пятачок» ля ракі, паспеў выскачыць з кабіны і схавацца за валуном. Фашысты працягвалі пікіраваць і пакуль не падпалілі самалёт, не супакоіліся.

Бугрымовіч быў паранены ў нагу. Трое сутак праз лясы і балоты прабіраўся да месца размяшчэння сотай дывізіі. Але каштоўны пакет уручыў. Асабіста генералу Русіянаву, камандзіру сотай... За гэта быў узнагароджаны першым ордэнам Чырвонага Сцяга.

Прайшоў год. Бугрымовіч стаў ваенным, а не грамадзянскім лётчыкам, лётаў на баявым самалёце «ІЛ-2». Аднойчы ў машыну пацэліў снарад. Васіль Іванавіч паспеў выскачыць з парашутам. Фашысты стралялі па ім у паветры, паранілі ў ногі. Ужо лежачы на зямлі, не ў стане зварухнуцца, ён бачыў, як таварышы пакружылі над ім, аддалі апошнія ўшанаванні і пайшлі на захад біць ворага.

Пазней ён даведаўся, што, вярнуўшыся ў часць, таварышы далажылі аб яго смерці. Жонцы была накіравана пахавальная: «Ваш муж, Бугрымовіч Васіль Іванавіч, верны воінскай прысязе, загінуў смерцю храбрых у барацьбе з нямецка - фашысцкімі захопнікамі за гонар і незалежнасць нашай Радзімы. Вечная яму слава!»

Між тым, Васіль Іванавіч, сцяўшы ад болю зубы, на руках поўз па полю. Кіраваўся да недалёкага стажка — зусім недалёкага, а дапоўз да яго праз некалькі гадзін. Дапоўз і страціў прытомнасць. Калі ж апрытомнеў, над галавою стаяла зорнае неба, здаля чуваць быў сабачы брэх. Зноў папоўз. На досвітку дабраўся да вёскі. Паціху пастукаў у акенца першай хаты. Адтуль выйшла жанчына.

Як горка і крыўдна, што цяпер, праз дзесяткі гадоў, у памяці не захавалася імя той кабеты. Памятаецца толькі, што была яна салдатка, маці трох дзяцей. Каб не яна, невядома яшчэ, як склаўся б яго лёс далей. Восем сутак хавала яна яго як магла, лячыла, апошнім кавалкам хлеба дзялілася... Пакуль сяк-так не стаў ён на ногі. І адразу пачаў думаць, як да сваіх дабрацца. Нейкі хлопец паабяцаў звесці з партызанамі. Уначы выйшлі разам з вёскі, але адышлі недалёка — за ваколіцай іх чакалі паліцаі: хлопец аказаўся іх памагатым...

Далей былі канцлагеры. Смаленскі, Аршанскі. З Оршы павезлі ў вагонах для жывёлы на захад. Па дарозе даведаліся — ў Асвенцім. Уначы ўдалося вырваць некалькі дошак у падлозе і выскачыць...

Не дзень, не тыдзень ішоў, а даклыпаў у роднае сяло на Палессі. Маці ўбачыла, спалохалася — такі ён быў змарнелы, знясілены.

Як ні таілася маці, даведаліся ў вёсцы, што ў хаце ў яе госць, і не абы-які. Мінула колькі дзён, і ноччу ў дзверы загрукалі — нячыстая прынесла паліцаяў...

Канечне, пазналі — не чужы ж, тут у вёсцы вырас. А што лётчык, дык ведалі — маці перад вайной усім суседзям сынам хвалілася, фотаздымкі, дзе ён у форме, паказвала. Так што размовы доўгай з ім не вялі — выгналі ў двор, за пуняй прыставілі да сцяны, з пахаладзелым сэрцам пачуў Бугрымовіч стрэлы і... застаўся стаяць. Уціснуў галаву ў плечы—тварам ён да сцяны стаяў—новых стрэлаў чакаў і... не дачакаўся. Асцярожна азірнуўся, вачам сваім не паверыў: ён стаіць жывы, а паліцаі, што ў яго стралялі, ляжаць забітыя.

— Бачу, — расказвае Васіль Іванавіч, — да мяне праз бульбоўнік бяжыць Пятро, брат мой, у форме паліцая. Але я ад маці ведаю — ён партызан. Абняў мяне братуха, расцалаваў. Расказаў, што партызаны, даведаўшыся аб савецкім лётчыку ў вёсцы, рашылі выратаваць яго.

Далей што было? Далей прывялі мяне ў партызанскі лагер. І выходзіць мне насустрач з будана чалавек з вострай сівой бародкай, у шынялі, накінутым на плечы, усміхаецца: «Чи снидав ты, Галота?» Я прамаўчаў. «Паіш і спаты!»— загадаў. Вось так, з лёгкай рукі Сідара Арцем'евіча Каўпака і прыляпілася ў атрадзе да мяне мянушка Галота. Многія сапраўднага прозвішча не ведалі...

Васіль Іванавіч расказаў і пра «Лядовую эпапею». Патрэбны былі боепрыпасы, медыкаменты, у партызанскім шпіталі сабралася больш за трыста параненых. Іх неабходна было вывезці. Але нашы самалёты не прыляталі, бо не было дзе сесці.

Васіль Іванавіч прапанаваў абсталяваць аэрадром проста на лёдзе возера.

— Але ж лёд танюткі, як шкло, — запярэчылі яму. — Самалёт праваліцца.

— Наросцім новы пласт, — адказаў Бугрымовіч.

Партызаны прыступілі да работы. Прабілі некалькі палонак. Адтуль чэрпалі вёдрамі ваду і палівалі ўзлётна-пасадачную пляцоўку. Аэрадром атрымаўся на славу. І ўсё ж авіяцыйнае камандаванне вагалася, ці пасылаць цяжкія «ЛІ-2» на лёдавы аэрадром. Тады Каўпак выклікаў да сябе Бугрымовіча. «Яки ти був лётчык?». «Пілот другога класа, таварыш генерал». «Ведаюць цябе там?» «Павінны ведаць». І тады Каўпак загадаў падрыхтаваць радыёграму: «Аэрадром падрыхтаваны пад кіраўніцтвам лётчыка другога класа Бугрымовіча».

Неўзабаве ў адну з марозных начэй, пры падсветцы перасоўных кастроў, прыляцеў з-за лініі фронту першы самалёт. З вялікай радасцю сустрэлі партызаны лётчыка — Героя Савецкага Саюза Міхаіла Лунца. З гэтага дня самалёты сталі прылятаць часта. Закідвалі партызанам боепрыпасы, медыкаменты, прадукты, вывозілі параненых.

Аднойчы непагадзь бушавала тры дні і тры ночы. Мароз усё мацнеў, завіруха і люты вецер збівалі з ног. Але партызаны заставаліся на возеры — чакалі самалёта. А яго ўсё няма і няма. «Камендант» аэрадрома паслаў людзей у зямлянку сагрэцца, а сам застаўся на пасту. Нарэшце, самалёт прыйшоў, людзі пабеглі насустрач, а Васіль Іванавіч не здолеў ступіць з месца — адчуў сябе кепска. З цяжкасцю дашкандыбаў да зямлянкі і папрасіў, каб яму сцягнулі валёнкі — прымерзлі да ног. Урач далажыў Вяршыгары, што «Галоту» неабходна накіраваць у шпіталь праз лінію фронту, у яго адмарожаны ногі.

— Той рэйс на Вялікую зямлю мне вельмі запомніўся, — расказвае Бугрымовіч. — Разам са мною ляцеў дабрадушны, вясёлы стары. Гэта быў дзед Талаш. Да таго часу я ведаў дзеда Талаша па кнізе Якуба Коласа. І вось ён — побач са мной. У Крамлі мы разам атрымалі высокую ўрадавую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга. Уручаў нам яе Міхаіл Іванавіч Калінін...

У шпіталі Бугрымовіч знаходзіўся нядоўга. Не было часу адлежвацца. Яшчэ грымела вайна. У маі ён ужо лётаў да партызан.

— Мне пашчасціла: 4 ліпеня 1944 года я першым прызямліўся на аэрадроме ў вызваленым родным Мінску, а 12 мая 1945 года з самалёта над Берлінам бачыў, як дагараў рэйхстаг.

Пасля вайны Бугрымовіч яшчэ дзесяць гадоў працаваў лётчыкам - інструктарам. Цяпер ён на пенсіі...

27 жніўня 1967 года газета «Правда» пісала: «...Не забывае Радзіма і тых, хто ў гады выпрабаванняў не шкадаваў свайго жыцця дзеля абароны сацыялістычнай Айчыны. Такім мужным воінам быў і Васіль Іванавіч Бугрымовіч».

Я. МАЗО.

На партызанскім аэрадроме. У сярэдзіне Васіль Бугрымовіч.

«АСАБІСТЫМ ПЕРАКАНАННЕМ КОЖНАГА...»

ГУТАРКА ЗА «КРУГЛЫМ СТАЛОМ»

«Умацаванне законнасці», — гаварыў з трыбуны XXIV з'езда партыі Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў, — гэта задача не толькі дзяржаўнага апарату. Партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, камсамол абавязаны рабіць усё, каб забяспечыць найстражэйшае захаванне законаў, палепшыць прававое выхаванне працоўных. Павага да права, да закону павінна стаць асабістым перакананнем кожнага чалавека».

ПАРТЫЯ заклікае актыўна весці прававую прапаганду сярод насельніцтва, даносіць да кожнага чалавека закладзеныя ў савецкіх законах прынцыпы справядлівасці і гуманізму, прынцыпы адзінства правоў і абавязкаў грамадзяніна. Маецца на ўвазе не проста прававая прапаганда, а прававое выхаванне працоўных, іншымі словамі, павышэнне прававой культуры насельніцтва.

Цяжка пераболышыць ролю, якую могуць, павінны адыгрываць у гэтай справе ўстановы культуры — кожная бібліятэка, кожны клуб, кінатэатр. Пра гэта, менавіта, вялася гутарка за «круглым сталом», арганізаваным рэдакцыяй штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», Міністэрствам культуры і Міністэрствам юстыцыі Беларускай ССР.

Гаворка адбылася ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры ў прысутнасці слухачоў інстытута. Вёў размову за «круглым сталом» начальнік аддзела прававой прапаганды і прававога выхавання грамадзян Міністэрства юстыцыі БССР А. Ф. Чараднічэнка.

Вось што расказалі ўдзельнікі размовы.

Р. Г. МАЧУЛІН,

першы намеснік міністра культуры БССР

— Я пачну адразу з лічбаў. За мінулы год у культасветустановах рэспублікі па прававых пытаннях прачытана каля васьмі тысяч лекцый, праведзена больш за дзесяць тысяч гутарак, тры тысячы тэматычных вечароў, выпушчана шмат сатырычных часопісаў і газет.

Сярод раёнаў, дзе добра пастаўлена прававая прапаганда, можна назваць Лунінецкі, Баранавіцкі, Шчучынскі, Клімавіцкі, Дубровенскі і некаторыя іншыя.

Няблага пастаўлена прававое выхаванне ў асяродках культуры на Магілёўшчыне. Я б назваў у першую чаргу Сялецкі сельскі клуб Быхаўскага раёна, які выпускае вусны часопіс «Гэта перашкаджае нам жыць па-камуністычнаму». Старонкі часопіса «Шкода алкаголю», «П'яны бацька — гора сям'і» ганьбуюць п'яніц, парушальнікаў грамадскага парадку.

У практыку некаторых устаноў культуры трывала ўваходзіць арганізацыя гутарак за «круглым сталом», у якіх прымаюць удзел работнікі савецкіх органаў, юрысты, настаўнікі. Так, у Багатыроўскім сельскім клубе Мінскага раёна нядаўна адбылася гутарка на тэму «Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за парушэнне грамадскага парадку» з удзелам намесніка старшыні райвыканкома, памочніка пракурора раёна, начальніка раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі, загадчыка райфінаддзела і старшыні мясцовага калгаса.

Такіх прыкладаў у нас многа і, разам з тым, я згодны з Георгіем Мікалаевічам Станкевічам, што, калі можна так сказаць, каэфіцыент карыснага дзеяння праводзімых мерапрыемстваў пакуль што нізкі.

Менш агульных слоў, заклікаў, больш канкрэтнай работы, каб кожная гутарка, кожны радок сатырычнай газеты біў у цэль, каб гарэла зямля пад нагамі тых, хто перашкаджае нам жыць і працаваць.

Нагадаю — у рэспубліцы працуе дваццаць дзве з палавінай тысячы культасветработнікаў. Вялікая армія, якой пад сілу любыя задачы.

Г. М. СТАНКЕВІЧ,

першы намеснік міністра юстыцыі БССР

— Культасветустановы Беларусі нямала робяць у маральна-прававым выхаванні насельніцтва, — адзначыў ён. — На наш погляд, цікавую і разнастайную работу па маральна-прававым выхаванні падлеткаў праводзіць Бярэзінская дзіцячая бібліятэка Мінскай вобласці. Трымаючы цесную сувязь з камісіяй па справах няпоўналетніх, дзіцячым пакоем райаддзела ўнутраных спраў, работнікі бібліятэкі стварылі асобную групу чытачоў з ліку «цяжкавыхоўваемых» падлеткаў.

Для іх падбіраецца спецыяльная літаратура, праводзяцца гутаркі па прачытаных кнігах. Не лянуецца бібліятэкар калі-нікалі зайсці да падапечнага дамоў, пацікавіцца, чым ён займаецца, чаму даўно не быў у бібліятэцы.

Можна прывесці нямала прыкладаў паспяховага ўзаемадзеяння ў рабоце асяродкаў культуры з праваахоўнымі органамі па маральна-прававому выхаванню моладзі.

Але ўвогуле мне здаецца, што вялікія магчымасці культурна-асветных устаноў у прававым выхаванні насельніцтва выкарыстоўваюцца яшчэ слаба. Асноўныя заганы? Бессістэмнасць, выпадковасць, адсутнасць баявітасці і вастрыні ў барацьбе з п'яніцамі, дармаедамі, хабарнікамі, раскрадальнікамі сацыялістычнай маёмасці.

Слаба яшчэ ў нас выкарыстоўваюцца сродкі наглядной агітацыі. Зараз самая распаўсюджаная форма наглядной агітацыі супраць п'янства — вітрыны з фотаздымкамі п'яніц. Здымак, пад ім кароткія звесткі аб чалавеку — прозвішча, дзе працуе. І ўсё. Можа спачатку такія фотавітрыны і ўражвалі. А зараз, бывае, ідзе чалавек міма і не зірне ў той бок. Прыелася.

Я папракаю не толькі работнікаў культуры. Ім пакуль што слаба дапамагаюць і органы юстыцыі. Многія работнікі пракуратуры, міліцыі, судоў — рэдкія госці ў клубах і бібліятэках. А іх дапамога, іх парада вельмі патрэбная.

Пытанне аб рабоце культасветустаноў па прававым выхаванні насельніцтва нядаўна разглядалася каардынацыйна-метадычным саветам па прававой прапагандзе пры Міністэрстве юстыцыі БССР. Выпрацаваны шэраг канкрэтных мерапрыемстваў.

М. В. ЛУКАШУК,

намеснік начальніка Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкома

— Мы ў сябе, на Брэстчыне, напрыклад, у Ляхавіцкай, Баранавіцкай, Ганцавіцкай, Кобрынскай і іншых раённых бібліятэках узялі пад індывідуальную апеку «цяжкавыхоўваемых» падлеткаў. Як? Тут улічваецца цікавасць пэўнай катэгорыі моладзі, да дэтэктыўна-прыгодніцкай літаратуры. Паступіла ў бібліятэку якая-небудзь падобная навінка — бібліятэкар паведамляе пра гэта свайму падапечнаму.

Практыка паказала, што прававая прапаганда дае найбольшы эфект там, дзе наладжана цесная сувязь устаноў культуры з работнікамі пракуратуры, суда, міліцыі.

У Драгічынскім раёне, напрыклад, у вечарах на прававыя тэмы, як правіла, прымаюць удзел старшы суддзя А. Знаяшаў, пракурор В. Кураўкаў, следчыя, упаўнаважаныя міліцыі. Яны адказваюць на шматлікія пытанні, расказваюць, як трэба разумець той ці іншы закон. Таму з кожным разам на такія вечары прыходзіць усё больш і больш людзей.

В. М. ЛАКЦЮШЫНА,

загадчыца бабруйскай гарадской бібліятэкі імя Пушкіна

— Я хачу запярэчыць Міхаілу Васільевічу Лукашуку. Нельга, на маю думку, у нашай рабоце кіравацца формулай: для дасягнення мэты — добрыя ўсе сродкі. Я маю на ўвазе яго расказ пра тое, як у некаторых бібліятэках Брэстчыны «выхоўваюць» падлеткаў дэтэктыўнай літаратурай.

Раскажу пра сумны выпадак, які здарыўся ў нас. У нашу бібліятэку зачасціў юнак, пра якога мы ведалі, што ён не вельмі прыкладных паводзін. Прасіў ён заўсёды толькі дэтэктыўную літаратуру. Ну, мы і былі рады гэтаму. Маўляў, хай лепш чытае такія кнігі, чым швэндаецца па вуліцы. А неўзабаве даведваемся — наш чытач затрыманы міліцыяй за крадзёж. На следстве ён прызнаўся, што адну з кніг пра злодзеяў прачытаў пяць разоў. Яна і падштурхнула яго на злачынства.

Я згодна, што павінна быць індывідуальная работа з кожным чытачом, індывідуальная апека над тымі, хто ў гэтым мае патрэбу, але самая галоўная наша зброя — кніга, харошая, разумная кніга. І мы робім усё, каб яна «дайшла» да сэрца кожнага, хто прыходзіць у нашу бібліятэку.

С. К. ПАРЧЫНСКАЯ,

загадчыца Летчанскага сельскага клуба Віцебскага раёна

— Хто ў нас парушае законы? Людзі, як правіла, маральна няўстойлівыя, людзі этычна не развітыя. Лекцыя, гутарка, кінафільм, добрая кніга — гэта сродкі, вядома, неацэнныя. І мы ў сябе ўсё гэта выкарыстоўваем у поўную сілу. Але нішто не дае такога эфекта, як размова з вока на вока.

Вы ж ведаеце, там, дзе клуб, там і танцы. Ды толькі здаўна сярод нашых хлопцаў была такая завядзёнка — ісці на танцы пад хмяльком. Сабрала я аднойчы дзяўчат, кажу ім: «Не хадзіце вы, мае прыгажуні, танцаваць з такімі. Няўжо прыемна, калі партнёр дыхае ў твар гарэлкай ды вярзе з п'янага розуму рознае глупства». Паслухаліся дзяўчаты. Бачу, на танцах адна адмовіла кавалеру, другая... Пагутарыла і з хлопцамі, прысароміла. І што ж? Сустракаю нядаўна аднаго юнака, пытаюся, чаму ён не прыйшоў на апошні вечар у клуб? А ён пачырванеў і кажа: «А ў нас, Соф'я Канстанцінаўна, госці перад гэтым былі і я кілішак-другі ўзяў, таму і пасаромеўся».

Л. А. ДЗЯМЕШКА,

галоўны бібліятэкар Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна

— Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна як метадычны цэнтр усіх масавых бібліятэк выдала шэраг матэрыялаў у дапамогу па прапагандзе прававой літаратуры. Сярод іх кансультацыі «Аб прававым выхаванні падлеткаў у бібліятэцы», рэкамендацыйны спіс літаратуры «Чалавек, закон, грамадства» ў дадатку да бюлетэня «Новыя кнігі БССР».

Для сваіх чытачоў бібліятэка перыядычна арганізуе выстаўкі-агляды «Пытанні дзяржавы і права ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС».

Адным словам, метадычных распрацовак, зробленых і намі, і абласнымі бібліятэкамі, хапае. Ды толькі часам на месцах імі не ўмеюць карыстацца.

Хачу падкрэсліць і такую акалічнасць: некаторыя бібліятэкары слаба займаюцца самаадукацыяй, мала чытаюць, не сочаць за кніжнымі навінкамі. Тое, што рэкамендавана «зверху», — яшчэ так-сяк правядуць, а каб па ўласнай ініцыятыве... Летась, выйшла, напрыклад, вельмі цікавая аповесць Віктара Астаф'ева «Крадзёж», але ніводная бібліятэка не пацікавілася ёю.

І. К. БЕРЦУК,

намеснік дырэктара Рэспубліканскага тэатра юнага гледача

— Колькі дарэмных канфліктаў узнікае з-за таго, што людзі не ведаюць працоўнага заканадаўства? Вось чаму мы ўзялі за правіла на вытворчых нарадах вывучаць працоўнае заканадаўства.

●

Пра свой вопыт у арганізацыі прававой прапаганды, маральна-этычным выхаванні насельніцтва расказалі за «круглым сталом» галоўны бібліятэкар віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Л. Я. Ялевіч, загадчыца Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэкі Н. М. Меднік, загадчыца Давыдаўскай сельскай бібліятэкі Гомельскага раёна С. І. Рудзік, адказны сакратар аддзялення таварыства «Веды» Заводскага раёна г. Мінска Р. Н. Мініна, загадчыца аддзела культуры Мазырскага гарвыканкома Л. З. Брыскман, метадыст рэспубліканскага метадкабінета культработнікаў П. М. Салаўёў.

Гутарка за «круглым сталом» вылілася ў своеасаблівы абмен вопытам па прававым выхаванні працоўных.

Пасля працоўнага дня хлопцы і дзяўчаты вёскі Камуна Любанскага раёна спяшаюцца ў сельскі клуб. Любяць хлебаробы калгаса імя БВА слухаць песні ў выкананні салістак — бухгалтара Святланы Гарэлька і аператара Святланы Шляпко. 25 гадоў працуе ў паляводстве Дзмітрый Яскевіч, І ўсе гэтыя гады ён таксама выступае на сцэне. «Яблычка», «Рускі перапляс» і шмат іншых танцаў у яго рэпертуары. Задушэўна спявае начальнік паштовага аддзялення Алена Лучанковіч і настаўнік Аляксандр Рэмеза. Апладысментамі сустракаюць гледачы дуэт сясцёр Святланы і Кацярыны Пучынскіх, якім акампануе баяніст Раман Тарчэня (на здымках злева направа).

Фота Ул. КАШКАНА,
А. ЛУКАШОВА.

КЛУБ «АРЛЯНЯТЫ»

Больш як год таму вучні Ганцавіцкай школы Барысаўскага раёна ўпершыню з хваляваннем пераступілі парог Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску.

Тады яны не думалі, што гэтае наведванне з'явіцца пачаткам той вялікай і цікавай работы, якую распачнуць пазней па збору і вывучэнню багатай літаратурнай спадчыны не толькі Янкі Купалы, але і многіх беларускіх пісьменнікаў.

Вучні ўпершыню пачулі ў запісу голас паэта, наглядна ўбачылі ўсё тое, аб чым гаварылі на ўроках настаўнікі. Яны вырашылі больш глыбока вывучыць біяграфію паэта, сабраць матэрыял аб яго жыцці і дзейнасці, наладзіць агульнашкольны літаратурны вечар, прысвечаны песняру.

Добрая задума дзяцей знайшла жывы водгук і гарачую падтрымку настаўніцкага калектыву, які ўзначальвае дырэктар Ганцавіцкай школы Іван Фёдаравіч Лагімахаў. А першым памочнікам і дарадчыкам іх была выкладчыца роднай літаратуры Вольга Васільеўна Бузо. Гэта яна падказвала сваім выхаванцам, з чаго пачынаць работу, як лепш аформіць газету, стэнды, якія падабраць для вечара вершы, песні, урыўкі з твораў Купалы.

З нецярпеннем чакалі тады вучні прыезду сваіх першых гасцей — вядомага дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі і супрацоўнікаў музея Купалы. У іх ужо было што паказаць і расказаць.

Адзін з класаў школы стаў своеасаблівым школьным музеем. На стэндах размешчаны матэрыялы аб жыцці і творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Чорнага і іншых пісьменнікаў. У самым прыгожым і светлым куточку школы ўстаноўлен бюст Янкі Купалы.

Неўзабаве ганцавіцкія школьнікі вырашылі стварыць у сваёй школе клуб юных аматараў паэзіі «Арляняты».

З вялікім энтузіязмам узяліся за справу. Члены клуба падрыхтавалі і разаслалі многім пісьменнікам пісьмы з просьбаю прысласць свае ўспаміны пра Я. Купалу, творы, прысвечаныя песняру, кніжкі, фотаздымкі.

На лісты вучняў адгукнуліся Максім Танк, Пімен Панчанка, Эдзі Агняцвет, Васіль Вітка, Мікола Аўрамчык, Мікола Хведаровіч., А ўкраінскі пісьменнік Алекса Юшчанка разам са сваім перакладам верша Янкі Купалы «Крым» прыслаў верш, спецыяльна прысвечаны клубу «Арляняты».

Клуб «Арляняты» яшчэ толькі набірае сілу. А наперадзе новыя задумы і планы. Летам члены клуба збіраюцца наведаць радзіму Купалы — Вязынку, і тыя мясціны, дзе жыў і працаваў паэт.

Тамара ТАРАСАВА.

НАРОДНЫ ТЭАТР І ЯГО ПРАБЛЕМЫ

ХТО Ж АДКРЫЕ ЗАСЛОНУ?

Летась грамадскасць нашага раёна ўрачыста адзначыла дзесяцігоддзе Краснапольскага народнага тэатра. Ставіліся спектаклі па п'есах беларускіх аўтараў: «Лявоніха на арбіце», «Не верце цішыні», «Грэшнае каханне», «Чырвоныя кветкі Беларусі», «Папараць-кветка», «Над хвалямі Серабранкі» і па творах драматургаў братніх рэспублік: «Платон Крэчат» А. Карнейчука, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Блудны сын» Э. Ранета. Амаль ва ўсіх раёнах вобласці, а таксама ў Магілёве і Мінску паказваў свае работы тэатр. Глядач сустракаў спектаклі з вялікай увагай і радасцю.

А потым пачаліся перапады: адшуміць прэм'ера, пройдуць спектаклі і наступае зацішак, іншы раз на доўгі час — на паўгода, а то і на год. Прычына адна — часта мяняліся рэжысёры. За дзесяць год іх працавала ў тэатры аж сем. Хто толькі ні кіраваў народным тэатрам! Былі і ўлюбёныя ў сваю справу людзі, якія ўвесь запал свайго сэрца аддавалі калектыву. Сустракаліся і такія, што лічылі тэатр часовым прытулкам — прыедзе, «пакіруе» крыху і паедзе шукаць ці то даўжэйшага рубля, ці шырэйшай сцэны. Вось тады і наступаў зацішак.

Прыгадваецца рэжысёр Віктар Брылёў. Ён неяк адразу стаў сваім чалавекам у калектыве, з павагай ставіўся да старэйшых артыстаў тэатра, шукаў таленавітую моладзь. Па яго ініцыятыве працавала студыя, у якой маладыя аматары сцэны вывучалі першыя азы тэатральнага мастацтва. Гэта прынесла добры плён.

Пачалася работа над спектаклем польскага драматурга Г. Запольскай «Мараль пані Дульскай». Працавалі з вялікай зацікаўленасцю. Прэм'ера была сустрэта гледачом прыхільна. Спектакль ставіўся многа разоў і карыстаўся поспехам.

Значыць, ёсць у Краснаполлі таленавітыя людзі. Ды вось бяда — і Віктар Брылёў доўга не затрымаўся ў нас. Работа спынілася і, відаць, надоўга, бо апошняя прэм'ера адбылася больш як год таму...

І па сённяшні дзень невядома, будзе ўсё-такі «падабраны» рэжысёр ці не? Не скажаш, што мясцовыя арганізацыі абыякава ставіліся да лёсу гэтых спецыялістаў. Калі чалавек браўся за справу, ён неўзабаве атрымліваў кватэру ў раённым цэнтры. Дапамагалі народнаму тэатру ўсім, чым маглі. Дык у чым жа справа?

Напрошваецца думка. Відаць, набходна, каб інстытуты культуры і наш беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, якія рыхтуюць рэжысёраў народных тэатраў, выхоўвалі ў будучых маладых спецыялістаў павагу да сваёй прафесіі, каб яны не лічылі народны тэатр нейкай другараднай, ніжэйшай інстанцыяй, каб яны ведалі, што ім давядзецца працаваць у «глыбінцы» і не цураліся яе.

Трэба вярнуць былую славу Краснапольскаму народнаму тэатру. Пакуль жа тэатральная заслона закрыта.

С. СЯМЁНАЎ,
намеснік рэдактара газеты «Чырвоны сцяг».

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Грамадскасць рэспублікі адзначае 60-годдзе з дня нараджэння беларускага савецкага літаратуразнаўцы, правадзейнага члена Акадэміі педагагічных навук СССР Васіля Івашына. З гэтага выпадку праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Васіль Уладзіміравіч!

Мы, Вашы таварышы па пяру, сардэчна віншуем Вас, вядомага літаратуразнаўцу і крытыка, з 60-годдзем з дня нараджэння.

Сваю літаратурна-крытычную дзейнасць Вы пачалі з даследавання творчасці Янкі Купалы. Пазней творчасці народнага песняра Вы прысвяцілі манаграфію. Вашы працы аб узаемасувязях рускай і беларускай літаратур, аб вытоках сацыялістычнага рэалізму ў нашай літаратуры з'яўляюцца значным укладам у беларускае літаратуразнаўства. На Вашым творчым рахунку таксама артыкулы аб творчасці Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча, К. Крапівы.

З вялікім задавальненнем мы адзначаем і тое, што Вы з'яўляецеся сааўтарам школьнага падручніка па беларускай літаратуры, шмат энергіі аддаяце навукова-педагагічнай дзейнасці — працуеце дырэктарам Навукова-даследчага Інстытута педагогікі БССР.

Жадаем Вам, дарагі Васіль Уладзіміравіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, далейшых поспехаў у літаратурна-крытычнай і навукова-педагагічнай дзейнасці».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру новых творчых поспехаў, а таксама плёну ў педагагічнай дзейнасці.

СТАЛАСЦЬ

ВАСІЛЮ УЛАДЗІМІРАВІЧУ ІВАШЫНУ — шэсцьдзесят. Пройдзены немалы жыццёвы шлях, багаты не толькі колькасцю пражытых гадоў, а і значнасцю зробленага. Савецкая ўлада вывела вясковага хлопца на прасторы жыцця, дала магчымасць падняцца да навуковых вышынь. Сёння Васіль Уладзіміравіч — доктар філалагічных навук, правадзейны член Акадэміі педагагічных навук СССР, дырэктар Інстытута педагогікі БССР. У далёкім мінулым засталіся 30-я гады — гады студэнцтва і выкладчыцкай працы. Іх аддзяліла ад сучаснасці вогненная паласа ваеннага часу...

І хоць сівізна пабяліла галаву, але, як і раней, па-маладому, пранікліва, з хітрынкай свецяцца вочы, лагодная ўсмешка аздабляе твар чалавека, у якога вялікі жыццёвы і духоўны вопыт, багаты творчы, навуковы набытак.

Больш двух дзесяцігоддзяў актыўна працуе В. Івашын на ніве беларускай крытыкі і літаратуразнаўства. Артыкулы, кнігі, манаграфіі... Даследчык ставіў і вырашаў надзённыя, актуальныя праблемы, якія і сёння турбуюць наша літаратуразнаўства: «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг.» (1953), «Горький и белорусская литература начала XX века» (1956), «У истоков социалистического реализма» (1963) і г. д.

Кніга «У истоков социалистического реализма», якая была пасляхова абаронена В. Івашыным як доктарская дысертацыя, — сапраўды маштабнае, грунтоўнае даследаванне нацыянальных вытокаў сацыялістычнага рэалізму ў нашай літаратуры, сувязі беларускай савецкай літаратуры з нацыянальнымі традыцыямі, традыцыямі рускай літаратуры.

І хто б сёння ні браўся за далейшую распрацоўку пытанняў генезісу сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры, яе развіцця ў сям'і братніх літаратур, ролі нацыянальных традыцый і традыцый рускай літаратуры, ён не зможа абысці сваёй ўвагай працы В. Івашына.

Літаратуразнаўчая дзейнасць В. Івашына праз доўгія гады была непасрэдна звязана з працай у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Аспірант, навуковы супрацоўнік, загадчык сектара... Кіраўніцтва сектарам, у якім упершыню стваралася «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» ў двух тамах. В. Івашын працаваў з поўнай грамадзянскай адказнасцю і высокай партыйнай патрабавальнасцю. Па некалькі разоў перапісваліся, правіліся і рэдагаваліся раздзелы. Тады многім супрацоўнікам здавалася, што навуковы кіраўнік тэмы і рэдактар залішне патрабавальны, часам прыдзірлівы. Але гэта была не дробязная прыдзірлівасць, а высокая, навуковая патрабавальнасць.

Побач з навуковымі літаратуразнаўчымі інтарэсамі пастаянна жыла ў душы Васіля Уладзіміравіча зацікаўленасць праблемамі навучання і выхавання, праблемамі школы. Ён быў адным з аўтараў першага падручніка беларускай літаратуры для сярэдняй школы, нарысаў па беларускай літаратуры для студэнтаў. Цяпер жа В. Івашын, як дырэктар Інстытута педагогікі, з усёй сваёй энергіяй і працаздольнасцю аддаўся новай справе, праблемам педагогікі, методыкі, псіхалогіі, новым метадам навучання. А гэта нялёгкая, ды пачэсная праца патрабуе ўсяго чалавека. Нарады, канферэнцыі, сімпозіумы... Рэспубліканскія, усесаюзныя, міжнародныя... А час ідзе, бягуць гады. Таму іншы раз з непрыхаваным сумам пазайздросціць В. Івашын тым, у каго шмат часу, хто можа аддацца творчай навуковай працы. Аднак і ён знаходзіць час для літаратуразнаўства. З прыемнасцю сустракаешся ў перыядычным друку з тэарэтычна грунтоўнымі артыкуламі, у якіх вырашаюцца кардынальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу — праблемы ўзаемазбліжэння і ўзаемаўзбагачэння літаратур народаў СССР, іх паскоранага развіцця, партыйнай адказнасці творчай індывідуальнасці пісьменніка перад сваім часам, сваім народам.

Шэсцьдзесят... Час сталасці. Час роздумаў і падрахункаў зробленага ў жыцці. Але не толькі падрахункаў, а і планаў на будучае. У Васіля Уладзіміравіча багата творчых задум. Пажадаем жа яму, каб яны здзейсніліся!

Павел ДЗЮБАЙЛА,
доктар філалагічных навук.

Віктар ЦЕЛЬПУГОЎ

БЯССМЕРТНІК

СКУЛЬПТАРЫ летам і восенню працавалі ў Валгаградзе над адным з помнікаў у гонар разгрома ворага. Яны пражылі там некалькі месяцаў і вельмі часта пільна ўзіраліся ва ўсё, што акружала іх пад небам горада-героя. Асабліва любілі яны ўзбірацца на вяршыню Мамаева кургана і адтуль глядзець на Волгу, на новыя карпусы дамоў, на стэп, які разбягаўся ва ўсе бакі.

Недзе каля самага краю гэтага стэпу лёгкія сіняватыя дымкі новых заводаў зліваліся з размытай, амаль празрыстай лініяй далягляду, і вось, быццам рассоўваліся, рабіліся яшчэ больш прывольнымі і без таго неабсяжныя прасторы. Буксіры, старанна стукаючы па вадзе, уздоўж і ўпоперак лінавалі Волгу, і яна паміж далёкімі берагамі здавалася разгорнутай вялізнай картай — з паралелямі і мерыдыянамі...

Нельга было не залюбавацца ўсім навокал. Напэўна, менавіта таму адзін з самых юных у брыгадзе камсамолец Вася Моўчан кожную раніцу будзіў сваіх сяброў словамі ім самім прыдуманай песні пра росквіт зямлі, за якую ён ваяваў. І нягледзячы на тое, што аўтару ў дні вялікай бітвы не было, пэўна, і трох год, менавіта з яго песняй штодня прымаліся скульптары за работу. Яны і самі не заўважалі, як пад іх загрубелымі рукамі ўзніклі першыя контуры помніка.

Дзень за днём, гадзіна за гадзінай ён выяўляўся ўсё больш выразна, і хутка нават здалёк было відаць — на фоне легендарнага кургана вырастала крамнёвага колеру фігура рускай жанчыны-маці, у глыбокай журбоце схіленай над загінуўшым воінам. Яе мужная нямата была мацней за ўсе словы, і раптам усё навокал — і ўсеяныя кветкамі паляны, і памялелыя акопы, і ў вечнасць бягучыя воблакі — усё напоўнілася для маладых новым, яшчэ не зведаным сэнсам. Нават звычайны вецер-стэпняк засвістаў у іх вушах неяк па-асабліваму. Здавалася, ён даносіць да слыху водгулле тых, даўно адшумелых баёў.

А помнік усё рос. Народжаныя ім вобразы ўсё больш авалодвалі пачуццямі і думамі яго будаўнікоў.

Прыйшоўшы неяк раніцай да месца работы, хлопцы ўвогуле застылі ад здзіўлення — у каменнай руцэ жанчыны, разгорнутая венчыкам да сонца, хісталася і трапятала на ветры маленькая, ледзьве прыкметная кветачка. Падышлі бліжэй — бяссмертнік!

Галоўны скульптар, зусім сівы, але яшчэ магутны стары, паглядзеў спачатку на кветку, потым на сваіх юных памочнікаў, абышоў разы два вакол помніка, задумліва ўсміхнуўся:

— Малайцы, саратнікі! Вельмі правільна зрабілі.

«Саратнікі» прамаўчалі. Толькі яшчэ дружней і званчэй зазвінела жалеза аб камень.

Кветку хутка запарушыла шэрай крошкай, а потым і зусім здзьмухнула некуды. Хацелі ў канцы дня адшукаць бяссмертнік, уставіць яго на ранейшае месца, ды так запрацаваліся, што і забыліся пра яго зусім.

Але, дзіўная рэч, — у наступную раніцу кветка зноў засвяцілася ў каменнай руцэ! Ні пылінкі на ёй, ні парушынкі...

— Ну я ж гаварыў, малайцы, нічога не скажаш! — зноў усміхнуўся стары.

І вось бяссмертнік, малюсенькі, ад прыроды не надта яркі, цвердаваты і ўвесь нейкі натапыраны, кожную раніцу стаў расцвітаць сярод каменю.

Увечары ідуць скульптары дадому — няма кветкі. У раніцы хоць і спяшаюцца, перагнаць яго не могуць. Прыйдуць у сем гадзін — ён ужо красуецца. У шэсць з'явіцца—ён на пасту.

Працуюць, а самі ўсё пра кветку думаюць.

Аднойчы глыбокай ноччу нехта з хлопцаў падняў усіх і гаркнуў гучна, як дняваль на роце:

— Моўчан!

— Што Моўчан? — успалашылася брыгада.

—Вася зараз устаў, пацiху апрануўся і пайшоў да помніка.

— Значыцца, ён.

— Ну, вядомая рэч!

Ухмыльнуліся, залеглі на другі бок, але болей ужо не заснулі. Ляжаць гадзіну, ляжаць дзве, а Васі ўсё няма.

— Напэўна, кветкі шукае. Цемра вунь якая!

— Не хвалюйцеся, ён, мабыць, з вечара ўсё падрыхтаваў.

Зірнулі, а са шклянкі з Васевай тумбачкі, з-за штыкету востра заточаных алоўкаў, сапраўды, кветка выглядвае — гэткая ж, як тая.

— Цяпер усё зразумела. Але — ціха! Хутка з'явіцца наш лірык. Цур, ніякіх размоў не заводзіць.

Вяртаецца Моўчан на досвітку. Ні ад кога не тоячыся, ён з грукатам расчыняе дзверы і яшчэ з парога крычыць на ўсю Волгу-матухну:

— Уставай!

І высыпае з мокрага каша на стол гару жывой рыбы:

— Папраўляйцеся, хлопцы!

Хлопцы пераглядваюцца, нічога не разумеючы, дзякуюць:

— Во добра! Слаўная будзе юшка!

А кветка, як заўсёды, і ў той ранак чакае іх на сваім месцы. Убачыўшы яе, Вася шматзначна пазірае на сяброў:

— Думаеце, містыка?

— А ты лічыш,—як?

— Высакародны чалавек па зямлі гэтай ходзіць!

— Пра гэта мы, уяві сабе, даўно здагадаліся. Ты лепей скажы, хто гэты высакародны?

— Пасля сённяшняй ночы магу далажыць дакладна.

— Хто ж?

Моўчан нетаропка паварочваецца да Волгі, шчыльна засцеленай ранішняй смугой.

— Вунь тую бабку бачыце? Ву-н-унь да прыстані крочыць па халадку.

— Ну, дапусцім, крочыць.

— Яна.

— Вось гэта ўжо містыка.

Вася пакрыўджана пацепвае плячом.

— Хто сумняваецца, можа праверыць.

Два ганцы-добраахвотнікі тут жа кідаюцца з месца ў кар'ер і знікаюць за паваротка сцяжынкі.

— Гэй, вы, акуратней там,—гучыць ім наўздагон,—незнарок не пакрыўдзьце старую!

Хлопцы вяртаюцца чамусьці вельмі не скора. Выгляд у іх нейкі дзіўны—і ўрачысты, і ледзьледзь збянтэжаны.

— Ну, што? — пытаюць, абступіўшы іх з усіх бакоў, сябры.—Зачакаліся вас. Дагналі?

— Дагналі...

— Яна?

— Яна.

— А як жа вы спыталі?

— Ды проста так і спыталі. Ваш, гаворым, матуля, бяссмертнік, на помніку, вунь там?

— Так. А яна?

— Яна адказвае: мой.

— Здорава! А вы?

— А мы—дзякуй, гаворым, вам ад усіх нас. Усю восень кветкамі вашымі любуемся.

— Малайцы! А яна што ж?

— А яна хораша так паглядзела нам у вочы і заспяшалася да парахода. Мы, вядома, за ёй, дапамагчы, значыцца, хочам пры пасадцы. А перад самым трапам яна азіраецца на нас і гаворыць: — Толькі я, сыночкі, тут першы раз—сёння прыехала, сёння і назад. Дай, думаю, на старасці год хоць адным вокам зірну на гэтыя мясціны. Астраханскія нашы даўно ўжо ўсе тут перабылі. Мая чарга толькі цяпер падышла...

— Што ж,—перабіваюць хлопцы сваіх ганцоў, —выходзіць, і яна, і не яна?!

— Выходзіць, так...

— Ды ці тую вы дагналі хоць? Тая была ў чорнай хустцы,—рэзка паварочваецца да Волгі Вася Моўчан.

— У чорнай?!.

— У чорнай, разумееш, у зусім чорнай.

— Не-е, гэтая ў белай была. У белай, як снег...

— Э-эх, вы,—засмучана разводзіць рукамі Вася.

Праз хвіліну ўсе бачаць, як ён хутка бяжыць уніз, да прыстані, што толькі пачынае выплываць з туману...

Пераклад з рускай.

Выступае школьны хор. Народны артыст СССР Р. Р. Шырма ўручае памятны падарунак дырэктару школы М. І. Масальскай. Флейтыстка Аня — адна з музычнай сям'і Казлоўскіх.

ДОМ, ДЗЕ ВЫХОЎВАЮЦЬ ТАЛЕНТЫ

Так можна назваць Мінскую спецыялізаваную школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву.

Дзесяць гадоў таму назад школа аб'явіла першы набор на музычнае і мастацкае аддзяленні. А сёння ў ёй займаюцца 425 хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прыехалі ў Мінск з Полацка і Салігорска, Крупак і Верцялішак — больш як з 70 населеных пунктаў рэспублікі.

З вёскі Вязынка ў школу прыехала цэлая сям'я: пяцёра Казлоўскіх займаюцца ў розных класах музычнага аддзялення.

Тут вучацца спяваць, іграць на розных інструментах, дырыжыраваць хорам, маляваць, ляпіць, чаканіць. Тут вучацца пранікаць у свет гукаў і фарбаў, разумець і любіць прыгожае.

Днямі школа адзначыла свой першы юбілей. Дзеячы мастацтваў Беларусі — мастакі, музыканты горача віншавалі выкладчыкаў і вучняў першай у рэспубліцы школы для адораных дзяцей.

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ АБ ЛІТАБ'ЯДНАННІ

НЕ МОДА, А ПАТРЭБА

Праглядаючы раённыя ды і іншыя газеты, у апошні час усё часцей і часцей сустракаеш літаратурныя старонкі, куткі і калонкі паэзіі. Нярэдка паведамляецца аб стварэнні новых літаратурных аб'яднанняў. Паэзіяй, літаратурай наогул, у нас шырока цікавіцца не толькі моладзь.

Гады два назад мы распаўсюдзілі сярод чытачоў сваёй газеты анкету, у якой было і такое пытанне: «Якія матэрыялы вам падабаюцца ў газеце?» І працэнтаў семдзесят апытаных у ліку іншых матэрыялаў назвалі выпускі літаратурных старонак. Так адказвалі і школьнікі, і калгаснікі, і рабочыя, і інтэлігенцыя.

Далей. Неяк на адным з пасяджэнняў літаб'яднання мы прыйшлі да высновы, што нельга бясконца замыкацца ў вузкім коле, трэба шукаць больш шырокай сувязі з людзьмі. Вырашылі правесці ў раённым доме культуры літаратурны вечар. З нецярпеннем чакалі гэтага дня. Непакоіліся, ці прыйдуць людзі паслухаць нас, а калі прыйдуць, то як успрымуць творчасць пачаткоўцаў. Аднак вечар прайшоў цікава, зала была перапоўнена. Прымалі выступленні добра. Гэта нас узрадзавала і акрыліла. Было вырашана тады зрабіць такія вечары традыцыйнымі.

І вось нядаўна мы сустракаліся з нашымі чытачамі чацвёрты раз. Калі раней у зале збіралася пераважна моладзь, то сёлета недзе каля палавіны склалі людзі сталага ўзросту. Вечар працягваўся каля дзвюх гадзін. Але калі вядучы аб'явіў, што праграма вычарпана, ні адзін чалавек не ўзняўся з месца: завязалася шчырая, непасрэдная гутарка пра літаратуру.

З кожным годам павялічваецца прыток пісем у нашу газету. У пісьмах шмат вершаў і апавяданняў (больш вершаў). Вельмі шмат пішуць школьнікі, моладзь, але ёсць аўтары і з багатым жыццёвым вопытам. Вядома, у большасці дасылаюцца першыя спробы пяра. Як быць у гэтым выпадку супрацоўнікам рэдакцыі? Абмежавацца адпіскай?

Так нельга, бо за кожным пісьмом жывы чалавек, які чакае парады, дапамогі, адказу нават на такое, на першы погляд, смешнае пытанне: «Ці можна падлетку пісаць вершы аб каханні?» Па-другое, мы павінны з усіх пачаткоўцаў вылучыць лепшых, больш здольных, каб папоўніць, прынамсі, наша літаб'яднанне. Далёка ж не бездакорнымі ў свой час былі школьныя вершы, напрыклад, «крынічанкі» Ніны Мацяш, а цяпер яна — член Саюза пісьменнікаў БССР.

А вось у З. Вільнер пасля дзесяцігодкі была іншая школа — школа вайны. Семнаццацігадовай дзяўчынкай пайшла Зіна на фронт. Праз многія гады паспрабавала свае сілы на літаратурнай арэне. Атрымала ў нашай газеце падтрымку. Цяпер член бюро літаб'яднання «Крыніца» З. Вільнер — аўтар апублікаванай у часопісе «Уральский следопыт» аповесці «Я кахаю вас...», напісанай на матэрыяле вайны, працуе над новымі апавяданнямі.

Не бяда, калі член нашага літаб'яднання і не стане пісьменнікам — хай ён папоўніць вялікую армію аматараў літаратуры або знойдзе сябе ў журналістыцы. У нас ёсць і такія. Узяць хоць бы былога выхаванца літаб'яднання, цяпер супрацоўніка рэспубліканскай «Сельскай газеты» А. Казловіча.

Падобных прыкладаў я мог бы прывесці значна больш. Але я хачу спыніцца на асобных пытаннях, узнятых у артыкуле загадчыка аддзела культуры рэдакцыі абласной газеты «Мінская праўда» У. Кобрына «Таленты... Каму іх адкрываць?».

Я згодзен, што яшчэ далёка не вырашана праблема выхавання маладых аўтараў. Шкада, што асабістыя кантакты пачаткоўцаў з вядомымі пісьменнікамі — з'ява вельмі рэдкая. Прыгадваецца, які творчы зарад давалі «крынічанцам» у свой час сустрэчы з М. Танкам, А. Макаёнкам, Б. Спрынчанам, Я. Брылём, С. Грахоўскім, А. Грачанікавым, Я. Семяжонам і некаторымі іншымі! Мы пазбаўлены і той магчымасці, якую выкарыстоўвае сталічная газета, даючы на сваіх старонках слова пра маладых вядомым пісьменнікам. Таму я галасую і за выданне дапаможнікаў для пачаткоўцаў, і за выпрацоўку добра прадуманай праграмы заняткаў. Гэта дало б літаб'яднанням вельмі вялікую карысць, пазбавіла б іх тых пошукаў, якія часта не даюць жаданых вынікаў.

Статут літаратурных аб'яднанняў? Што ж, у гэтым таксама ёсць рацыя. Па асабістаму вопыту ведаю, што для больш плённай работы аб'яднання неабходна пэўная структура.

Так, мы спачатку прыйшлі да высновы, што літаб'яднанню варта даць імя. Нарадзілася «Крыніца». Затым абралі кіруючы і каардынацыйны орган — бюро (яго склад перавыбіраецца праз два гады). Наступным крокам была выпрацоўка ўмоў прыёму і выключэння з «Крыніцы». Неўзабаве літаб'яднанне прыняло пэўную форму, перастала быць нечым аморфным. І гэта дало свае вынікі: мы пачалі штомесяц выпускаць літаратурную старонку, часцей і больш мэтанакіравана праводзіць пасяджэнні, хутка вырашаць арганізацыйныя пытанні.

У чэрвені мінулага года А. Вярцінскі ў надрукаваным у «Знамени юности» артыкуле «Мастак, выхавай вучня» пісаў, што Саюз пісьменнікаў БССР мае намер правесці семінар кіраўнікоў і актывістаў мясцовых літаб'яднанняў. Думаю, што неабходнасць у гэтым даўно наспела.

Я. СЯЛЕНЯ,
намеснік рэдактара брэсцкай раённай газеты «Маяк камунізму», кіраўнік літаб'яднання «Крыніца».

СТВАРАЛЬНІКІ ПРЫГОЖАГА

У гэтыя дні на ВДНГ БССР незвычайныя экскурсаводы: навучэнцы Бабруйскага мастацкага гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 15 Галіна Шпак і Віцебскага тэхнічнага вучылішча № 19 Раіса Бялова. Лепшыя работы гэтых дзяўчат і іх таварышаў прадстаўлены на тэматычнай выстаўцы мастацкай творчасці будучай рабочай змены, якая адкрылася тут.

Экспанаты, выраблены ў гуртках мастацкай творчасці гэтых вучылішчаў, не раз дэманстраваліся ў Маскве і цяпер экспануюцца там на ВДНГ у павільёне прафтэхадукацыі.

БЕЛТА.

КЛУБ НА КОЛАХ

У адзін з пагожых веснавых вечароў у поле да працаўнікоў калгаса імя Фрунзе Рэчыцкага раёна прыехаў «клуб на колах». Перад хлебаробамі выступіў лектар райкома КПБ Свярчкоў, які пазнаёміў з падзеямі міжнароднага жыцця, адказаў на пытанні прысутных.

Затым адбыўся канцэрт удзельнікаў агітбрыгады Азершчынскага дома культуры Рэчыцкага раёна. Хлебаробам спадабалася кароткая, але змястоўная праграма. Клуб на колах карыстаецца вялікім поспехам у слухачоў.

І. САВІЦКІ.

НОВЫ НАРОДНЫ

За творчыя поспехі ў мастацкім абслугоўванні насельніцтва Міністэрства культуры БССР прысвоіла званне народнага самадзейнаму ансамблю танца Тураўскага гарадскога дома культуры Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Ансамбль танца створаны ў 1964 годзе. З дня заснавання і па сённяшні дзень ім кіруе М. Котаў.

Рабочыя, служачыя, калгаснікі, школьнікі — 52 чалавекі пастаянныя ўдзельнікі ансамбля. Акрамя таго, пры калектыве створана падрыхтоўчая група, якая рыхтуе будучых танцораў.

Аснову рэпертуару творчага калектыву складаюць беларускія народныя танцы, танцы народаў СССР.

Самыя папулярныя сярод іх «Матлёт», «Лявоніха», карагод «Вяснянка», «Тураўская каханачка», «Тураўская старадаўняя полька», украінскі «Гапак», румынскі танец «Пастушкі» і іншыя.

Вялікім поспехам у гледачоў карыстаецца літаратурна - харэаграфічная кампазіцыя «Дружба», прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР.

Калектыў вядзе вялікую работу па абслугоўванню як сельскіх, так і гарадскіх жыхароў. Ён выступаў у Мінску, Гомелі, Мазыры, Калінкавічах і іншых гарадах.

У 1965 годзе танцавальны ансамбль выступаў на ВДНГ СССР, за што ўзнагароджаны Ганаровай граматай ВДНГ і Вялікім бронзавым медалем.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯВЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ ПА КАФЕДРАХ:

Народныя інструменты — загадчык кафедры — 1.
Струнныя інструменты — старшы выкладчык — 2 (скрыпка).
Аркестравага дырыжыравання — старшы выкладчык — 2.
выкладчык — 1.
асістэнт — 2.
Харавое дырыжыраванне — выкладчык — 1.

Заявы і дакументы, згодна Палажэння аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара па адрасу:
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.
Тэрмін падачы заявы адзін месяц з дня апублікавання.
Даведкі па тэлефону:
22-49-42; 22-14-03; 22-96-71.

Язэп КУРАЛІКАЎ

Яфрэйтар Лапачкін здымаецца ў кіно

— Шчыра віншую вас, Сяргей Пятровіч, — і рэжысёр-пастаноўшчык новага каляровага шырокаэкраннага фільма пра мірныя будні «Трывога!» Ілья Амосавіч Сярдзюк кінуў на стол веер фотакартак. — Пробы — выдатныя! Тое, што нам і трэба было! Так што дзякуйце, неадкладна дзякуйце Васіліне Максімаўне, што яна знайшла вас. Мы з ног збіліся, шукаючы на ролю героя чалавека іменна з такімі выдатнымі данымі... І рост, і пастава гэткія, як у вас, у вайскоўцаў, кажуць — добрага страявіка. А твар! Што за твар! — Тут рэжысёр-пастаноўшчык паківаў пальцам перад роўным, «рымскім» носам яфрэйтара. — Мужны, валявы твар!.. Васіліна Максімаўна, ідзіце сюды. Сяргей Пятровіч хоча падзякаваць вам.

Лапачкіну здавалася, што рэжысёр-пастаноўшчык не вымаўляў словы, а выстрэльваў іх чэргамі. І было радасна: ён будзе здымацца ў кіно!

Пачціва паціснуўшы руку гераіні, Лапачкін зазірнуў у яе блакітныя-блакітныя вочы (такіх яшчэ хлопец ніколі не бачыў), і ў тую ж хвіліну яго быццам імкліва пацягнула ў вір. Яфрэйтар і слова прамовіць не мог.

— Усё добра, — сказала яна, і ўзяла Лапачкіна пад руку. — Цяпер мы будзем працаваць з вамі.

Затым яны доўга гулялі па вуліцах, хадзілі ў кіно, елі марожанае, жартавалі. У той жа дзень перайшлі на ты. Лапачкін праводзіў Васіліну да пад'езда яе дома, і гэта было для яго проста-такі шчасцем.

...І — паляцелі дні, тыдні сапраўднай працы. Рэжысёр-пастаноўшчык быў задаволены. Раней ён баяўся, што эпізоды першых сустрэч маладзенькага камандзіра ўзвода і бібліятэкаркі палкавой бібліятэкі атрымаюцца халоднымі, ненатуральнымі, не будзе ў іх шчырасці і цеплыні. А цяпер, пераглядаючы гатовыя кадры, ён аж прыцмокваў ад задавальнення. Усё ішло, як па маслу. Гэты яфрэйтар Лапачкін проста знаходка: ніводнага сапсаванага метра плёнкі, сэканомлена тры дні.

— Калі гэтак — цьфу-цьфу, каб не сурочыць? — пойдзе і далей, — думаў ён, — то прэмія за эканомію часу і матэрыялу будзе забяспечана.

А Лапачкіну весела параіў:

— Так трымаць!

— Ёсць так трымаць! — той ліха ўскінуў руку да брыля, звонка прыстукнуў абцасамі.

— Заўтра будзем здымаць эпізоды «У казарме» і «Аплявуха», — паведаміў Ілья Амосавіч. — Як вы на гэта глядзіце, Васіліна Максімаўна, і вы, Сяргей Пятровіч?

— Ці не мнагавата? — першай выказала сумненне гераіня. — Можа б спыніцца толькі на адным эпізодзе?

— Сапраўды, мнагавата, — ахвотна падтрымаў яе герой.

— Ну, што ж, тады спачатку «Аплявуху», а эпізод «У казарме» адкладзем назаўтра, — згадзіўся рэжысёр-пастаноўшчык.

Па задуме аўтара сцэнарыя ў бязвоблачным каханні камандзіра і бібліятэкаркі павінна была ўсё-такі (у пацвярджэнне жыццёвай праўды) з'явіцца хоць адна хмурынка — у выглядзе аплявухі, якую гераіня заляпіла закаханаму лейтэнанцку, калі той, развітваючыся каля пад'езда, спрабаваў пацалаваць яе.

...Аператары ўстанавілі сваю апаратуру, асвятляльнікі — сваю. А ў двары стаяў ужо гармідар: кожны працікаўся наперад, каб паглядзець, як здымаецца кіно. Іх адціскалі назад два міліцыянеры. Хлапчукі, бы шпакі, сядзелі на дрэвах.

Ілья Амосавіч мітусіўся па пляцоўцы, крычаў на аператараў, асвятляльнікаў, на міліцыянераў, якія быццам нічога не робяць, каб навесці парадак. Нарэшце, падышоў да Васіліны і Лапачкіна.

— Вам усё зразумела?

— Усё.

— Тады пачнем... Матор!

Лапачкін трымае Васіліну за саменькія кончыкі пальцаў.

— Ну, бывай. Пайду я, — гаворыць яна.

— Пачакай хоць хвіліначку, — просіць лейтэнант.

— Не магу. Мама будзе трывожыцца.

Тут Лапачкін парывіста прытуляе яе да грудзей, сваімі вуснамі адшуквае яе вусны, цалуе. Васіліна (рэжысёру-пастаноўшчыку ў гэты момант неба здалося з аўчынку) замест таго, каб вырвацца, адштурхнуць лейтэнанта і даць яму аплявуху, таксама парывіста абхапіла рукамі яго за шыю. Фуражка пакацілася долу.

— От даюць! — хіхікнуў нехта з натоўпу.

— А што ім, артысты! — пачуўся другі голас.

— Стоп! Выключыць юпіцеры! — урэшце ачомаўся Ілья Амосавіч і ад бездапаможнасці ледзь не заплакаў.

...А праз тры месяцы ў палкавым клубе (салдаты ўдзельнічалі ў масоўках карціны) адбыўся першы прагляд «Трывогі». У першым радзе сядзелі Лапачкін, Васіліна, камандзір палка і Ілья Амосавіч. Некалькі разоў чуліся воплескі з залы, а калі на экране з'явілася: «канец фільма» і ўспыхнула святло, усе ўсталі. Апладысментам не было канца.

І тады Васіліна нясмела звярнулася да камандзіра палка:

— Таварыш палкоўнік, мы з Сярожам спадзяемся, што вы не адмовіцеся быць у нас пасаджоным бацькам...

— Што?! — здзівіўся той. — Вы, значыцца...

— Так... Мы пажаніліся.

— Пажаніліся, — нясмелым голасам пацвердзіў Лапачкін.

Камандзір палка развёў рукамі.

— Ох, і Лапачкін! Ох, і Лапачкін!.. Малайчына, Лапачкін! Ну, што ж, прымаю ваша запрашэнне, віншую, — і моцна паціснуў ім рукі...





Без слоў.

Мал. шахцёра А. СМОЛІЧА. (Салігорск).

Уладзімір Багдановіч

ПАМЕРЫ

ЁН УЗНІК у рэдактарскім кабінеце, як прывід. Некалькі хвілін яны глядзелі адзін на аднаго. Рэдактар — з жахам, наведвальнік са шчаслівай усмешкай чалавека, якому пашанцавала ў «Спортлато».

— Дзякуй богу, закончыў, — з палёгкай сказаў наведвальнік, паклаў на стол пузатую папку, перавязаную жоўтай стужкай, і, падцягнуўшы нагой крэсла, з асалодай усеўся.

Рэдактар паляпаў рукамі па кішэнях, вытрас на далонь белую таблетку і, жмурачыся, праглынуў.

— Бегаць трэба, — дакорліва сказаў наведвальнік.

— Куды? — прашаптаў рэдактар.

— У лес.

— Далёка, — уздыхнуў рэдактар. — Ды і часу няма.

— Так, з часам цяжка. Вось вазьміце мяне. Цэлы дзень у канторы, вечарам і ноччу за пісьмовым сталом...

— Дык што ў вас, — уздыхнуў рэдактар. — Раман, п'еса, паэма?

Наведвальнік хуценька развязаў стужку. Гурбіна белых лістоў закрасавалася на рэдактарскім стале.

— Эпапея «Дзікія гусі», — паведаміў наведвальнік і ганарліва прыгладзіў шэрую купінку валасоў.

— Жывёлагадоўля? Да пабачэння, — рэдактар весела засмяяўся. — Не наш профіль...

— Не, гэта падтэкст... Няўжо не здагадаліся? Вы прачытайце твор, усё стане ясна.

Рэдактар скіс. Зірнуўшы на апошні ліст эпапеі, ён збялеў. Уверсе стаяла лічба «973», а ўнізе — «Канец першай кнігі». І раптам выратавальная думка мільганула ў яго галаве. Ледзь стрымліваючы хваляванне, рэдактар пастукаў пальцамі па стале.

— Адчуваецца, што твор варты, — сказаў рэдактар.

Наведвальнік расквітнеў.

— Так, — лагодна працягваў рэдактар, — але надрукаваць вашу эпапею не зможам. На жаль, вядома...

— Чаму? — выдыхнуў аўтар «Дзікіх гусей».

— Па-ме-ры! — адсек рэдактар. — Часопіс наш малафарматны... Мы маленькія рэчы друкуем...

— Што ж рабіць?

— Нясіце ў тоўстыя часопісы. Яны ахвотнікі да буйных твораў...

— Прымуць?

— Яшчэ як! З рукамі адарвуць...

Калі наведвальнік выйшаў, рэдактар весела зарагатаў.

— Не, жыццё — усё-такі рэч добрая, — гаварыў ён.

Але жыццё — штука складаная. Неўзабаве дзверы рэдактарскага кабінета ўжо не зачыняліся — ішлі адзін за адным маладыя хлопцы і дзяўчаты, сталыя кабеты і сівыя дзяды. Яны клалі на рэдактарскі стол невялічкія памерам рукапісы, замілавана пазіралі на аслупянелага рэдактара і гаварылі:

— Мяне паслалі да вас з аднаго тоўстага часопіса...

— І мне параілі звярнуцца...

— Я таксама там быў...

— З рукамі, кажуць, адарвуць...

— Ага, з рукамі...

У рэдактара закалаціліся ногі. І ён успомніў параду аўтара эпапеі «Дзікія гусі»: «Бегаць трэба».

ЭПІГРАМЫ

Юрку ГОЛУБУ

Пра талент мне не трэба
Без дай прычыны ныць.
Я верш магу зляпіць:
Дзяўчо...
Прастора...
Неба...

Рыгору СЕМАШКЕВІЧУ

Людзі, дарогі, падводы, машыны,
Лес і балота, і кліч жураўліны.
Сонца і неба, поле — калыска...
Слова за слова — і вершаў нізка.

Святлана ЛОБАЧ.

МІМАХОДЗЬ

У поўнай адпаведнасці з тэкстам п'есы артыста крыху патузалі на сцэне. Потым, аднак, ён скардзіўся, што лупцавалі яго... з падтэкстам.

●

Кажуць, на зямлі робіцца ўсё больш цесна. А куды ж тады падаць ньютанавым яблыкам?

●

Вадзіцель чхаў на тэхнічны дагляд машыны. Матор не заставаўся ў даўгу — ён чхаў на вадзіцеля.

●

Матэматык-лірык пісаў вершы з дапамогай лагаРЫФМІЧНАЙ лінейкі.

Павел САКОВІЧ

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 06689.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15 87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.